**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ**

**Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы**

**С. А. Шыдлоўскі**

# КУЛЬТУРА ПРЫВІЛЕЯВАНАГА САСЛОЎЯ БЕЛАРУСІ:

**1795-1864 гг.**

**Мінск**
**«Беларуская навука»**
**2011**

УДК [008+94](476)”1795/1864”

ББК 71(4Бен)

Ш98

Р э ц э н з е н т ы :

доктар філалагічных навук А. І. Мальдзіс

доктар гістарычных навук І. У. Чаквін

Шыдлоўскі, С. А.
Ш98 Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі: 1795—
1864 гг. / С. А. Шыдлоўскі. — Мінск : Беларус. навука,
2011. - 168 с.
ISBN 978-985-08-1241-4.
Упершыню ў беларускай этналогіі прыведзены комплексны аналіз культуры айчыннай элігы 1795-1864 гадоў. Характарызуюцца асноўныя тэндэнцыі ў развіцці культуры жыццезабеспячэння беларускага прывілеяванага саслоўя. У цэнтры ўвагі знаходзяцца працэссы адаптацыі беларускай эліты да расійскіхсацыяльна-эканамічных і культурных умоў жыцця. Упершышо вылучаны асноўныя стратэгіі культурнай адаптацыі мясцовых прывілеяваных груп у новых гістарычных умовах. У зварот айчыннай этналагічнай навукі ўводзяцца новыя віды пісьмовых крыніц (мемуарыстыка, эпісталярыя, публіцыстыка, бытапісальная белетрыстыка).

УДК |008+94](476)”1795/1864”
ББК 71(4Бси)
ISBN 978-985-08-1241-4 ©ШыдлоўскіС. А. 2011
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом
«Беларуская навука», 2011

Памяці майго бацькі

Шыдлоўскага Алега Веніямінавіча

# УВОДЗІНЫ

З развіццём незалежнай беларускай дзяржаўнасці і станаўленнем нацыянальных уладных інстытутаў паўстае пытанне пераемнасці гістарычнай свядомасці айчыннай эліты, што робіць актуальным вывучэнне культурнай спадчыны прывілеяванага саслоўя Беларусі. Прадстаўнікі прывілеяванага саслоўя Беларусі пакінулі значны след у развіцці як усходнеславянскай, так і агульнаеўрапейскай культуры. Гэта выдатны доказ гістарычнай прадвызначанасці імкнення сучаснай Беларусі да шматвектарнай знешняй палітыкі. Ён падкрэслівае асаблівую геапалітычную ролю беларускай дзяржавы на цывілізацыйнай восі «Усход-Захад».

Культурныя працэсы 1795—1864 гадоў вызначылі шэраг доўгатэрміновых этнакультурных тэндэнцый, у ліку якіх — фарміраванне нацыянальных рухаў і нацыянальнай эліты краю. У гэты час выспявалі таксама грамадска-палітычныя і эканамічныя рэформы, якія правялі рубеж паміж культурай феадальнай і капіталістычнай эпох. Прадстаўнікі прывілеяванага саслоўя па праву нараджэння займалі вядучыя пазіцыі ў палітычным, эканамічным і культурным жыцці грамадства. Аднак застаецца адкрытым пытанне наколькі айчынны набілітэт адпавядаў у вызначаны перыяд функцыянальным патрабаванням свайго сацыяльнага статуса, ці захаваў ён наватарскі патэнцыял, здольнасць выбіраць і асіміляваць іншаэтнічныя культурныя формы. Недастаткова вызначана роля і спецыфіка ўдзелу розных элітарных груп у працэсе этнічнай кансалідацыі беларускай нацыі. Неабходна таксама выявіць дынаміку ўзаемных уплываў паміж элітарнай і народнай традыцыямі.

За апошнія гады павялічыўся інтарэс грамадзян Беларусі да ўласных сямейных вытокаў, паходжання, радаводу. Падобная цікавасць існуе і ў асяроддзі беларускай дыяспары, сярод замежных нашчадкаў мясцовых арыстакратычных радоў, што стварае глебу для пашырэння беларускай інфармацыйнай прысутнасці за мяжой, спрыяе ўсталяванню кантактаў з суайчыннікамі. Як рэакцыя на падобны попыт з’яўляюцца папулярныя работы, прысвечаныя розным аспектам старасвецкага побыту, геральдыцы, генеалогіі. Аднак з-за адсутнасці сучасных абагульняючых навуковых даследаванняў культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі такія выданні ў значнай ступені тыражуюць састарэлыя стэрэатыпы.

У Расіі і Польшчы культура прывілеяванага саслоўя XIX стагоддзя выдатна даследавана і ўведзена ў ранг нацыянальнай святыні («пушкінская эпоха», «эпоха філаматаў»). Яна зрабілася ў гэтых краінах нацыянальна-

кансалідуючым фактарам, а таксама рэсурсам для развіцця музейнай, турыстычнай і забаўляльнай індустрыі. Нераспрацаванасць дадзенага пытання ў беларускай навуцы аб’ектыўна перашкаджае рэалізацыі шэрагу грамадска-культурных праектаў, якія маюць як духоўнае, так і эканамічнае значэнне.

Праца па аднаўленню былых маёнткаў як аб’ектаў турыстычнай дзейнасці і музеефікацыя старажытных беларускіх гарадоў патрабуе вывучэння і актуалізацыі розных аспектаў элітарнай культурнай традыцыі. Даследаванне матэрыяльнай, сацыяльнай і духоўнай культуры прывілеяванага саслоўя — неабходны грунт і для падрыхтоўкі кампетэнтных спецыялістаў у галіне турыстычнай сферы дзейнасці, распрацоўкі навучальных курсаў рэкрэацыйнага рэсурсазнаўства, краязнаўства, экскурсазнаўства.

Недастатковая вывучанасць культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі стрымлівае яе засваенне айчыннай масавай культурай (напрыклад, кінаіндустрыяй), замінае стварэнню сучаснага канкурэнтаздольнага медыйнага прадукту, заснаванага на высокамастацкіх узорах элітарнай культуры.

У навуковы зварот айчыннай этналогіі яшчэ не трапілі асобныя віды пісьмовых крыніц (мемуарыстыка, эпісталярыя, публіцыстыка, гістарычная белетрыстыка), якія могуць асвятліць пытанні станаўлення нацыянальнай свядомасці, асаблівасці этнічнай і саслоўнай псіхалогіі. Выяўленыя за апошнія дзесяцігоддзі факты, датычныя матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя, пакуль не пераасэнсаваны з пазіцыі сучаснай этналагічнай навукі. У сучаснай беларускай этналогіі практычна адсутнічаюць абагульняючыя даследаванні, здольныя выявіць унутраныя заканамернасці развіцця і каштоўнасныя асновы дадзенай культуры, вызначыць яе ролю ў беларускім культурагенезе.

Мэта дадзенага даследавання — выявіць асаблівасці эвалюцыі матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі на працягу 1795—1864 гадоў.

Для дасягнення пастаўленай мэты вызначаны наступныя задачы:

1. Даследаваць асноўныя тэндэнцыі ў развіцці матэрыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі 1795—1864 гадоў.

2. Выявіць характар трансфармацыі духоўнай і сацыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі азначанага перыяду.

3. Ахарактарызаваць крыніцы дынамікі культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі разглядаемага перыяду.

4. Вызначыць ролю саслоўнай і этнічнай свядомасці ў захаванні структурнай цэласнасці і функцыянальнасці культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі 1795—1864 гадоў.

Храналагічныя рамкі даследавання (1795 г., 1864 г.) з'яўляюцца важнымі вехамі ў гісторыі Беларусі. У 1795 годзе ў выніку апошняга трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай усе беларускія землі аб'ядналіся пад скіпетрам расійскай імперыі, што стварыла новыя этнакультурныя ўмовы для развіцця мясцовых элітарных груп. У выніку паражэння шляхецкага паўстання 1863—1864 гадоў расійскі ўрад пачаў праводзіць паслядоўную палітыку дэпаланізацыі на беларускіх землях, што закранала ў значнай ступені культуру мясцовага прывілеяванага саслоўя.

У дадзенай рабоце тэрыторыя Беларусі разглядаецца ў межах, якія вызначаны айчыннай этналогіяй. Гэта тэрыторыя Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай, а таксама ўсходніх частак Віленскай і Ковенскай губерняў Расійскай імперыі.

Для абазначэння этнічных беларускіх тэрыторый у рабоце выкарыстоўваюцца тэрміны «беларускія землі», «беларускі край», «Беларусь». Для разумення этнакультурных працэсаў у асяроддзі прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд варта адцеміць шматзначнасць тэрмінаў «літоўскі», «літовец». Пад час існавання ВКЛ яны выкарыстоўваліся часта як палітонім, што пазначаў грамадзянскую прыналежнасць яе поліэтнічнага насельніцтва. З пачатку XIX стагоддзя малады жмудскі нацыянальны рух пачаў выкарыстоўваць гэтыя тэрміны ў якасці этноніма. У першай палове XIX стагоддзя існавала ўстойлівая тэндэнцыя пашырэння тэрміна «Беларусь» на ўсю этнічную тэрыторыю пражывання беларусаў і адпаведная рэдукцыя арэала бытавання наймення «Літва» [10, с. 76]. У разглядаемы перыяд паняцці «Беларусь» і «Літва» згадваліся як субрэгіянальныя найменні тэрыторый з пераважным беларускім насельніцтвам, тэрмін «Паўночна-Заходні край» выкарыстоўваўся ў афіцыйнай практыцы.

Пад паняццем *«саслоўе»* разумеецца сацыяльная група, якая вызначаецца асаблівымі правамі і абавязкамі, замацаванымі юрыдычна. *Прывілеяванае саслоўе* мела выключныя эканамічныя і юрыдычныя правы і выступала ў якасці эксплуататара непрывілеяваных груп насельніцтва. На працягу разглядаемага перыяду ў Расійскай імперыі да прывілеяванага саслоўя афіцыйна адносілі патомных дваран (рас. — *потомственные дворяне*), асабістых дваран (рас. — *личные дворяне*), духавенства, купцоў, з 1832 года — ганаровых грамадзян (рас. — *почетные граждане*) [271, с. 542—549].

Такім чынам, элітарная культура беларускага грамадства разглядаемага перыяду складалася з культурнага ўкладу некалькіх прывілеяваных груп. Аднак стыль жыцця буйных землеўладальнікаў — патомнага (дзедзічнага) дваранства — з'яўляўся эталонам для прадстаўнікоў іншых прывілеяваных супольнасцяў. Гэта можна патлумачыць выключным матэрыяльным і прававым становішчам патомнага дваранства. У Расійскай імперыі толькі

патомныя дваране мелі поўныя правы (права валодаць прыгоннымі і заселенымі маёнткамі, удзельнічаць у дваранскім самакіраванні) [271, с. 549—550]. Яны карысталіся перавагамі на вайсковай і цывільнай службе. Дваране вызваляліся ад усіх асабістых падаткаў і павіннасцяў, у тым ліку рэкруцкіх, ад цялесных пакаранняў, судзіліся толькі роўнымі сабе [271, с. 559]. Да падзелаў Рэчы Паспалітай на беларускіх землях расійскаму дваранству адпавядаў шляхецкі стан (польскае szlachta ад сярэдневерхненямецкага Slachta — род, парода). Адпаведна значная частка нашай увагі будзе нададзена культуры менавіта патомнага дваранства, значны кампанент якога на беларускіх землях складалі выхадцы з шляхецкага саслоўя.

Пад тэрмінам *«культура жыццезабеспячэння»* разумеецца комплекс асаблівасцяў вытворчай дзейнасці, дэмаграфічнай структуры, працоўнай кааперацыі, традыцый спажывання і размеркавання матэрыяльных рэсурсаў, гэта значыць прыродна абумоўленных форм сацыяльных паводзін, якія забяспечваюць чалавечаму калектыву існаванне за кошт рэсурсаў пэўнага асяроддзя жыхарства.

Пад тэрмінам *«адаптацыя»* разумеецца здольнасць грамадства да гарманізацыі сваёй жыццядзейнасці адпаведна са зменамі ў навакольным асяроддзі. У працэсе адаптацыі адбываецца трансфармацыя грамадства, у выніку якой ўзнікаюць і выпрабоўваюцца культурныя інавацыі. Тыя інавацыі, якія з'яўляюцца найбольш адаптатыўнымі ў адносінах да навакольнага асяроддзя, замацоўваюцца ў культуры.

Пад тэрмінам *«стратэгіі адаптацыі»* разумеецца выбар этнакультурнай групай комплексу спосабаў арганізацыі сацыяльных адносін і рэгуляцыі паводзін індывідаў з мэтай найлепшай адаптацыі групы да зменаў навакольнага асяроддзя [143, с. 122].

У дадзенай рабоце акрамя тэрміна «прывілеяванае саслоўе» выкарыстоўваюцца таксама сінанімічныя выразы «прывілеяваная частка грамадства», «элітарныя групы». Тэарэтычныя падыходы шэрагу айчынных даследчыкаў (М.Ф. Піліпенкі, А.І. Мальдзіса, І.У. Чаквіна) былі выкарыстаны для вызначэння структурных элементаў культуры прывілеяванага саслоўя.

Аўтар выказвае шчырую ўдзячнасць за падтрымку і дапамогу членам-карэспандэнтам, дактарам гістарычных навук А.І. Лакотку і М.Ф. Піліпенку, дактарам гістарычных навук І.У. Чаквіну, А.В. Гурко, Г.І. Каспяровіч, доктару філалагічных навук А.І. Мальдзісу, кандыдатам гістарычных навук Т.А. Навагродскаму і А.Р. Раюку, кандыдату псіхалагічных навук І.М. Андрэевай, а таксама калектывам аддзела народазнаўства ДНУ «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі» і кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

# ГЛАВА 1
# АНАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД ЛІТАРАТУРЫ, АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА КРЫНІЦ

**Гістарыяграфія першай паловы XIX стагоддзя.** З’яўленне першых даследаванняў па гісторыі беларускіх зямель у рускай гістарыяграфіі стымулявалася афіцыйнай задачай абгрунтавання падзелаў Рэчы Паспалітай. Да такіх аглядаў можна аднесці работы М.М. Бантыш-Каменскага (1805) [16], М.М. Карамзіна (1816—1819) [87], М.Г. Устралава (1839) [226]. Вынікам збірання ў Беларусі ў 30—50-ых гадах XIX стагоддзя расійскім ваенным ведамствам гістарычнай, эканамічнай і статыстычнай інфармацыі з’явіліся публікацыі А. Карэвы (1861) [116], М. Цэбрыкава (1862) [236], П. Баброўскага (1863) [37], І. Зяленскага (1863) [81], М. Дамантовіча (1865) [64]. Ступень навуковай каштоўнасці гэтых даследаванняў неаднолькавая, аднак яны ўтрымліваюць унікальную інфармацыю аб эканамічным становішчы дваранскіх гаспадарак краю, этнаканфесійных тэндэнцыях, палітычных настроях дваранства, міжсаслоўных адносінах. Спецыяльныя работы, прысвечаныя пытанням культуры мясцовых прывілеяваных груп, у дадзены перыяд адсутнічалі.

У польскамоўнай гістарыяграфіі першай паловы XIX стагоддзя пытанні палітычнай гісторыі таксама дамінавалі над культуразнаўчай тэматыкай. Польская нацыянальная гістарыяграфія вырашала задачу абгрунтавання правоў Польшчы на землі былой Рэчы Паспалітай, аналізаваліся прычыны заняпаду гэтай дзяржавы. Крытыка сістэмы шляхецкай дэмакратыі ўзыходзіць да работ прыхільніка асветніцкай ідэалогіі Г. Калантая [311].

Прадстаўнік манархічнага лагера А. Нарушэвіч таксама вылучаў унутраныя прычыны заняпаду Рэчы Паспалітай, аднак негатыўныя сацыяльныя рысы шляхецтва ён тлумачыў вынікам нямецкага ўплыву. Найбуйнейшай работай А. Нарушэвіча з’яўляецца сямітомная «Historya narodu Polskiego od początku chrzesciaństwa» (1780—1786) [329]. Пад уплывам ідэй А. Нарушэвіча сфарміравалася асобная школа, прадстаўнікі якой выступалі за моцную манархічную дзяржаву. «Школе Нарушэвіча» супрацьстаяла рэспубліканска-ліберальная «школа Лялевеля». Навукова-асветніцкая дзейнасць апошняй была скіравана на інспірацыю рэвалюцыйных настрояў, герaізацыю мінуўшчыны.

Культуразнаўчыя работы ў польскай гістарыяграфіі першай паловы XIX стагоддзя вызначаюцца апісальнасцю і фрагментарнасцю. Захоўвае каштоўнасць як крыніца фактычных звестак работа Е. Кітовіча «Opis

obyczajów za panowania Augusta III» [309]. Дадзеная работа дазваляе прасачыць вытокі многіх тэндэнцый у сферы матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры мясцовага прывілеяванага саслоўя. Аналітычны падыход да крыніц, значна павысіўшы навуковы ўзровень этнаграфічнага вывучэння мясцовых культур, адлюстроўвае творчасць З. Даленгі-Хадакоўскага (А. Чарноцкага). Важнымі з'яўляюцца высновы З. Даленгі-Хадакоўскага наконт ролі духавенства ў этнакультурных працэсах у Беларусі [295].

Непасрэдна разгляду культуры прывілеяванага саслоўя першых дзесяцігоддзяў XIX стагоддзя былі прысвечаны работы Л. Галамбёўскага «Domy i dwory» (1830), «Ubiory w Polszcze» (1830), «Gry i zabawy różnych stanów w kraju całym, lub niektórych tylko prowincyach» (1831) [301; 302; 303]. Даследчык апісаў і сістэматызаваў вялікую колькасць фактаў матэрыяльнай, сацыяльнай і духоўнай культуры прывілеяванага саслоўя на землях Польшчы, Беларусі і Літвы. Каштоўнасць работ Л. Галамбёўскага заключаецца ў шырокім геаграфічным ахопе культурных феноменаў. Зніжае каштоўнасць работ Л. Галамбёўскага іх кампілятыўны характар. У кнізе А. Рыпінскага «Białoruś. Kilka słów o poezii prostego ludu téj naszéj polskiéj prowincii; o jego muzyce, śpiéwie, tańcach, etc» (1840) праведзены аналіз саслоўнай псіхалогіі чыншавай шляхты, яе этнічных стэрэатыпаў, ахарактарызаваны побыт, звычаі і гаспадарчыя заняткі дадзенай групы шляхецтва [336]. У рабоце Е. Тышкевіча «Opisanie powiatu Borysowskiego...» (1847) дадзены статыстычныя звесткі, апісаны традыцыі гаспадарання [343]. Даследаванне Е. Тышкевіча дазваляе прасачыць тэндэнцыі ў развіцці культуры жыццезабеспячэння мясцовага прывілеяванага саслоўя першай паловы XIX стагоддзя.

**Гістарыяграфія другой паловы XIX ст. — пачатку XX ст.** У другой палове XIX стагоддзя ўпершыню ў рускай гістарыяграфіі з'явіліся кнігі, якія прэзентавалі погляд на беларускую гісторыю ўраджэнцаў самой Беларусі — гэта творы М.В. Без-Карніловіча «Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии» (1855) [24], В.В. Турчыновіча «Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен» (1857) [223], І.А. Парай-Кошыца «Исторический рассказ о литовском дворянстве» (1858) [188]. М.В. Без-Карніловіч выступаў супраць негатыўнага стэрэатыпа, які склаўся ў расійскім грамадстве аб беларускім дваранстве. В.В. Турчыновіч даводзіў погляд на Беларусь як самастойны суб'ект гісторыі, падкрэсліваў значнасць ролі «русінскага» набілітэту ў сацыяльна-культурным жыцці ВКЛ. Гісторыі і культуры татарскай шляхты прысвечана даследаванне А.В. Мухлінскага «Исследование о происхождении и состоянии литовских татар» (1857) [169].

На мяжы 50—60-ых гадоў XIX стагоддзя ў сувязі з абвастрэннем палітычнай барацьбы ў Беларусі ў рускай гістарыяграфіі павялічылася

цікавасць да этнаканфесійных аспектаў беларускай гісторыі, якія знайшлі шырокае адлюстраванне ў кнігах М.В. Каяловіча [121; 122]. Каталіцкі набілітэт лічыўся М.В. Каяловічам чужародным. У ролі інтэлектуальнай і маральнай эліты беларускага народа ў работах М.В. Каяловіча фігуравала праваслаўнае святарства. У кнігах С.М. Салаўёва «История падения Польши» (1863) [210] і Д.І. Іавайскага «Гродненский сейм 1793 г.» (1870) [83] прасочвалася роля шляхецтва ў палітычнай гісторыі беларускіх зямель, якая разглядалася ў кантэксце польска-расійскага супрацьстаяння. У кнізе М.І. Кастамарава «Старый спор: Последние годы Речи Посполитой» (1870) асвятляліся прычыны палітычнага калапсу Рэчы Паспалітай [119]. Аўтар прааналізаваў грамадска-палітычныя ідэалы шляхецкага саслоўя, падаў характарыстыкі саслоўнай шляхецкай псіхалогіі.

Пашырэнню ў расійскім грамадстве аб’ектыўных ведаў пра ролю шляхецтва ў беларускай культуры паспрыялі работы А.К. Кіркора і С.В. Максімава [104; 146]. У шматтомным выданні А.М. Пыпіна «История русской этнографии», чацвёрты том якога быў прысвечаны Беларусі (1892), разглядалася развіццё этнаграфічнай навукі ў Расійскай імперыі з канца XVIII па 90-ыя гады XIX стагоддзя [190]. А.М. Пыпін даў крытычны разгляд палітыкі расійскай адміністрацыі ў нацыянальным пытанні ў Беларусі. Беларускае шляхецтва даследчык лічыў нашчадкамі «апалячаных старых рускіх землеўладальнікаў» [190, с. 25]. Ён падкрэсліваў, што шляхецтва, асабліва дробнае, ведала і карысталася ў побыце беларускай мовай.

У рускай гістарыяграфіі другой паловы XIX стагоддзя тэрміны «каталік» і «праваслаўны» працягвалі атаясамлівацца з этнічнымі азначэннямі «паляк» і «рускі». Некрытычна выкарыстоўваўся матэрыял польскай гістарыяграфіі. Спробай пераадолення гэтай тэндэнцыі з’явілася кніга П.М. Бацюшкава «Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края» (1890) [23]. Аднак яго работа падмяніла «польскую» версію гісторыі Беларусі «велікарускай». У дарэвалюцыйнай рускай гістарыяграфіі найлепш даследаваным было пытанне прававога становішча прывілеяванага саслоўя Беларусі. Дадзенаму аспекту прысвечаны работы рускіх гісторыкаў М. Яблачкава «История дворянского сословия в России» (1876) [271], В.В. Ключэўскага «История сословий в России» [112], С.А. Корфа «Дворянство и его сословное управление за столетие 1762—1855 годов» (1906) [118], А. Рамановіча-Славацінскага «Дворянство в России от начала XVIII века до отмены крепостного права» (1912) [194]. Рускія даследчыкі, якія закранал пытанні культуры шляхецкага саслоўя, разглядалі іх у канфрантацыйным плане, ілюструючы схему супрацьстаяння праваслаўнай і лацінскай цывілізацый.

У другой палове XIX стагоддзя паскараецца працэс дэструкцыі шляхецкай культуры. У польскай гістарыяграфіі дадзенага перыяду зніжаецца цікавасць да разгляду шляхецкай праблематыкі. Прадстаўнік варшаўскай пазітывісцкай школы Т. Корзан у рабоце «Wewnętrzne dzieje Polski za Stanisława Augusta» (1897—1898), аналізуючы прычыны заняпаду Рэчы Паспалітай, негатыўна ацэньваў ролю шляхты ў грамадска-палітычным жыцці краіны, падкрэсліваў эгаізм і коснасць гэтага саслоўя [313]. Падобныя высновы абгрунтоўваюцца і ў работах М. Бабжынскага [283] і У. Смаленскага [338; 339]. Апошні бачыў прычыны заняпаду Рэчы Паспалітай у эканамічнай і культурнай дэградацыі шляхецтва. Да рэакцыйных сілаў рэчпаспалітаўскага грамадства У. Смаленскі адносіў каталіцкае святарства, падкрэсліваючы ўдзел апошняга ў эксплуатацыі сялянства. У работах К. Шайнохі атрымала развіццё ідэя выключнасці польскай нацыі і яе высокай цывілізацыйнай місіі на Усходзе [340].

Даследчык традыцыйнай славянскай культуры О. Кольберг указваў на магчымасці ўзаемаўплыву паміж шляхецкай і сялянскай культурамі. О. Кольберг гаварыў пра наяўнасць пераходных форм і падтыпаў паміж дзвюма гэтымі культурамі [310]. Варта адзначыць дзейнасць па вывучэнню культуры мясцовага прывілеяванага саслоўя А. Ельскага [66—72]. Ён з'яўляўся сістэматызатарам ведаў аб матэрыяльнай культуры беларускага прывілеяванага саслоўя, быў аўтарам каля дзесяці тысяч артыкулаў, прысвечаных культуразнаўчай праблематыцы, якія друкаваліся ў польскамоўных энцыклапедычных выданнях. Аўтар абапіраўся пераважна на беларускі матэрыял і намагаўся прасачыць развіццё культуры прывілеяванага саслоўя ў яе ўзаемадачыненні з народнай традыцыяй.

Абагульняючы характар носяць энцыклапедычныя выданні З. Глогера «Encyklopedja staropolska» (1900—1903) і «Budownictwo drzewne i wyroby z drzewa w dawnej Polsce» (1907—1909) [299; 300]. З. Глогер правёў значную работу па аналізе і сістэматызацыі многіх аспектаў матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя на землях колішняй Рэчы Паспалітай. У сваіх энцыклапедычных артыкулах ён прасачыў генезіс асобных элементаў матэрыяльнай і духоўнай культуры, акрэсліў арэал іх распаўсюджвання. Значную ролю ў работах З. Глогера адыгралі этнаграфічныя матэрыялы з беларуска-польскага памежжа. Аднак іншыя беларускія рэгіёны прадстаўлены ў яго даследаваннях досыць сціпла.

**Гістарыяграфія першай паловы XX ст.** У даваеннай савецкай беларускай гістарыяграфіі ідэалагічная зададзенасць стрымлівала даследаванне культуры прывілеяванага саслоўя, якая трактавалася як «польская» ці «руская». У дваццатых гадах XX стагоддзя галоўная ўвага даследчыкаў была скіравана на пытанні эканамічнай і палітычнай гісторыі

краю, якая ўключала і міжсаслоўныя адносіны. Сярод актыўных даследчыкаў дадзенага перыяду вылучаюцца прадстаўнікі дарэвалюцыйнай школы М. Доўнар-Запольскі, У. Ігнатоўскі, У. Пічэта, В. Ластоўскі.

У рабоце М. Доўнар-Запольскага «Гісторыя Беларусі» была закранутая праблема паланізацыі прывілеяванага саслоўя Беларусі [63]. На думку М. Доўнар-Запольскага, шырокае распаўсюджванне польскай мовы сярод шляхецтва пачалося толькі ў першыя дзесяцігоддзі XIX стагоддзя. Апошняму, паводле М. Доўнар-Запольскага, спрыяла дзейнасць Віленскага універсітэта і некваліфікаваная культурна-адукацыйная палітыка расійскай адміністрацыі ў Беларусі [63, с. 387]. Работа У. Ігнатоўскага «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі» (1918) дае ўяўленне аб палітычнай ролі шляхецкага саслоўя ў функцыянаванні дзяржаўных інстытутаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай [82]. Барацьбу шляхты з магнатэрыяй за ўмацаванне сваёй палітычнай вагі аўтар бачыць адным з цэнтральных момантаў гісторыі Беларусі феадальнага перыяду. У. Ігнатоўскі разглядаў праблему акаталічвання і апалячвання беларусаў, падкрэсліваючы негатыўную ролю Польшчы ў дадзеных працэсах.

У кнізе У. Пічэты «Гісторыя Беларусі» (1924) разглядаецца культура Беларусі ад старажытных часоў да Люблінскай уніі 1596 года [184]. Рэч Паспалітую У. Пічэта характарызуе як шляхецкую феадальную дзяржаву. У кнізе адзначаецца значная роля Статутаў ВКЛ у фарміраванні шляхецтва. У. Пічэта карыстаецца азначэннем «беларуская шляхта» і лічыць, што ў XV—XVI стагоддзях пануючыя класы заставаліся вернымі нацыянальнай беларускай традыцыі. Аднак пасля Люблінскай уніі, каля адбывалася, паводле У. Пічэты, «ашляхечванне дзяржаўнага і грамадскага ўкладу Літвы-Беларусі», шляхта зрабілася галоўным рухавіком паланізацыі краю [184, с. 176].

Напачатку 1920-х гадоў В. Ластоўскі напісаў серыю гістарычных нарысаў, якая выйшла з друку ў 2003 годзе пад назвай «Кароткая энцыклапедыя старасьвеччыны» [135]. Аўтар аналізуе прычыны заняпаду айчынных традыцыйных эліт краю. Галоўнымі чыннікамі дэзарыентацыі беларускай арыстакратыі В. Ластоўскі бачыў у негатыўным уплыве польскіх сацыяльна-культурных узораў. Паняцце «апалячванне» упершыню ўводзіцца у тэрміналогію беларускай гістарычнай навукі менавіта В. Ластоўскім у «Кароткай гісторыі Беларусі» (1910) [134].

У рабоце Ф. Турука «Белорусское движение», выдадзенай у 1921 годзе, даследуецца гісторыя беларускага нацыянальнага руху [222]. Адным з аспектаў разглядаемай праблемы з’яўляюцца пытанне этнічнай свядомасці прывілеяванага саслоўя Беларусі, месца апошняга ў беларускім нацыянальным руху. Аўтар карыстаецца паняццем «беларуска-польскае дваранства», падкрэсліваючы культурны беларуска-польскі дуалізм мясцовага шляхецтва, побытавы сантымент апошняга да беларускай культуры і мовы [222, с. 9—10].

У рабоце А. Цвікевіча «Западно-руссизм» (1929), прысвечанай вывучэнню грамадскай думкі Беларусі XIX — пачатку XX стагоддзя, разглядаецца феномен імперскай уніфікацыі. Аўтар даследуе культурныя стэрэатыпы дваранскай беларускай інтэлігенцыі, прасочвае станаўленне этнічнай ідэнтычнасці прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя Беларусі ў сувязі з эканамічнымі адносінамі ў краі. Ідэалагічны ландшафт беларускай грамадска-палітычнай думкі XIX стагоддзя падаецца А. Цвікевічам як вытворнае ад супрацьстаяння «польскага маёнтку» і расійскага прамысловага капіталу [234].

Такім чынам, 20—30-е гады XX стагоддзя ў беларускай савецкай гістарыяграфіі найбольшая ўвага надавалася сацыяльна-палітычнай тэматыцы. Пэўным здабыткам дадзенага перыяду можна лічыць работы, прысвечаныя фарміраванню этнічнай ідэнтычнасці і сацыяльна-палітычнай думкі беларускага грамадства, у тым ліку і прывілеяваных груп. Для даваеннай рускай савецкай гістарыяграфіі быў уласцівы выкрывальны матыў у дачыненні «шляхты-эксплуататараў» і наогул — да «панскай Польшчы». Найбольш распрацаванай з'яўлялася тэма расійска-польскіх рэвалюцыйных сувязяў [207; 175].

У польскай гістарыяграфіі 20—40-ых гадоў XX стагоддзя з'явіліся першыя абагульняючыя работы па гісторыі культуры Рэчы Паспалітай, і перадусім шляхецкай культуры, У. Лазінскага «Życie polskie w dawnych wiekach» [320], Я. Быстраня «Dzieje obyczajów w dawnej Polsce» [291], А. Брукнера «Dzieje kultury polskej» [287]. У. Лазінскі і Я. Быстрань у сваіх работах, якія А. Заянчкоўскі адносіць да жанру «гістарычнай этнаграфіі», абмяжоўваліся канцом XVIII стагоддзя.

У двухтомным выданні «Encyklopedia staropolska ilustrowana» (1939) А. Брукнер, падкрэсліваючы пераемнасць з аналагічнай работай З. Глогера, указаў метадалагічныя недахопы апошняй [288]. У адрозненні ад выдання З. Глогера, у энцыклапедыі А. Брукнера пашырана крыніцазнаўчая база, кніга багата ілюстравана старажытнымі гравюрамі. У дадзенай рабоце аднак беларускаму рэгіёну надаецца невялікая ўвага. У трэцім томе (1931) работы А. Брукнера «Dzieje kultury polskej» разглядаецца культура новага часу. А. Брукнер вылучыў уплыў касцёла на фарміраванне саслоўнай шляхецкай ідэалогіі, адзначыў «чынную» ролю каталіцкага святарства ў працэсе разумовай стагнацыі мясцовага прывілеяванага грамадства. А. Брукнер падкрэслівае наяўнасць у шляхецкім характары двух дамінант — фанабэрыі (даследчык параўноўваў эксцэсы шляхецкай пыхі з эпідэміяй псіхапатыі) і адначасова рабалепства перад вышэйшым. Негатыўныя моманты маральна-псіхалагічнай характарыстыкі «сармата» А. Брукнер высноўваў з наступстваў

дэмаралізуючай палітыкі саскай дынастыі і алігархічнай сістэмы ўлады ў Рэчы Паспалітай.

У гістарыяграфіі Польскай Народнай Рэспублікі паваеннага дзесяцігоддзя вывучэнне шляхецкай культуры не з’яўлялася прыярытэтам. Да здабыткаў польскай гістарычнай навукі 40—50-ых гадоў XX стагоддзя можна аднесці даследаванні феномена «сарматызма» Т. Манькоўскага («Genealogia sarmatyzmu», 1946) і Т. Дабравольскага («Polskie malarstwo portretowe», 1948) [322; 294].

**Гістарыяграфія другой паловы XX ст. — пачатку XXI ст.** Узрастанне цікавасці да праблемаў гісторыі культуры, у тым ліку і гісторыі культуры прывілеяванага саслоўя, назіраецца ў беларускай савецкай гістарыяграфіі ў 70—80-я гады XX стагоддзя. Падагульняючы характар у савецкай беларускай этнаграфіі пасляваеннага перыяду ў вывучэнні матэрыяльнай культуры беларусаў маюць работы Л. Малчанавай «Материальная культура белорусов» (1968) [167] і «Очерки материальной культуры белорусов XVI—XVIII вв.» (1981) [168], у якіх разглядаюцца асаблівасці сядзібы і жытла, адзення, харчавання прывілеяванага саслоўя, прасочваюцца міжкультурныя ўзаемасувязі з суседнімі народамі.

Этапны характар носіць работа А.І. Мальдзіса «Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя. Нарысы быту і звычаяў» (1982) (другое, дапоўненае і дапрацаванае, выданне выйшла ў 2001 годзе пад назвай «Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі») [152; 154]. Гэта першае ў беларускай савецкай гістарыяграфіі комплекснае даследаванне шляхецкай культуры. А.І. Мальдзісу належыць прыярытэт у распрацоўцы метадалогіі даследавання шляхецкай культуры Беларусі і вызначэнні яе структурных элементаў. А.І. Мальдзіс упершыню ўвёў у разгляд беларускай гістарычнай навукі вялікі корпус мемуарных крыніц XVIII стагоддзя, абгрунтаваў магчымасць выкарыстання як дадатковай этнаграфічнай крыніцы літаратурных тэкстаў Ю. Крашэўскага, Г. Жавускага, І. Ходзькі. Дадзеная работа А.І. Мальдзіса стымулявала ў беларускай гуманітарнай навуцы абуджэнне інтарэсу да вывучэння культуры прывілеяванага саслоўя. Храналагічна даследаванне А.І. Мальдзіса «Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры» абмежавана абсягам XVIII стагоддзя.

У 80—90-ыя гады XX стагоддзя ў беларускай этналагічнай навуцы з’явіўся шэраг буйных работ, прысвечаных пытанням этнагенезу беларусаў і фарміравання беларускай этнічнай ідэнтычнасці. Абагульняючы характар мае калектыўная манаграфія «Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя» (1985) [269]. У раздзеле «Фарміраванне беларускай народнасці» І.У. Чаквіным упершыню ў беларускай гістарыяграфіі разглядаецца пытанне фарміравання «сармацкай» этнагенетычнай канцэпцыі

паходжання «шляхецкага народа» [269, с. 84]. І.У. Чаквін дае тэрміналагічнае вызначэнне саслоўна-маёмаснай наменклатуры набілітэту. Прасочваюцца шляхі складвання шляхецкага саслоўя, выяўляецца яго эканамічная, канфесійная і этнічная неаднароднасць [269, с. 84—86]. Такім чынам, І.У. Чаквін упершыню вызначыў шэраг новых для айчыннай этналагічнай навукі вобласцяў, звязаных з культурай прывілеяванага саслоўя і шляхецкай саслоўнай ідэалогіяй. Дадзеныя аспекты разглядаюцца даследчыкам і ў іншых работах [242; 243].

У 1991 годзе выйшла работа М.Ф. Піліпенкі «Узнікненне Беларусі: Новая канцэпцыя» [183]. М.Ф. Піліпенка ў дадзенай рабоце звяртае ўвагу на неабходнасць збалансаванага падыходу да пытання знешніх культурных уплываў. На думку аўтара, у працэсе этнагенезу беларускі этнас не проста пасіўна засвойваў чужую культуру (польскую ці літоўскую), — адбываліся адбор і асіміляцыя іншаэтнічных культурных узораў. Канцэпцыя М.Ф. Піліпенкі, паводле якой культура паланізаваных груп разглядаецца як адзін з будаўнічых элементаў этнагенезу беларусаў, стварыла новую парадыгму ў айчыннай этналогіі, зрабіўшую магчымым даследаванне шляхецкай культуры ў кантэксце агульнабеларускага культурагенезу.

У рабоце П.В. Церашковіча «Этнічная гісторыя Беларусі XIX — пачатку XX ст.» (2004) ставіцца задача дэміфалагізацыі этнічнай гісторыі беларусаў [218]. Найбольш прадуктыўным падыходам у вырашэнні дадзенай праблемы бачыцца аўтару зварот да аналізу статыстычных матэрыялаў. П.В. Церашковіч вылучае шэраг крытэрыяў (узровень урбанізацыі, пісьменнасць), улік якіх дазваляе даследчыку атрымаць больш аб’ектыўную карціну этнічных працэсаў. У рабоце даецца разгляд і аналіз сучасных канцэпцый у галіне тэорыі нацыі. Развіццё беларускага нацыянальнага руху пададзена ў кантэксце аналагічных працэсаў у Цэнтральна-Усходнім рэгіёне Еўропы. Адлюстраваны асаблівасці фарміравання беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі, а таксама месца ў яе генезе шляхецкага элементу.

Манаграфія С.Я. Куль-Сяльверставай «Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур: Фарміраванне культуры Новага часу на беларускіх землях (другая палова XVIII ст. — 1820-я гады)» у значнай ступені прысвечана вывучэнню культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі (2000) [127]. Асаблівасцю работы з’яўляецца адлюстраванне ідэалагічнай дынамікі у беларускай культуры. Еўрапейская гісторыя ідэй з’яўляецца тым кантэкстам, у якім аўтару бачыцца культурны працэс у Беларусі другой паловы XVIII ст. — 1820-я гадоў. Адсюль пэўная абсалютызацыя ў рабоце С.Я. Куль-Сяльверставай такіх абстрактных канструкцый як «Асветніцтва», «Усход», «Захад». Дасягненнем аўтара з’яўляецца прыцягненне ў абсяг даследавання вялікай колькасці новага

фактычнага матэрыялу, атрыманага дзякуючы вывучэнню архіўных, мемуарных і эпісталярных крыніц.

У кандыдацкай дысертацыі А.А. Кілбас «Культура прывілеяванага саслоўя на Беларусі (XIV — XVI стст.)» (2003) (у 2004 годзе пашыраны і дапоўнены матэрыял дысертацыі быў пакладзены ў аснову манаграфіі «Культура прывілеяванага саслоўя на Беларусі (XIV — XVI стст.)») арыстакратычная культура разглядаецца як састаўная частка этнічнай культуры беларусаў [94; 95]. Прасочваюцца знешнія ўплывы — як заходнееўрапейскія, так і «ўсходнія». Работа А.А. Кілбас з'яўляецца першым у беларускай этналагічнай навуцы вопытам комплекснага даследавання культуры прывілеяваных груп Беларусі ў XIV — XVI стагоддзях.

У манаграфія А.П. Жытко «Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1860—1914 гг.» (2003) разгледжана дынаміка маёмаснай і сацыяльнай дыферэнцыяцыі дваранства ў парэформеннай Беларусі [74]. Прааналізаваны канфесійны і этнічны склад дадзенага саслоўя. Адлюстраваны аспект узаемадачынення царскай адміністрацыі і мясцовага шляхецтва, значнае месца нададзена дваранскай гаспадарчай дзейнасці. Развіццё дваранскай культуры ў дадзенай рабоце асобна не аналізуецца.

У дысертацыі І.Р. Вугліка (у 2005 годзе матэрыялы дысертацыі пакладзены ў аснову вучэбна-метадычнага дапаможніка «Матэрыяльная культура і быт беларусаў XVII — XVIII стст.») даследуецца мілітарны аспект шляхецкай культуры [50; 51]. У рабоце паказана знакава-сімвалічнае вымярэнне побытавага асяроддзя, рэчавага атачэння, інтэр'еру шляхецкіх сядзіб. Храналагічна работа абмежавана XVIII стагоддзем.

У апошняе трыццацігоддзе з'явіўся шэраг даследаванняў, прысвечаных асобным аспектам матэрыяльнай культуры беларусаў, у тым ліку, і культуры прывілеяванага саслоўя. Вывучэнню архітэктурнай спадчыны Беларусі прысвечаны работы А.М. Кулагіна [124; 125], Б.А. Лазукі [130], А.І. Лакоткі [131; 132; 133], М.А. Ткачова [218], У.А. Чантурыі [244], А.Т. Федарука [228]. Гісторыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі прысвечана манаграфія Я.М. Сахуты «Беларусы: Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» (2005) [203]. Гісторыя беларускага касцюма, у тым ліку «дваранскага», даследуецца ў манаграфіях Л.І. Маленкі «Белорусский костюм XIX — XX вв.» (2006) [147], В.М. Бялявінай і Л.В. Ракавай «Мужчынскі касцюм на Беларусі» (2007) і «Жаночы касцюм на Беларусі» (2008) [44; 45]. Асобныя рысы матэрыяльнай культуры шляхецтва разгледжаны ў работах В.С. Цітова [239, 241]. Пэўны ўклад у даследаванне матэрыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі належыць айчыннай археалогіі [9].

Сацыяльная культура прывілеяванага саслоўя Беларусі вывучаецца сучаснымі беларускімі этнолагамі В.М. Бялявінай, А.У. Гурко, Г.І. Каспяровіч,

Г.М. Курыловіч, Т.І. Кухаронак, Л.В. Ракавай, І.У. Чаквіным [29—31]. Пытанням этнаканфесійных адносін, у тым ліку, у асяроддзі прывілеяванага саслоўя, прысвечаны работы Я.Н. Мараша [155—157], Т.Б. Бліновай [36], М.С. Корзуна [117], С.В. Марозавай [159]. У рабоце С.М. Самбук «Палітыка царызму ў Беларусі ў другой палове XIX стагоддзя» (1980) была прааналізавана палітыка царызму ў адносінах шляхецтва [201]. У 90-ых гадах XX стагоддзя з'явіліся даследаванні па гісторыі беларускага дваранства Г.М. Туміловіч [221] і С.Л. Лугаўцовай [142]. Сярод новых айчынных работ варта адзначыць даследаванне В.С. Макарэвіча «Дробная шляхта Беларусі ў 30–60-я гг. XIX ст. : склад і эвалюцыя сацыяльна-прававога становішча» [145].

Беларускі этнолаг А.Р. Раюк правёў комплекснае даследаванне этнасацыяльнай структуры беларускага грамадства на працягу 1772—1863 гадоў як іерархічнай сістэмы саслоўных і этнічных груп. Даследчык выявіў механізмы сацыяльнай мабільнасці ў дачыненні да прадстаўнікоў розных саслоўяў беларускага этнасу, у тым ліку і прывілеяванага стану. Навацыйным элементам у даследаванні А.Р. Раюка з'яўляецца вылучэнне фармальных і нефармальных структур айчыннага грамадства. Аўтар указвае на вызначальную ролю шляхецтва ў кансалідацыі беларускай супольнасці. Раскрываюцца асаблівасці сацыяльнай мабільнасці ва ўмовах Расійскай імперыі [192].

Міжсаслоўным адносінам у беларускай вёсцы прысвечана работа В.В. Чапко «Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в.» (1982) [252]. Пытанням этнічнай свядомасці прывілеяванага саслоўя беларускага грамадства прысвечаны работы А. Латышонка і А. Смалянчука [136; 206]. Масонскі рух як фактар грамадска-палітычнага і культурнага жыцця Беларусі ў канцы XVIII — пачатку XX стст. разгледжаны ў калектыўным зборніку «Вольныя муляры ў беларускай гісторыі» (2005) [48].

Пытанне дваранска-памешчыцкага прадпрыемніцтва разглядалася ў работах М.Ф. Болбаса [38], А.М. Лютага [144], М.М. Улашчыка [225], В.В. Чапко [251]. Праблеме шляхецкага і магнацкага землеўладання і землекарыстання было прысвечана даследаванне П.Г. Казлоўскага «Землевладение и землепользование в Белоруссии в XVIII — первой половине XIX в.» (1982) [114]. Абагульняючы характар у даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі мае калектыўная манаграфія «Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён», у першым (1997) і другім томе (2002) якой разглядаюцца аспекты гісторыі памешчыцкай гаспадаркі ў XIX ст. [54; 55].

Значны ўклад у вывучэнне духоўнай культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі належыць айчынным гісторыкам літаратуры С. Александровічу [7], І. Басу [21, 22], Г. Кісялёву [106—110], А. Мальдзісу [148—154], якія ўпершыню ў беларускім літаратуразнаўстве пачалі весці сістэмны архіўны

пошук, прыцягваць да разгляду шырокае кола іншамоўных крыніц. У дадзеным фарватэры працягвалі працу У. Казбярук [86], У. Мархель [161], І. Штэйнер [257], І. Запрудскі [78], М. Хаўстовіч [230], Я. Янушкевіч [273]. На шырокай крыніцазнаўчай базе грунтуецца даследаванне М. Цікоцкага «З гісторыі беларускай журналістыкі XIX стагоддзя» (1960) [238]. Значна пашырыў крыніцазнаўчую базу даследаванняў беларускай духоўнай культуры выхад хрэстаматый «Беларуская літаратура XIX стагоддзя» (1971) [25], «Пачынальнікі» (1977, 2-е выданне — 2003) [181], «Беларуская літаратура XIX стагоддзя» (1988) [26], «Літаратура Беларусі: першая палова XIX стагоддзя» (2000) [139], «Заняпад і Адраджэнне: Беларуская літаратура XIX стагоддзя» (2001) [76], гісторыка-літаратурных зборнікаў «Шляхам гадоў», шматтомнай серыі «Беларускі кнігазбор».

Пытанні аматарскай краязнаўчай, археалагічнай і этнаграфічнай дзейнасці ў асяроддзі беларускага дваранства, аспекты збіральніцтва і калекцыяніравання знайшлі сваё адлюстраванне ў работах Г.А. Каханоўскага [92; 93], Л.В. Аляксеева [8], В. Бандарчыка [13; 15], У. Васілевіча [47], а таксама ў зборніку «Беларуская фалькларыстыка. Эпоха феадалізму» (1989) [27].

Абагульняючы характар па гісторыі Беларусі пасля 1795 года маюць работы пад рэдакцыяй І.П. Крэня «Гісторыя Беларусі: з 1795 г. да вясны 1917 г.» (2001) і З.В. Шыбекі «Нарыс гісторыі Беларусі» (2003) [53; 258]. На працягу апошняга трыццаціgoddзя выйшаў шэраг энцыклапедычных даведнікаў, у якіх знайшлі адлюстраванне разнастайныя аспекты гісторыі культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі. У першую чаргу, гэта «Вялікае княства Літоўскае», «Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі» [211], «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» ў 6 тамах [268], «Беларусь: Энцыклапедычны даведнік» [32].

Такім чынам, можна канстатаваць наяўнасць пазітыўных зрухаў, якія адбываліся ў пасляваенныя гады ў беларускай савецкай гістарычнай, этналагічнай і мастацтвазнаўчай навуцы ў вывучэнні культуры айчыннага прывілеяванага саслоўя. Аднак часта ўклад эліты ў культурнае жыццё Беларусі падаваўся рэдукаваным, у межах супрацьпастаўлення з традыцыйнай сялянскай і мяшчанскай культурамі. У сучаснай беларускай гуманітарнай навуцы дадзеная схема пераадольваецца, але дасюль не хапае комплексных даследаванняў культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі.

У 60—80-ых гадах XX стагоддзя руская савецкая гістарыяграфія хоць і не пазбылася спецыфічнай схематычнасці і тэндэнцыйнасці, але гэты перыяд прынёс шэраг выдатных даследаванняў. Варта адзначыць работу Л.І. Тананаевай «Сарматский портрет. Из истории польского портрета эпохи

барокко» (1979) [217]. Аўтар указала на комплексны характар сарматызма, як з'явы эстэтычнай і этычнай. Л.І. Тананаева выкарыстала ў сваёй кнізе беларускі матэрыял, але інтэрпрэтавала яго ў кантэксце выключна польскіх культурных тэндэнцый. Элементы духоўнай культуры шляхецтва разглядаюцца ў работах І.І. Свірыды [204] і І.Ф. Бэлзы [42].

На мяжы 50—60-ых гадоў XX стагоддзя ў гістарыяграфіі Польскай Народнай Рэспублікі выявілася пэўная тэндэнцыя да больш аб'ектыўнага аналізу культуры прывілеяванага саслоўя, пазбаўленага вульгарнай сацыялагізацыі. Але як і ў дарэвалюцыйнай польскай гістарыяграфіі, у гістарычных даследаваннях аўтараў Польскай Народнай Рэспублікі пад тэрмінам «культура польскай шляхты» разумелася поліэтнічная культура прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя на ўсіх землях колішняй Рэчы Паспалітай, у тым ліку і Беларусі.

У 1961 годзе выйшла работа А. Заянчкоўскага «Галоўныя элементы шляхецкай культуры ў Польшчы. Ідэалогія і структура саслоўя» [348], якая была перавыдадзена ў 1993 годзе пад назвай «Польская шляхта. Культура і структура» [349]. Аўтар падкрэсліў унутраную неаднароднасць шляхецкага саслоўя, наяўнасць у ім іерархічных структур. Культуру прывілеяванага саслоўя на землях былой Рэчы Паспалітай пасля раздзелаў А. Заянчкоўскі ахарактарызаваў як «постшляхецкую», падкрэсліваючы, што яна ў значнай ступені страціла свае традыцыйныя «сармацкія» рысы і гамагеннасць.

Нарматыўныя ўзоры паводзін, маральныя каштоўнасці мілітарнай арыстакратыі даследуюцца ў манаграфіі М. Асоўскай «Ethos rycerski i jego odmiany» (1973) [173]. Аспекты саслоўнай псіхалогіі і ідэалогіі прывілеяваных груп разглядаюцца ў работах С. Кеневіча «Historyk a świadomość narodowa» (1982) [308], А. Кемпінскага «Lach i Moskal. Z dziejów stereatypu» (1990) [307], Р. Вапінскага «Polska i małe ojczyzny polaków» (1994) [345]. Пытанне этнакультурнай ідэнтычнасці шляхецтва Беларусі закранаецца ў работах Ю. Бардаха [280, 281]. У працы польскага даследчыка Р. Радзіка «Między zbiorowością etniczną a wspólnotą narodową : Białorusini na tle przemian narodowych w Europie Środkowo-Wschodniej XIX stulecia» (2000), прысвечанай вывучэнню этнакультурнага працэсу ў Беларусі, назіраецца пэўная спроба мадэрнізацыі ідэалагемы аб «негістарычным характары» беларускай нацыі [335].

Агульны характар носяць работы па гісторыі культуры Рэчы Паспалітай, і перадусім шляхецкай культуры, З. Куховіча «Z dziejów obyczajów polskich w wieku XVII i pierwszej poł. XVIII» (1975), перавыданні — пад назвай «Obyczaje staropolskie XVII—XVIII w.» [317], а таксама «Obyczaje i postacie Polski szlacheckiej XVI—XVIII wieku» (1993) [318], М. Багуцкай «Dzieje kultury polskiej do 1918 roku» (1987) [284], Я. Тазбіра [341; 342]. Каштоўнай работай,

якая прысвечана матэрыяльнай культуры шляхецкіх маёнткаў колішняй Рэчы Паспалітай, з'яўляецца шматтомнае выданне Р. Афтаназі «Dzieje rezydencji na dawnych Kresach Rzeczypospolitej» [274; 275; 276]. Работа ўтрымлівае звесткі, якія датычаць не толькі знешняга выгляду, начынння сядзіб, але і радавой гісторыі іх уладальнікаў. Даследаванню гісторыі касцюма прывілеяванага саслоўя прысвечаны работы А. Банаха [279], М. Барткевіч [282], М. Гуткоўскай-Рыхлеўскай [304].

Польскія даследчыкі ў сваіх работах абмяжоўваюцца пераважна разглядам працэсаў на тэрыторыі польскай дзяржавы, звяртаючыся толькі эпізадычна да зямель, што адыходзілі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай да Расійскай імперыі.

У кнігах «украінскай трылогіі» французскага даследчыка Д. Бавуа, што была выдадзена пад адной вокладкай у польскім перакладзе пад назвай «Trójkąt ukraiński. Szlachta, carat i lud na Wołyniu, Podolu i Kijowszczyźnie, 1793—1914» (2005) [286]), разглядаецца дынаміка палітычных, эканамічных і культурных узаемадзеянняў шляхецтва, царскай адміністрацыі і сялянства на землях Украіны і часткова Беларусі на працягу 1793—1914 гадоў. Д. Бавуа належыць таксама манаграфія «Lumières et Société en Europe de l'Est. L'Université de Vilna et les écoles polonaises de l'empire Russe (1803—1832)» (1991) (польскі пераклад — «Szkolnictwo polskie na ziemiach litewsko-ruskich, 1803—1832» (1991)) [285].

Даследаванне грунтавалася на шырокай базе наратыўных крыніц: мемуарнай і эпісталярнай спадчыне сучаснікаў эпохі, публіцыстычных матэрыялах, нататках вандроўнікаў, гісторыка-мастацкіх творах першай паловы XIX стагоддзя. Яны маюць бясспрэчную вартасць пры рэканструкцыі ўнутраных сувязяў розных элементаў культуры, асабліва яе духоўных і сацыяльна-псіхалагічных састаўляючых. Асаблівасцю эпохі з'яўлялася тэндэнцыя да большай дакладнасці і дакументаванасці падобных пісьмовых выказванняў, якія аднак патрабуюць узважанага аналізу.

Адным з першых узораў айчыннай краязнаўчай публіцыстыкі з'яўляюцца творы Р. Падбярэскага «Беларусь і Ян Баршчэўскі» (1844), «Лісты пра Беларусь» (1844), «Панарама места Полацка» (1845) [176; 177]. У сваіх артыкулах Р. Падбярэскі палемізуе з негатыўным стэрэатыпам у адносінах «беларускай шляхты», які знайшоў адлюстраванне ў творах П. Кушына, М. Пагодзіна, Ф. Булгарына, апавядае аб асаблівасцях гаспадарчага і культурнага жыцця беларускага шляхецтва, раскрывае духоўны свет і звычаі маёнткаў і засценкаў.

Багатую публіцыстычную спадчыну пакінуў У. Сыракомля [213; 214; 215]. Аб'ектам назірання для У. Сыракомлі часта рабіліся «браты малодшыя»

— дробнае шляхецтва, іх побыт, норавы, заняткі, заганы, адносіны са знешнім сацыяльным асяродкам. Аўтарству У. Сыракомлі належаць дарожныя нарысы «Wędrówki po moich niegdyś okolicach. Wspomnienia, studia historyczne i obyczaje» (1853), «Wycieczki po Litwie w promieniach od Wilna» (1857), «Dni doroczne na Litwie, szereg obrazków, Wilno i Dynaburg» (1858).

У кнізе Ю. Крашэўскага «Wspomnienia Wołynia, Polesia i Litwy» (1840) даюцца сацыяльна-псіхалагічныя замалёўкі шляхецкіх тыпаў, крытыкуюцца маральныя заганы шляхецтва, паказваецца разрыў паміж еўрапейскім выхаваннем панства і феадальнымі традыцыямі [316].

Каштоўнай крыніцай па гісторыі культуры прывілеяванага саслоў Беларусі першай паловы XIX стагоддзя з'яўляюцца нататкі П.М. Шпілеўскага «Путешествие по Полесью и белорусскому краю», у якіх аўтар апісвае паселішчы дробнай шляхты, вопратку, звычаі, забабоны, заняткі, сферу адпачынка, характарызуе адносіны шляхецтва з іншымі саслоўямі [256]. Пісьменніку належаць таксама работы «Мозырщина» (1859), «Западнорусские очерки» (1858—1859), «Поездка в западные губернии» (1860), якія друкаваліся ў перыядычных расійскіх выданнях.

У першай палове XIX стагоддзя шэраг нататкаў пра Беларусь пакінулі таксама рускія вандроўнікі К.І. Арсеньеў, І.Д. Захараў, В.М. Севяргін, В.П. Шышкіна, М.С. Шчукін, Д.І. Мацкевіч.

Мемуарная і эпісталярная спадчына мае цікавасць як важная крыніца ў вывучэнні этнакультурных эпохі. Для падобнага даследавання суб'ектыўны характар мемуарных дакументаў робіцца іх станоўчым бокам.

Сярод мемуарных сведчанняў эпохі першачарговай увагі заслугоўваюць запісы Г. Пузыні, якія адлюстроўваюць гістарычныя падзеі, што адбываюцца на заходнебеларускіх абшарах (Вільня, Дабраўляны, Дзярэчын, Паставы) з 1815 па 1843 год [334]. На старонках мемуараў паўстае побыт арыстакратыі (Вайніловічаў, Гюнтэраў, Пшаздзецкіх, Радзівілаў, Сапегаў), сустракаюцца партрэты інтэлігенцыі края (Э. Адынец, А. Ходзька). Нататкі даюць грунтоўную інфармацыю пра сферу забаў, жаночы побыт беларускай шляхцянкі на працягу значнага перыяду, што дазваляе выяўляць змяненне тэндэнцыі ў развіцці культуры прывілеяванага саслоўя, фіксаваць уздзеянне палітычных падзеяў (вайна 1812 года і паўстанне 1830—1831 гадоў) на светапогляд шляхецтва.

Сярод мемуарнай спадчыны мясцовага каталіцкага дваранства заўважнае месца займаюць мемуары і перапіска філаматаў. Мемуары філаматаў (філарэтаў) і сведчанні пра філаматаў выдаваліся як у зборніках «Z filareckiego świata: Zbiór wspomnień z lat 1816—1824» (1924) [348], «Głosy sprzed wieku. Szkice z dziejów procesu filareckiego» (1924) [334], так і асобна (Э. Адынец, І. Дамейка, С. Мараўскі). Перапіска філаматаў сабрана ў шэрагу

выданняў: «Archiwum filomatów. Cz. 1: Korespondencja filomatów. 1815—1823: W 5 t.» (1913) [278].

Варта вылучыць нататкі Э. Адынца («Wspomnienia z przeszłości opowiadane Deotyme») [332], С. Мараўскага («Kilka lat młodości mojej w Wilnie (1818—1825)») [326] і Э. Масальскага. («Z pamiętników (1799—1824)») [324]. Яны вызначаюцца шырокім ахопам падзеяў, аўтараў вылучае высокая сацыяльная актыўнасць, веданне разнастайных слаёў прывілеяванага саслоўя, мастацкія і аналітычныя здольнасці. Мемуары Э. Масальскага каштоўныя таксама тым, што адлюстроўваць разнастайную геаграфію беларускіх зямель (Ігуменшчына, Магілёўшчына, Полацк, Мінск, Вільня) і дыяметральныя па сваім палітычным і ідэалагічным арыентацыям асяродкі.

«Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану» Л. Патоцкага ўтрымліваюць звесткі аб побыце і звычаях арыстакратыі — Сапегаў, Тышкевічаў, Патоцкіх [180]. Успаміны Л. Тышкевіча ілюструюць нарастанне касмапалітычных тэндэнцый у культуры мясцовай арыстакратыі, дэманструюць механізмы яе ўплыву на культуру сярэдняй і дробнай шляхты. Мемуары Е. Фялінскай адлюстроўваюць шляхецкія рэаліі першай паловы XIX стагоддзя [297; 298]. У нататках паказана жыццё шляхецкіх маёнткаў на Міншчыне і на Валыні. Мемуары адлюстроўваюць кола жаночых заняткаў, матрыманіяльных стратэгій, адлюстроўваюць адрозненні ў культуры пратэстанцкай шляхты Беларусі.

Нататкі княгіні Н. Галіцынай «О польском восстании 1830—1831 г.» адлюстроўваюць адносіны расійскай арыстакратыі да мясцовага набілітэту, выяўляюць міжэтнічныя стэрэатыпы [56]. Н. Галіцына стварае яркія псіхалагічныя партрэты мясцовых дваран, апавядае аб побыце набілітэту.

«Истинное повествование или жизнь Гавриила Добрынина, им самим писанная. 1752—1823» належаць былому служыцелю праваслаўнай царквы, чыноўніку [62]. Геаграфічная лакалізацыя падзеяў — усходнебеларускія землі (Рагачоў, Магілёў, Віцебск). Мемуары адлюстроўваюць побыт мясцовага праваслаўнага чыноўніцтва і духавенства.

Кніга М. Нікіфароўскага «Странички из недавней старины города Витебска: Воспоминания старожила» пазбаўлена асабістых падрабязнасцяў і падаецца як гарадская хроніка [172]. Дадзены тэкст ілюструе гарадскі побыт усходнебеларускага праваслаўнага чыноўніцтва сярэдзіны XIX стагоддзя.

Прасачыць дынаміку зменаў у культуры жыццезабеспячэння прывілеяванага саслоўя дазваляе даведачная і спецыяльная літаратура эпохі (кулінарныя і гаспадарчыя параднікі, календары). З першай палове XIX стагоддзя робяцца папулярнымі кулінарныя даведнікі Я. Шытлера «Kuchnia myśliwska czyli na łowach» (1823), «Kucharz dobrze usposobiony» (1830), «Poradnik dla myśliwych» (1839), «Kucharz Nowy dla osób osłabionych» (1837),

«Kucharka oszczędna» (1846). Кулінарную рэцэптуру ўтрымліваюць таксама кнігі Г. Цюндзявіцкай «Gospodyni litewska» (1848) і В. Завадскай «Kucharka Litewska» (1854). Карыстаўся вядомасцю гаспадарчы даведнік Ю. Струмілы «Ogrody północne» (1823). Энцыклапедычны характар мела кніга Г. Цюндзявіцкай «Gospodyni litewska», у якой утрымліваюцца парады для жанчын па вядзенню шляхецкай гаспадаркі. Г. Цюндзявіцкая шмат увагі надавала пытанням гігіены, уліку, планавання і кантролю ў хатняй гаспадарцы — менавіта тым функцыям, якія, на думку аўтара, мусяць выконваць дбайныя гаспадыні маёнтку. Г. Цюндзявіцкая ў сваім выданні абапіралася як на мясцовы гаспадарчы вопыт, у тым ліку сялянскі, так і на заходнееўрапейскі (перадусім англійскі і нямецкі) [140].

Шырокую папулярнасць сярод дробнага шляхецтва мелі календары, якія выдаваліс у Гродне, Вільні, Полацку і Магілёве. У календарах прыводзіліся астранамічныя, рэлігійныя, палітычныя, агранамічныя звесткі, спісы кірмашоў, звесткі па гісторыі, генеалагічная інфармацыя.

Дапаможнай крыніцай, якая адлюстроўвае этнаграфічную інфармацыю і этнакультурныя стэрэатыпы, з’яўляецца бытапісальная і гістарычная белетрыстыка эпохі. З Беларуссю непасрэдна звязаны першыя дзевяць раздзелаў папулярнага рамана Ф. Булгарына «Иван Выжигин» (1829) [41]. Ф. Булгарын апісаў побыт усходнебеларускага панскага двара: структуру, абавязкі, норавы службовай шляхты і рэзідэнтаў, спосабы баўлення вольнага часу, звычай шляхецкай гасціннасці, застольныя рытуалы. На старонках твора выяўлены саслоўныя і этнічныя стэрэатыпы шляхецтва, абмаляваны адносіны паміж паламі і матрыманіяльныя стратэгіі. Пісьменнік выкрываў маральныя заганы шляхты, крытыкаваў традыцыйную шляхецкую практыку гаспадарання.

Кніга Э. Масальскага «Pan Podstolic, albo czem jesteśmy, czem być możemy» (1831—1833) у значнай ступені засноўваецца на рэальных падзеях, што адбываліся ў першай паловы XIX стагоддзя на землях ігуменскага маёнтку Д. Манюшкі [323]. У трох першых тамах кнігі паказана карціна прыгнечанасці і галечы беларускага прыгоннага сялянства, заняпад шляхецкіх гаспадарак праз бязладнае кіраванне, шляхецкае лайдацтва і жыццё не па сродках. У двух апошніх тамах Э. Масальскім выяўлены асветніцкі ідэал — узорная гаспадарка Пана Падстоліча, які вызваліў і ачыншаваў сваіх сялян, увёў пладазмен, заснаваў фабрыкі, заахвоціў яўрэйскае насельніцтва да ўдзелу ў сваіх пачынаннях, стварыў ашчадныя касы. Раман Э. Масальскага з’яўляецца каштоўнай крыніцай, якая дазваляе рэканструяваць саслоўную ідэалогію і ментальнасць шляхецтва Беларусі ў разглядаемы перыяд, прасачыць тэндэнцыі разбурэння традыцыйных «сармацкіх» уяўленняў і патрыярхальных гаспадарчых практык.

У эпічнай паэме «Пан Тадэвуш» (1834) А. Міцкевіча выяўлены выразныя тыпы нацыянальнай беларускай арыстакратыі [165]. Дадзены твор носіць энцыклапедычны характар па ахопу побытавых дэталяў з жыцця шляхецкіх маёнткаў у данапалеонаўскую эпоху. Менталітэт шляхецтва, яго традыцыйныя заняткі, формы баўлення вольнага часу, традыцыйная кулінарыя, рытуалы гасціннасці — знаходзяць сваё адлюстраванне на старонках «Пана Тадэвуша». Паэма дае таксама ўяўленне аб асаблівасцях лакальнай ліцвінскай ідэнтычнасці шляхецтва першай паловы XIX стагоддзя.

Гістарычны раман Г. Жавускага «Успаміны Сапліцы» (1839) хоць і засноўваецца на падзеях другой паловы XVIII стагоддзя, аднак у ім перадусім адлюстраваны гістарычныя ўяўленні шляхецтва першай паловы XIX стагоддзя, экза- і энданацыянальныя стэрэатыпы апошняга, узоры патрыятызму і рэлігійнасці, на якіх выхоўвалася моладзь азначанага перыяду [73]. У кнізе падкрэсліваецца самабытнасць беларуска-літоўскай шляхты, выяўляюцца асаблівасці ўзаемадачынення кампанентаў «ліцвінскай» і рэчпаспалітаўскай шляхецкай ідэнтычнасці.

Вялікае значэнне захоўваюць творы Я. Баршчэўскага: зборнік «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» (1844—1846) [19] і аповесць «Драўляны дзядок і кабета Інсекта» (1844) [20]. Празаічныя творы Я. Баршчэўскага з’яўляюцца адной з найпершых прэзентацый Беларусі ў польскамоўнай літаратуры XIX стагоддзя. У сваіх творах Я. Баршчэўскі сфармуляваў традыцыйныя асновы дробнашляхецкага светапогляду — цэласную сукупнасць філасофскіх, грамадска-палітычных і маральна-этычных поглядаў шляхціца першай паловы XIX стагоддзя. Аўтар апісаў духоўны свет паўночнабеларускага шляхецтва, яго звычаі і забабоны, расказаў пра штодзённыя заняткі і гаспадарчыя стратэгіі прадстаўнікоў дадзенага саслоўя. Творы Я. Баршчэўскага з’яўляюцца сведчаннем зближэння дробнашляхецкага асяроддзя Беларусі першай паловы XIX стагоддзя і сялянскай грамады, выспявання прадпасылак фарміравання беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці.

Многія творы І. Ходзькі ўзыходзяць да традыцыі шляхецкай гавэнды — вуснага апавядання [233; 292]. Бытапіс і этнаграфізм, уласцівыя творчай манеры І. Ходзькі, дазваляюць выкарыстоўваць яго творы ў якасці крыніцы па гісторыі побыту, звычак і нораваў дробнай заходнебеларускай шляхты канца XVIII — пачатку XIX стагоддзя.

Да традыцыі шляхецкай гавэнды ўзыходзіць і тэксты К. Буйніцкага «Wędrówka po małych drogach. Szkice obyczajow na prowincji» (1841) і «Nowa wędrówka po małych drogach. Szkice obyczajowe» (1852) [289; 290]. Аўтар у сваім аповедзі абапіраўся на анекдатычныя выпадкі з жыцця землякоў, якія ён стылізаваў у духу Л. Стэрна. Кнігі К. Буйніцкага ўтрымліваюць багатую

фактуру правінцыйнага побыту паўночнабеларускай шляхты першай паловы XIX стагоддзя і даюць уяўленне аб асаблівасцях грамадска-палітычнага жыцця дваранства, культуры баўлення часу, дачыненняў з іншымі саслоўямі, этнічных і гендэрных стэрэатыпах. У кнізе апісваюцца рэдуты, застольныя рытуалы, завядзёнкі міжполавых дачыненняў.

С. Мараўскі ў сваёй кнізе «Szlachta bracia», напісанай у 1849—1850 гадах, выкарыстоўваў асаблівасці гавэнды для ўзмацнення сатырычнага эфекту, выкрываючы маральныя заганы дробнага шляхецтва [327]. Сярод апошніх ён называе п’янства, неадукаванасць, фанабэрыю, хабарніцтва шляхцюкоў-чыноўнікаў. С. Мараўскі дае абразок побыту і дзейнасці правінцыйных судовых служачых, вымалёўвае стадыі сталення шляхецкай моладзі, указвае на хібы ў яе выхаванні. Кніга С. Мараўскага фіксуе той гістарычны момант, калі ў культуры дробнага шляхецтва пачаліся незваротныя тэндэнцыі самараспаду, а само шляхецтва імкліва люмпенізавалася, захоўваючы аднак моцную шляхецкую ідэнтычнасць.

Апублікаваныя актавыя матэрыялы, якія адносяцца да паўстанняў 1794 і 1830—1831 гадоў, а таксама вайны 1812 года (рэляцыі, рапарты, памятныя запіскі, праекты указаў, скаргі, мемарандумы), дазваляюць вызначыць этнаканфесійныя адносіны ў грамадстве, ідэалагічныя арыентацыі мясцовага набілітэту [2; 3; 4; 5; 6; 49; 178]. Варта аднак улічваць прапагандысцкі характар дакументаў ваеннага часу. Дакументальныя крыніцы, звязаныя з дзейнасцю філаматаў, выдадзены ў зборы «Archiwum filomatów. Cz. 2: Materialy do historii Towarzystwa filomatów: W 3 t.» (1920—1934) [278]. Яны адлюстроўваюць генезіс светапогляду і ідэалогіі дробнашляхецкай інтэлігенцыі Беларусі першай чвэрці XIX стагоддзя.

Юрыдычныя акты Расійскай імперыі, прадстаўленыя ў «Полном собрании законов Российской империи» (ПСЗ РИ) [185] і ў «Сводах законов Российской империи» [205], дазваляюць вызначыць нарматыўна замацаваны саслоўны падзел грамадства, прававы статус прывілеяванага саслоўя, дынаміку ўзаемаадносін мясцовага набілітэту і імперскай улады. Да 1840 года не страчваў актуальнасці ў Беларусі і Статут ВКЛ, нормы якога выяўляюць генезіс многіх мясцовых звычаяў.

Выявіць характэрныя рысы культуры жыццезабеспячэння і матэрыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя, прасачыць дынаміку міжсаслоўных адносін на вёсцы дапамагаюць інвентары («рэестры», «попісы») — апісанні феадальных уладанняў, якія складаліся на беларускіх землях у XVI — першай палове XIX стагоддзя. З гаспадарчых інструкцый, што паходзілі часткова і з беларускіх зямель, польскімі навукоўцамі быў укладзены двухтомны зборнік «Instrukcji gospodarcze dla dobr magnackich i szlachieckich z XVII—XIX w.» (1958—1963) [305]. Інвентары феадальных гаспадарак

Беларусі прадстаўлены ў шматтомных выданні «Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов» (1865—1915) [2; 3; 4; 5]. У XX стагоддзі інвентары і іншыя гаспадарчыя дакументы першай паловы XIX стагоддзя публікаваліся ў зборніках «Белоруссия в эпоху феодализма» (1959—1960) [33; 34], «Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі» [60], «Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII—XVIII вв.» (1977—1982) [84; 85].

Такім чынам, гістарыяграфічны аналіз паказаў, што культура прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд даследавана недастаткова і патрабуе далейшага вывучэння. Адсутнічаюць даследаванні, у якіх культура прывілеяванага саслоўя аналізуецца як комплексная з'ява. Абагульняючыя работы расійскіх і польскіх даследчыкаў часта ігнаруюць беларускую нацыянальную спецыфіку ў культуры мясцовага набілітэту. Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд не з'яўлялася да апошняга часу прадметам спецыяльнага этналагічнага даследавання. На сучасным этапе развіцця беларускай этналагічнай навукі адсутнічаюць абагульняючыя навуковыя даследаванні па дадзенай тэматыцы.

# ГЛАВА 2
# ІНАВАЦЫЙНАЯ ДЫНАМІКА КУЛЬТУРЫ ЖЫЦЦЯЗАБЕСПЯЧЭННЯ

## 2.1 Традыцыйныя заняткі і гаспадарчыя стратэгіі

У канцы XVIII стагоддзя шляхта складала да 7—8 працэнтаў насельніцтва ВКЛ [52]. Шляхецкі стан на землях былой Рэчы Паспалітай утваралі групы магнатэрыі, сярэдняй і дробнай шляхты [349, s. 31; 342, s. 157]. Найбольш шматлікай часткай айчыннага набілітэту з’яўлялася дробная шляхта. Прадстаўнікі дробнага шляхецтва пад час існавання Рэчы Паспалітай фармальна валодалі палітычнымі правамі прывілеяванага саслоўя, але звычайна не мелі зямельнай уласнасці. У Канстытуцыі 3 мая 1791 года прадугледжвалася абмежаванне палітычных правоў дробнага шляхецтва, аднак гэты заканадаўчы акт не меў прымянення. Малазямельная і беззямельная шляхта не ўпісвалася і ў сацыяльную структуру Расійскай імперыі. Для рускай дваранскай свядомасці дробны шляхціц уяўляўся непаўнавартасным дваранінам — чалавекам без уласнасці і гонару, палітычным наймітам.

Дробная шляхта складалася з некалькіх сацыяльных груп, якія сфарміраваліся пад час існавання Рэчы Паспалітай. Яны ўтварыліся адпаведна эканамічным прыкметам. Частковую шляхту (панкі, паўпанкі ці падпанкі) і ваколічную шляхту (засцянковую, заградовую, загонавую ці шарачковую) утваралі асобы, якія валодалі невялікай зямельнай уласнасцю, часам — некалькімі прыгоннымі. Чыншавая шляхта не мела сялян і зямельнай уласнасці, арандавала яе ў дзяржавы ці ў буйных землеўладальнікаў і апрацоўвала ўласнымі рукамі. Служылая шляхта была на прыватнай службе ў магнатаў, выконвала разнастайныя абавязкі пры панскім двары. Шляхецкая «галота» — люмпенізаваны элемент без пэўных заняткаў — не грэбавала і зладзействам. Дэкласаванай часткай шляхецтва, прадстаўнікі якой у пошуку заробку пераязджалі ў мястэчкі, з’яўлялася таксама «бруковая» шляхта.

В.С. Макарэвіч, які даследуе склад і эвалюцыя сацыяльна-прававога становішча дробнай беларускай шляхты на працягу 30—60-ых гадоў XIX стагоддзя, вылучае ў залежнасці ад месца пражывання, заняткаў і ладу жыцця наступныя групы шляхты: заградовая, загонавая ці ліндовая шляхта, частковая, бруковая (гарадская), шляхта-рамеснікі, шляхта-чыноўнікі, рабочая, хлебаробчая шляхта, беззямельная, дамовая, лузьная, службовая, арэндная, ардынацкая,

ленная, касцёльная, неаселая, афіцыялісты, пасэсары, камісары, рэзідэнты [146, с. 4].

Польскі даследчык А. Заянчкоўскі прапанаваў пpасторавы прынцып класіфікацыі шляхецкага стану. Найменшай лакальнай адзінкай шляхецкага стану, на яго думку, з’яўлялася вялікая сям’я або шляхецкі двор (рэзідэнцыя, маёнтак ці фальварак), які складалі родныя гаспадара, дамовая і гаспадарчая служба, прыгонныя сяляне. У склад гэтай супольнасці А. Заянчкоўскі далучае мясцовага карчмара і ксяндза. Двор быў цэнтрам прыцягнення і для беззямельнай шляхты [349, s. 59]. Наступным узроўнем пpаторавай структуры шляхецкага стану з’яўлялася малое суседства. Гэта нефармальная супольнасць некалькіх шляхецкіх засценкаў і двароў, насельнікі і гаспадары якіх знаходзіліся паміж сабой у сваяцкіх або прыязных суседскіх адносінах. Лакальныя суседствы ўваходзілі ў склад суседства вялікага, якое часта супадала з межамі ваяводстваў, правінцый або губерняў. Вялікае суседства ўтварала палітычную кааліцыю, згрупаваную вакол пэўнага магната. Сувязі лакальнага і вялікага суседства ажыццяўляліся праз кантакты нефармальных лідэраў малых суседстваў [349, s. 69].

Наяўнасць вялікіх суседстваў з уласнымі палітычнымі амбіцыямі спарадзіла праявы шляхецкага рэгіяналізму і партыкулярызму. Палітыка дзяржаўнай уніфікацыі, якая праводзілася расійскай імперскай адміністрацыяй, паступова ліквідавала падобную ізаляванасць, што аб’ектыўна стварала перадумовы для агульнанацыянальнага беларускага самавызначэння.

Для ўніфікацыі суладна агульнарасійскім крытэрыям мясцовых сацыяльных асаблівасцяў праводзіліся так званыя «разборы шляхты». Каб атрымаць правы расійскага двараніна прадстаўнікі шляхецтва мусілі дакументальна даводзіць сваё высакароднае паходжанне. Але часта такія дакументы адсутнічалі або не было сродкаў для правядзення генеалагічных росшукаў. У Рэчы Паспалітай не існавала геральдычнай службы, якая б спраўджвала шляхецкі рэестр. Гэта выклікала шматлікія выпадкі фальшавання радаводаў. Ахвотнік мог знайсці шляхціца з гербаванай «галоты» аднолькавага з ім прозвішча і праз хабар дамагчыся, каб яго прыпісалі да адпаведнага герба. Выпадкі махлярства з шляхецкімі радаводамі фіксаваліся і ў разглядаемы перыяд [349, s. 38]. Гэта спрыяла скептычным настроям у расійскім грамадстве ў дачыненні радавітасці мясцовага набілітэту. Выраз «польскі граф», напрыклад, набыў выразна іранічны падтэкст.

Асобы, што адшуквалі сваё дваранства, у афіцыйным справаводстве згадваліся пад тэрмінам «шляхта». Шляхціцы, якія даказалі сваё высакароднае паходжанне, называліся дваранамі. Але «шляхтай» часам называлі і

беззямельных ці малазямельных дваран пераважна каталіцкага веравызнання [74, с. 35].

Тыя, хто не патрапіў дакументальна давесці свае прэтэнзіі на дваранства, пераводзіліся ў падатныя станы (дзяржаўныя сяляне, вольныя хлебаробы, мяшчане) [52]. Вынікам няўдалага шляхецкага паўстання 1830—1831 гадоў стаў загад ад 19 кастрычніка 1831 года «Аб разборы шляхты ў заходніх губернях і аб уладкаванні гэтага роду людзей», што стварыў новыя юрыдычныя катэгорыі аднадворцаў заходніх губерняў і грамадзян заходніх губерняў, у якія залічваліся прадстаўнікі дробнага шляхецтва з няспраўджанымі дваранскімі правамі [187]. Адбыўся перагляд прававых норм аб дваранскім самакіраванні на беларускіх землях, на падставе якога дробная шляхта страчвала сваё значэнне і спецыфічную ролю ў функцыянаванні краёвай палітычнай сістэмы. Такім чынам, пасля выхаду закона ад 19 кастрычніка 1831 года афіцыйна юрыдычная катэгорыя «шляхта» была скасавана. Канчатковае фармальнае рашэнне «дробнашляхецкай праблемы» адбылося пасля ліквідацыі катэгорыі аднадворцаў і грамадзян заходніх губерняў паводле закона ад 19 лютага 1868 года і іх пераводу ў стан сялянства або мяшчан.

Аднак дробная шляхта супраціўлялася разборам і намагалася пазбегнуць пераводу ў падатковыя станы. Значная яе частка знаходзілася па-за фармальна вызначаным саслоўным статусам. Пазбягаючы ўліку і выплаты падаткаў, гэтая частка шляхты адначасова не мела і дваранскіх прывілеяў. Яна адрознівала сябе ад непрывілеяваных груп, захоўвала колішнюю саслоўную свядомасць і саманазву «шляхта», аднак часам саступала ў якасці жыцця нават сялянству. Дробная шляхта працягвала арыентавацца на арыстакратычныя культурныя ўзоры, але не мела адукацыйнага і эканамічнага цэнзу для засваення элітарных узораў культуры, ствараючы хімерычныя формы побыту.

Разам з тым, менавіта ў культуры дробнага шляхецтва захаваліся ў амаль некранутай форме «сармацкія» рудыменты. З дадзенага асяродка выйшла пэўная частка айчыннай інтэлігенцыі. Усё гэта не дазваляе выключыць дробнашляхецкую культуру з нашага разгляду. Тым больш, што элементы дэградацыі, што ў значнай ступені характарызуюць дадзеную культурную супольнасць, у разглядаемы намі перыяд выявіліся як тэндэнцыя і ў асноўным рэчышчы дваранскай культуры, прадвызначыўшы вектар яе будучага разлажэння.

Істотнай класіфікацыйнай прыкметай у афіцыйным справаводстве Расійскай імперыі з’яўлялася канфесійная прыналежнасць. Сярод мясцовага прывілеяванага саслоўя значную частку складалі каталікі. Але сярод дробнай шляхты пераважаў уніяцкі (да 1839 года) і праваслаўны элемент. Найперш гэта датычыць Магілёўскай і Віцебскай губерняў. Аднак і ў Мінскай губерні,

акрамя Наваградскага павета, сярод дробнага шляхецтва дамінавала праваслаўнае веравызнанне [218, с. 92; 145, с. 19]. У дачыненні патомнага дваранства працэнт каталікоў быў значна вышэйшы [81, с. 415].

***

Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя функцыі дваранства вынікаюць з прывілеяў і правоў дадзенай групы. Гістарычна дваранства фарміравалася як «служылае саслоўе». Вайсковая служба з'яўлялася напачатку галоўным абавязкам, а ў разглядаемы час — правам дваранства. Да цывільнай службы дваранства, у адрозненні ад іншых груп, таксама дапускалася без абмежаванняў. Аднак на выкананне адміністрацыйных і інавацыйных функцый у азначаны перыяд паспяхова прэтэндавала разначынная інтэлігенцыя. Мясцоваму шляхецтву не хапала адукацыйнага цэнзу (няведанне рускай мовы і расійскага заканадаўства) і палітычнага даверу з боку імперскай адміністрацыі, каб рэалізаваць сябе ў якасці кіруючай эліты.

Рэалізаваць свае сацыяльныя функцыі мясцовае дваранства часткова магло праз органы саслоўнага самакіравання, якія да паражэння паўстання 1830—1831 гадоў фарміраваліся адпаведна традыцыйным нормам статута ВКЛ. Шляхта выбірала дэпутатаў і сакратара шляхецкай дэпутацкай зборні, маршалкаў і харунжых. Суддзі, падсудкі, пісары ў Галоўным Літоўскім трыбунале, павятовых, земскіх, гродскіх і падкаморскіх судах, земскія паліцэйскія спраўнікі (да сакавіка 1826 года), засядацелі ў паліцэйскіх земскіх судах (да паўстання 1830—1831 гадоў) выбіраліся таксама шляхтай. Вознымі і каморнікамі маглі быць аселыя на зямлі шляхціцы, якія не мелі нават прыгонных [220, с. 6—8].

1 студзеня 1831 года было спынена дзеянне Статута ВКЛ на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў. 11 студзеня 1832 года былі скасаваны выбарныя пасады харунжых, падкаморыяў, каморнікаў, возных. Справаводства пераводзілася на рускую мову, якую, як і нормы расійскага заканадаўства, мясцовыя судовыя чыноўнікі ведалі блага. З 1833 года былі ўведзены закрытыя судовыя працэсы, што нанесла эканамічныя страты мясцовым адвакатам. У астатніх беларускіх губернях дзеянне Статута ВКЛ было скасавана 25 чэрвеня 1840 года [160, с. 3—8].

Мясцовае духавенства было параднёна з шляхецтвам, арыентавалася на арыстакратычныя побытавыя стандарты і ўтварала з дваранствам пэўную культурную еднасць. Для духавенства галоўным структураўтвараючым прынцыпам з'яўляўся канфесійны. Пераважная большасць мясцовых канфесій адносілася да хрысціянскага веравызнання. Істотным класіфікацыйным чыннікам быў падзел на «белае» (свяшчэннікі, якія не прыносілі манаскага

абяцання) і «чорнае» (манаства) духавенства. З шэрагаў манаства рэкрутавалася вышэйшая царкоўная іерархія. Для каталікоў і ўніятаў істотным фактарам з’яўлялася прыналежнасць да манаскіх ордэнаў.

Прадстаўнікі розных канфесій мелі неаднолькавае прававое становішча. Пры праходжанні цывільнай службы, напрыклад, дзеці праваслаўных свяшчэннікаў і дыяканаў, а таксама пастараў евангелічнага і рэфармацкага спавядання, атрымлівалі перавагі [271, с. 551]. Сярод галоўных сацыяльных функцый духавенства варта назваць кантроль за выкананнем маральных норм, псіхатэрапеўтычную дапамогу, міжсаслоўны арбітраж, ідэалагічнае забеспячэнне функцыянавання грамадскіх і дзяржаўных інстытутаў, гуртаванне супольнасці. Дадзеныя функцыі прадстаўнікі ўсіх канфесій выконвалі не ў поўнай ступені. Гэта тлумачыцца, з аднаго боку, абмежаваннямі на дзейнасць пэўных канфесій, з другога боку, агульнай стратай духавенствам лідзіруючага інтэлектуальнага становішча ў грамадстве.

Такім чынам, можна канстатаваць наяўнасць функцыянальнага крызісу ў дачыненні значнай часткі традыцыйнай эліты Беларусі. Адносячыся фармальна да прывілеяванага саслоўя, каталіцкае дваранства ў разглядаемы перыяд паступова страчвала рэальныя ўладныя рычагі.

***

У шляхецкім асяроддзі існавалі стэрэатыпы, якія абмяжоўвалі абсяг выбару прафесіі для прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя. Напрыклад, сярод прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя распаўсюджанымі былі аматарскія заняткі медыцынай: пані лячылі прыгонных і хатніх жывёл самаробнымі мікстурамі; сярод дробнага шляхецтва згадваюцца знахары, што выкарыстоўвалі травы, але прафесія медыка з’яўлялася для шляхціца непажаданай. Медыцына таму зрабілася пераважна сферай дзейнасці прадстаўнікоў нямецкага этнасу [256, с. 213].

Лічылася, што высакароднаму непамысна зарабляць на жыццё «локцем, квартай і доктарствам». Іншымі словамі, рамёствы, гандаль і медыцына не разглядаліся як шляхетныя заняткі [293, s. 153]. Гэта не было безумоўнай забаронай на прафесію для шляхціцаў. Хутчэй сэнс дадзенага абмежавання заключаўся ў засцярозе межаў шляхецкага стану ад размывання. Напрыклад, ад пранікнення ў яго шэрагі багатага мяшчанства. Ускосна гэта пацвярджаецца тым фактам, што прадстаўнікі сярэдняга і буйнога панства самі займаліся гандлёвымі спекуляцыямі, напрыклад, перапродажам лесу ці воўны, а засцянкоўцы зараблялі з продажу грыбоў ці сена [324, s. 221; 256, с. 14; 214; 19, с. 330].

Магчымасць абагачэння праз занятак гандлем, нават сярод прадстаўнікоў найбольш прадпрымальнага шляхецтва, разглядалася як справа маральна няпэўная і эканамічна рызыкоўная — вынік непразрыстай для шляхціца гульні выпадку, якую ён не ў стане быў пралічыць. Большасць вясковых гаспадароў мелі справу з аптовымі пакупнікамі, прадавалі ўласную сельскагаспадарчую прадукцыю (перадусім палявыя культуры — жыта, пшаніцу, грэчку, авёс, лён; а таксама малако, свойскую птушку) і вырабы вясковых мануфактур (палатно, колы, сохі) на танных мясцовых кірмашах або па аптовых цэнах яўрэйскаму купецтву ці эканомам магнацкіх уладанняў [256, с. 61; 215; 19, с. 330]. Лепшае становішча мелі гаспадары маёнткаў, якія знаходзіліся паблізу Дзвіны і галоўных яе прытокаў, — яны маглі накіроўваць збожжа і лес водным шляхам у Рыгу, дзе былі больш выгодныя цэны.

Шматвяковае змаганне шляхецтва з заможным беларускім мяшчанствам за дамінаванне ў грамадстве прывяло да заняпаду айчыннага гарадскога патрыцыяту і павелічэння прысутнасці ў прамыслова-гандлёвай і абслугоўваючай сферах прадстаўнікоў іншых этнічных груп. Назіралася спецыялізацыя эканамічнай дзейнасці па этнічнай прыкмеце [177, с. 263].

Асновай шляхецкага дабрабыту заставалася сельскагаспадарчая галіна. Праз пасярэдніцтва купцоў адбываўся продаж шляхтай будаўнічага лесу. Яўрэямі і рускімі пераважна арандаваліся сады ў шляхецкіх уладаннях [116, с. 469]. Буйныя землеўладальнікі ў беларускіх губернях практыкавалі здачу сваіх зямель у арэнду сярэдняй і дробнай шляхце. Патрэбы рынка стымулявалі пашырэнне пасеваў лёну, канапель, цукровых буракоў, тытуню, хмелю. З першай трэці XIX стагоддзя актыўна развівалася бульбаводства. Дробная шляхта непасрэдна ўдзельнічала ў сельскагаспадарчым вытворчым працэсе. Асноўнымі сельскагаспадарчымі культурамі ў шляхецкіх гаспадарках былі жыта, авёс, ячмень, пшаніца, проса, грэчка, гарох [236, с. 224; 116, с. 436; 256, с. 118—119].

Жывёлагадоўля была меней развітай галіною. Буйное панства трымала конезаводы. У большасці фальваркаў утрымлівалася невялікая колькасць буйной рагатай жывёлы і свіней, — не столькі ў прамысловых мэтах, колькі для ўласнага спажывання, а таксама атрымання якаснага ўгнаення. Дробная шляхта гадавала коз, свойскую птушку. Пэўнае гаспадарчае значэнне захоўвала паляванне. Дзічына нарыхтоўвалася для ўласнага спажывання [111, с. 82—83]. У засцянковай «галоты», якая ўсё болей паўперызавалася, сталай «крыніцай» даходу рабіўся крадзеж сельскагаспадарчых прадуктаў у больш дбайных гаспадароў і рабаванне «крамных» тавараў [327, s. 34].

Для традыцыйнага шляхецкага фальварку былі ўласцівы нерацыянальны характар землекарыстання, нізкая таварнасць. Прыгонніцтва стрымлівала

развіццё рынку рабочай сілы. Значнай была колькасць малазямельных гаспадарак. У гаспадарчай практыцы шляхецтва кіравалася часта неэканамічнымі меркаваннямі. У выніку, зона «польскага землекарыстання» ў Беларусі была хранічна стагнацыйнай. Экстэнсіўны характар шляхецкага гаспадарання адбіваўся ў першую чаргу на ўзроўні жыцця беларускага сялянства [34, с. 144]. Пашыраліся плошчы фальварковай ворнай зямлі і скарачаліся памеры зямель у сялянскім карыстанні [114, с. 172—173]. На працягу другой чвэрці XIX стагоддзя павялічвалася норма паншчыны і адзначаўся рост колькасці сялян, што яе выконвалі, асабліва шпарка — у Заходняй і Цэнтральнай Беларусі [55, с. 32; 34; 251, с. 117]. Чуткі пра магчымую сялянскую рэформу прыводзілі да таго, што сялян пачыналі пераводзіць у дваровыя ці гвалтам вызваляць без зямлі. Гэта пагаршала іх становішча [55, с. 33]. Шмат цярпела сялянства ад арандароў і «падпанкаў» — дробнамаёмасных памешчыкаў. Асветнікі-публіцысты не маглі не прызнаваць факта пагаршэння ўмоў жыцця прыгонных, але выдаткі сістэмы яны лічылі за лепшае спісваць на «гнюсную адміністрацыю дробных уладальнікаў», або на эканамічныя наступствы вайны 1812 года [177, с. 255; 24, с. 231].

Да фактараў, якія спарадзілі застойныя з’явы ў эканамічным жыцці дарэформеннай Беларусі, можна аднесці непаслядоўнасць імперскай адміністрацыі ва уніфікацыі заканадаўчай базы на землях колішняй Рэчы Паспалітай. На эканамічным становішчы беларускіх гаспадарак адмоўна адбіваліся шляхецкія паўстанні. Развіццё буйной земляробчай прамысловасці стрымліваўся неспрыяльнай кан’юнктурай цэн на сусветным рынку, перадусім на збожжа, неразвітасцю шляхоў зносін [74, с. 9; 24, с. 233].

Традыцыйныя сельскагаспадарчыя тэхналогіі доўга трывалі ў шляхецкіх фальварках. Пераважала трохполле, шматпольны севазварот практыкаваўся толькі ў перадавых гаспадароў. Адчуваўся недахоп угнаенняў. Лепшым было становішча ў буйных гаспадарках: завозілася з-за мяжы пародзістая хатняя жывёла, уводзілася механізацыя сельскагаспадарчай працы, выкарыстоўваліся драўляныя і чыгунныя прускія малатарні, сеялкі, жняяркі [111, с. 84; 116, с. 439]. Адносіны да новаўвядзенняў заставаліся неадназначнымі. Традыцыяналісты адмоўна ставіліся да працоўнай міграцыі. Практыка завозу сялян з велікарускіх губерняў лічылася згубнай, — існавала думка, што рускія сяляне экстэнсіўна эксплуатавалі і спустошвалі мясцовыя прыродныя рэсурсы. Адмоўна характарызавалася і практыка выпраўлення беларускіх сялян на заробак — лічылася, што гэта пазбаўляла мясцовую вясковую гаспадарку працоўнай сілы, падрывала экономіку сялянскіх сем’яў [19, с. 278; 177, с. 259]. Пад гаспадарчыя канцэпцыі традыцыяналісты падводзілі этычныя абгрунтаванні, акцэнт рабіўся не на дасягненне максімальнага прыбытку, а на захаванне традыцыйнага ладу жыцця і сацыяльнай згоды. Шляхі хуткага

абагачэння крытыкаваліся на падставе маралі — у падмурку хуткага абагачэння, паводле пераканання традыцыяналістаў, ляжыць «продаж душы» ці здрада. У асветніцкай публіцыстыцы наадварот падкрэслівалася, што праца на зямлі дзядоўскім спосабам вядзе дробную шляхту да эканамічнага калапсу. Разуменне патрэбы эканамічных пераўтварэнняў прыходзіла праз вывучэнне ідэй заходнееўрапейскіх фізіякратаў [127, с. 146].

Кансерватары і асветнікі з большага сыходзіліся ў крытыцы шляхецкага марнатраўства [213, с. 307]. Асуджаліся спробы дробнай і сярэдняй шляхты пераймаць «гультайскія» звычкі арыстакратыі. Сем’і з сярэднім дабрабытам не маглі дазволіць сабе празмернасці без шкоды для бюджэту — значная частка іх даходу выдаткоўвалася на адукацыю дзяцей, наём слуг і ўтрыманне экіпажу [116, с. 378; 24, с. 235]. Дробныя землеўладальнікі часта не мелі абаротных сродкаў і бралі крэдыт [24, с. 235]. У выніку многія памешчыцкія гаспадаркі былі абцяжараны банкаўскімі даўгамі, павялічваліся нядоімкі падаткаў за сялян, а таксама за рэкруцкія і земскія зборы [24, с. 234]. Пазыкі браліся пад заклад маёнткаў, даўгі памнажаліся і пераходзілі ад бацькоў да дзяцей [180, с. 9].

Аднак заклікі да ашчаднасці часта даводзіліся да абсурду. Шляхце прапаноўвалася жыць амаль натуральнай гаспадаркай, устрымлівацца ад набыцця ў крэдыт, ад пакупкі рэчаў, якія не звязаны з гаспадарчымі патрэбамі. Прапагандаваліся ідэі практыцызму ў арганізацыі побытавага асяроддзя. Вялікі і чысты двор, аточаны прысадамі, наяўнасць фруктовага саду, невялікі, але прасторны дом з прыродных матэрыялаў — без пышных аздобаў, але дагледжаны, светлы і чысты — такі быў ідэал шляхецкага маёнтку ў асветніцкай літаратуры. Прыводзіліся і негатыўныя прыклады дробнашляхецкай «элеганцыі» — жыцця не па сродках, з прэтэнзіяй на раскошу, калі ставала імпэту выбудаваць «умэбляваны» некалькіпавярховы дом, камяніцы службаў, аранжарэй і зімніх садоў, але бракавала сродкаў на іх рамонт і падтрымку ў функцыянальным стане. Такія «палацыкі» ужо праз некалькі гадоў пасля збудавання паўставалі з дзіравымі дахамі і падслепаватымі вокнамі, у якіх замест шкла ўжывалася папера [213, с. 310].

Ідэалам асвечанага вясковага гаспадара для прагрэсіўнай шляхецкай інтэлігенцыі з’яўляўся Д. Манюшка (1788—1848), масон, памешчык Ігуменскага павету. Ён перавёў сваіх прыгонных на чынш, адкрываў школы, дзе сяляне навучаліся фельчарскай прафесіі, агародніцтву, пчалярству, жывёлагадоўлі, разнастайным рамёствам [70, с. 145]. Д. Манюшка стаў прататыпам пана Падстоліча, героя аднайменнага дыдактычнага рамана Э. Масальскага [323]. Шляхецкія асветнікі падкрэслівалі, што добры гаспадар мусіць асабіста ўваходзіць ва ўсе драбніцы вытворчага сельскагаспадарчага працэсу. Задача шляхціца, на іх думку, — разумная арганізацыя працы, якая

давала б не толькі прыбытак пану, але і забяспечвала дабрабыт селяніна. Асветнікі-публіцысты заклікалі шляхту не пустасловіць, абмяркоўваючы вартасці коней, ганчакоў і жанчын у застольных размовах, а займацца пошукам спосабаў паляпшэння эканамічнага становішча краю і павелічэння дабрабыту грамадзян.

Веды, якія здабываліся шляхціцам-земляробам, насілі практычны характар і часта знітоўваліся з комплексам «народных ведаў» — народнай метэаралогіяй, аграноміяй, лекаваннем: «Каб гаспадарыць у маёнтку — мала старання, трэба быць чалавекам дасведчаным, добра ведаць якасць зямлі, дзе што пасеяць; ведаць час, калі сеяць гарох, пшаніцу, ячмень ці авёс, а што найцяжэй — прадбачыць перамену надвор'я, калі прыйдзе час сенакосу» [19, с. 142]. Памешчыкі прызнавалі сялянскую рацыю ў гаспадарчых справах, ведалі і прытрымліваліся народных прыкметаў [140, с. 71]. Калі лекі з гарадской аптэкі не дапамагалі, паны звярталіся да «чараўніка» з народу. Часам у асяроддзі шляхецкай інтэлігенцыі выказваліся думкі, што нават забабоны сялянства заслугоўваюць павагі [19, с. 207].

Акрамя сямейных і народных традыцый крыніцамі гаспадарчых ведаў з'яўляўся вопыт перадавых памешчыцкіх гаспадарак, які актыўна перадаваўся (існавалі звычаі суседскіх агледзінаў пад час сельскагаспадарчых прац, прадстаўнікі дробнага шляхецтва працавалі ў перадавых магнацкіх фальварках і потым выкарыстоўвалі набытыя веды ва ўласных гаспадарках); друкаваліся гаспадарчыя параднікі і календары; буйныя землеўладальнікі наведвалі замежныя гаспадаркі і навучальныя ўстановы з мэтай азнаямлення з прагрэсіўнымі тэхналогіямі; запрашаліся замежныя спецыялісты; агранамічную адукацыю можна было таксама атрымаць і ў краёвых навучальных установах.

Адначасова з развіццём земляробства і жывёлагадоўлі памешчыкі Беларусі засноўвалі перапрацоўчыя вытворчасці: вінакурні, лесапільні, маслабойні, папяровыя і тэкстыльныя фабрыкі, паташныя і цукровыя заводы, смалакурні, сукнавальні, шкіпінарныя промыслы, цагельні, стэарынавыя і свечачна-тлушчавыя вытворчасці. Часта гэта былі дробныя прадпрыемствы, што знаходзіліся па-за горадам у дваранскіх уладаннях. Шкляная, лесахімічная, папяровая і металургічная вытворчасці з'яўляліся традыцыйнымі галінамі для памешчыцкіх гаспадарак. Прадпрыемствы, якія засноўваліся на імпартнай сыравіне, знаходзіліся зазвычай пад кантролем яўрэйскага капіталу [111, с. 94].

Адным з відаў эканамічнай актыўнасці беларускай арыстакратыі з'яўлялася крэдытна-банкаўская дзейнасць. Буйную ашчадную касу трымалі, напрыклад, нясвіжскія Радзівілы [180, с. 28]. Традыцыяналісты засцерагалі шляхту ад засваення чужаземных прыдумак: «Не з фабрык трэба пачынаць

грамадзянам беларускім, каб палепшыць свой быт, а з зямлі, бо сялянская гаспадарка найбольш прыносіць карысці ў нас; трэба руліцца заводзіць жывёлу, угнойваць палеткі, павялічваць сенажаці і падданых сваіх навучыць лепшым маральным канонам, каб любілі сваю бацькаўшчыну. Не крыўдзіць, прысвойваючы іх уласнасць, менш будаваць корчмаў і старацца мець больш збожжа ў запасе» [19, с. 145].

Даходы дбайнаму вясковаму гаспадару давала ўтрыманне ўласных млыноў, корчмаў ці заезных двароў. У Расійскай імперыі захоўвалася прывілея беларускага шляхецтва на вольны выраб і продаж спіртных напояў (прапінацыя). Паравы спосаб вінакурства і выкарыстанне ў тэхналагічным працэсе бульбы прывялі да павелічэння з саракавых гадоў XIX стагоддзя колькасці буйных вінакурняў [38, с. 108]. Амаль у кожным маёнтку меліся піваварні [111, с. 85].

Шляхецтва на працягу разглядаемага перыяду заставалася «вясковым» станам. У гарадах жылі перадусім асабістыя дваране і чыноўнікі, у сваёй большасці выхадцы з велікарускіх губерняў [74, с. 57]. Мясцовыя заможныя памешчыкі пераязджалі ў горад толькі на зімовы перыяд для свецкіх забаў. Часта яны не мелі тут сталага жытла. Для гэтай часткі насельніцтва гарадскія домаўласнікі здавалі вольныя памяшканні ў арэнду, арганізоўвалі пансіёны [324, s. 228].

Стала жыць у горадзе і зарабляць на жыццё пэўнай прафесіяй мусіла беззямельная — «бруковая» — шляхта, якая задавальнялася выпадковымі заробкамі (рэпетытарствам, супрацоўніцтвам з прэсай, пасярэдніцтвам у судах, генеалагічнымі росшукамі). Гэтая частка шляхецтва, блага адаптаваная да расійскіх сацыяльна-палітычных умоў, у становішчы «культурнага шоку», без належнай прафесійнай кваліфікацыі і пратэкцыі, паступова люмпенізавалася [349, s. 33; 307, s 63]. Шляхецкая моладзь, якая накіроўвалася ў рускія універсітэцкія цэнтры для атрымання адукацыі, атрымлівала большыя магчымасці для далейшага прафесійнага росту.

Скарачэнне дапамогі з боку арыстакратыі, асветніцкія высілкі публіцыстаў, традыцыя сямейнага артыстычнага выхавання, рамантычны культ музыкі і паэзіі пакрысе змянялі стаўленне шляхецтва адносна інтэлігенцкіх і артыстычных заняткаў [213, с. 187; 327, s. 218; 237, с. 118—120]. Пэўнае значэнне для развіцця прафесійнай адукацыі ў Беларусі мела дзейнасць Віленскага універсітэту, Горы-Горацкай земляробчай школы (з 1840 года), Полацкай езуіцкай акадэміі [189, с. 108]. Пры гімназіях адкрываліся агранамічныя і каморніцка-таксатарскія класы.

У сістэме адукацыі моцную канкурэнцыю шляхціцам складалі выхадцы з духоўнага саслоўя, з шэрагу якога рэкрутавалася айчынная навукова-

выкладчыцкая эліта (І. Анацэвіч, М. Баброўскі, І. Грыгаровіч, І. Даніловіч, М. Каяловіч, П. Сасноўскі). Падобная кар'ера не здабыла папулярнасці сярод шляхецтва, — яна вымагала вялікіх інтэлектуальных і маральных высілкаў, але давала мізэрны плён у павышэнні сацыяльнага статуса [128, с. 163]. Паводле назіранняў сучаснікаў, дзеці сялянства, мяшчанства і святарства выяўлялі большую зацікаўленасць і лепшыя вынікі ў навучанні, чым маладыя шляхціцы [327, s. 95, 191].

На ніве літаратурнай дзейнасці, якая патрабуе меншай кваліфікацыі, удзел шляхецтва быў больш прыкметным [107, с. 212; 151, с. 256]. Асабліва мізэрным быў шляхецкі ўклад у станаўленне нацыянальнай інтэлігенцыі на ўсходнебеларускіх землях [127, с. 145]. Шляхецтва тут было адносна малалікім. Большую вагу сярод яго складаў праваслаўны элемент, лепш адаптаваны да расійскіх сацыяльна-палітычных умоў [74, с. 43]. Па гэтых прычынах усходнебеларускае дваранства выбірала больш прэстыжную сферу дзейнасці — службу ў органах кіравання, паліцыі і войску Расійскай імперыі [74, с. 38].

Традыцыйным відам прафесійнай дзейнасці мясцовага набілітэту заставалася таксама служэнне Богу. Ніжэйшае святарства рэкрутавалася з дробнашляхецкіх шэрагаў, буйныя іерархі паходзілі зазвычай з арыстакратыі [349, s. 46; 331, s. 366].

Традыцыйнай сферай дзейнасці для дробнашляхецкага элементу з'яўлялася палестра — работа ў судовых органах. Шырокая распаўсюджанасць сярод шляхецтва суцяжніцтва, заблытанасць мясцовай прававой сістэмы рабілі запатрабаванай прафесію юрыста. Буйнымі прыватнымі працадаўцамі для правазнаўцаў з'яўляліся магнацкія канцылярыі, так званыя «масы». Аднак у новых грамадска-палітычных умовах без адпаведнага ведання нормаў расійскага заканадаўства і рускай мовы, без сувязяў і пратэкцыі дробнае беларускае шляхецтва не магло разлічваць на добрую юрыдычную кар'еру.

Прэстыжнай сферай дзейнасці ў асяроддзі мясцовага набілітэту лічылася служба ў органах шляхецкага самакіравання. Што датычыць дзяржаўнай службы, то яна была непапулярнай сярод памешчыкаў-каталікоў. Беззямельная шляхта пры найменшай магчымасці набывала зямлю і пакідала службу. Не зважаючы на рынкавую кан'юнктуру, шляхецтва трымалася за зямельную ўласнасць. Маёнтак з'яўляўся асновай шляхецкага палітычнага ўплыву ў беларускім грамадстве [234, с. 131]. Даючы магчымасць арандаваць свае землі беззямельнай шляхце і аднадворцам, буйное панства забяспечвала тым сабе палітычную падтрымку [74, с. 10]. Праваслаўная шляхта ахвотна служыла ва ўстановах расійскай царскай адміністрацыі і войску [146, с. 468].

Пенсія за колішнюю службу была істотнай падтрымкай нават для памешчыкаў. Для дробнай шляхты служба ў войску, у адрозненні ад цывільнай кар'еры, давала добры шанц набыць правы расійскага двараніна [108, с. 266—267]. Сустракаліся выпадкі, калі прадстаўнікі заходнебеларускай шляхты вербаваліся на вайсковую службу Польскага каралеўства, але там магчымасці кар'ернага росту для прадстаўнікоў дробнага шляхецтва былі меней спрыяльныя [324, s. 266].

Пажаданай для прадстаўнікоў дробнай і сярэдняй шляхты заставалася служба на магнацкім двары. Яна падзялялася на «рэшпектовую», якая не аплачвалася, і аплатную — для «афіцыялістаў». Першая абмяжоўвалася рэпрэзентатыўнай функцыяй. Рэшпектовыя «рэзідэнты» павінны былі прысутнічаць у панскіх пакоях добра апранутымі, суправаджаць пана ў яго выездах. Бедная «дворская» ці «дамовая» шляхта мусіла выказваць разнастайныя асабістыя паслугі пану, удзельнічала ў палітычных авантурах свайго дабрадзея. Службовая шляхта працавала на розных адміністратыўных пасадах у магнацкай гаспадарцы [349, s. 48]. Сярод дваровай шляхты мелася інтэлігенцкая праслойка — юрысты, капеланы, мастакі, музыкі, выхавацелі, настаўнікі [109, с. 270].

Лічылася, што забеспячэннем сям'і мусіць займацца мужчына, аднак кардынальным сродкам паляпшэння эканамічнага становішча з'яўлялася выгодная жаніцьба. Дочкі не наследавалі нерухомую маёмасць, але атрымлівалі чвэрць кошту маёмасці ў пасаг. На практыцы сустракалася перадача нерухомай маёмасці дочкам, калі ў сям'і не было сыноў, ці было двое-трое дзяцей. Муж даваў жанчыне грамадскае становішча, — распаўсюджанай з'явай было тытулаванне жанчыны паводле займаемай пасады мужа. Пасля смерці мужа або скасавання шлюбу шляхцянка, паводле нормаў Статуту ВКЛ 1588 года, захоўвала мужаў тытул, магла карыстацца яго пэўнымі пажыццёвымі ўладаннямі, але гаспадаром дома рабіўся старэйшы сын. Для дзяўчыны шлюб быў галоўным сацыяльным інстытутам. Яна ўступала ў яго ў чатырнаццаць—пятнаццаць год. Паўналеццproperly дзяўчыны дасягалі ў трынаццаць год, хлопцы — у васемнаццаць. Да замужжа жанчына знаходзіліся пад уладай сваёй сям'і. Дзяўчыну маглі пазбавіць пасагу, калі яна выходзіла замуж за чалавека ніжэйшага паходжання [324, s. 219; 260, с. 49]. У старасвецкім ідэале жанчына мусіла выконваць абавязкі жонкі, маці, гаспадыні і апякункі прыгонных [127, с. 149]. Муж меў права ўмешвацца ў кар'еру жонкі і забараняць яе прафесійныя заняткі. Жонка выступала як памочніца мужа, дзейнічала ад яго імя, прасякалася прафесійнымі мужавымі інтарэсамі. Гаспадыня маёнтку арганізоўвала і кантралявала дзейнасць прыслугі. Гардэробная, буфет, кухня, нарыхтоўка, перапрацоўка і захоўванне харчовых прыпасаў, арганізацыя догляду на жывёльным і птушыным двары,

гігіена і здароўе насельнікаў маёнтку — усё гэта знаходзілася пад кантролем пані [140, с. 10—18]. Па-за сямейным дваром найбольш распаўсюджанымі прафесійнымі жаночымі ролямі з’яўляліся: актрыса, гувернантка, акушэрка. Прыкметным быў удзел жанчын у арганізацыі навучальных пансіёнаў.

Такім чынам, на працягу разглядаемага перыяду ў Беларусі працягваўся працэс маёмаснага і культурнага расслаення ў асяроддзі прывілеяванага саслоўя. Галоўнымі крыніцамі ўтварэння буйных багаццяў у мясцовым дваранскім асяроддзі з’яўляліся атрыманне спадчыны, пасагу, даход ад дзяржаўнай службы і падараванні за службу ў магната. Астатнія магчымасці абагачэння — гандаль, гаспадарча-прамысловая дзейнасць — разглядаліся як нешта рызыкоўнае, няпэўнае і авантурнае, у тым жа шэрагу, што і выйгрыш у карты, знаходка кладу або «заняткі чарнакніжжам» [180, с. 9; 19, с. 156].

Саслоўны эгаізм шляхецтва стрымліваў раскрыццё эканамічных магчымасцяў краю. Чалавечы рэсурс марнаваўся на суцяжніцтва, змовы, паляванні і баляванні. Разрыў з традыцыйным шляхецкім асяродкам часта рабіўся стымулам для самарэалізацыі асобы. Прыкладам з’яўляюцца прафесійныя дасягненні прадстаўнікоў беларускай шляхты, якія па розных прычынах апыналіся па-за сферай ідэалагічнага саслоўнага кантролю — там, дзе шляхецкае зямляцтва з-за сваёй маламікасці або неспрыяльных палітычных абставін не магло займець дастатковага ўплыву.

У сельскай гаспадарцы і прамысловасці галоўным рэсурсам шляхецкага гаспадарання заставаліся сродкі пазаэканамічнага прымусу. Дробная шляхта з-за каставых прымхаў не была схільная дамагацца эканамічнага поспеху праз заняткі гандлем ці рамёствамі, спадзеючыся на падтрымку арыстакратыі, на вяртанне былых «залатых» часоў Рэчы Паспалітай, урэшце, на прадстаўленне правоў расійскага дваранства. Ініцыятыўнасць не віталася шляхецкай грамадой, якая пільнавала захаванне «роўнасці», з непрыхільнасцю ставячыся да намераў суседа падняцца ў іерархіі саслоўя. У тых жа палітычных абставінах дзеці ўніяцкіх і праваслаўных свяшчэннікаў дэманстравалі большую матываванасць у дасягненні грамадскага становішча.

Дробнае шляхецтва аб’ектыўна не магло прэтэндаваць на кіруючую ці інавацыйную ролю ў грамадстве, апынуўшыся ў той жа эканамічнай нішы, што і сялянства. У выніку палітыка-прававых наступстваў паўстання 1830—1831 гадоў буйное панства страціла зацікаўленасць у палітычных і вайсковых паслугах засцянкоўцаў. Акрамя таго, удзелам у дадзеным паўстанні дробнае шляхецтва палітычна дыскрэдытавала сябе ў вачах расійскага ўраду. Шляхціц-фермер не мог канкурыраваць з таннай сялянскай працай прыгонніцкіх

гаспадарак. Дробнашляхецкі элемент папаўняў у гарадах шэрагі люмпен-пралетарыяў, а на вёсцы збліжаўся з беларускім сялянствам у формах свайго побыту і спосабах гаспадарання. Працягвала фарміравацца беларуская нацыянальная інтэлігенцыя, якую складалі выхадцы з шляхецкага саслоўя, а таксама з сямей уніяцкага і праваслаўнага святарства.

Гаспадарчыя стратэгіі, якіх прытрымліваліся на працягу разглядаемага перыяду арыстакратыя і сярэдняе шляхецтва, уваходзілі ў супярэчанне з інтарэсамі дробнага шляхецтва.

## 2.2 Знешнія ўплывы ў эвалюцыі матэрыяльнай культуры

Вывучэнне матэрыяльнай культуры дазваляе выяўляць як вітальныя патрэбы грамадства, так і яго мастацкія, этычныя, ідэалагічныя сімпатыі. Даследаванне знешніх уплываў у фарміраванні матэрыяльнай культуры ўказвае, у сваю чаргу, на сацыяльныя і ментальныя зрухі эпохі. У разглядаемы перыяд побытава-рэчавае асяроддзе ў Беларусі паступова губляла свае традыцыйныя рысы, уніфікавалася суладна агульнаеўрапейскім і ўнутрырасійскім тэндэнцыям. Найбольш інтэнсіўна гэты працэс закрануў заможнае дваранства.

У разглядаемы перыяд архітэктура маёнткаў і сядзіб Беларусі фарміравалася пад уплывам класіцызму і рамантызму. У стварэнні мясцовых архітэктурных ансамбляў прымалі ўдзел як айчынныя, так рускія і заходнееўрапейскія архітэктары. Будынкі ў стылі класіцызму ўтрымлівалі элементы антычных ордэраў, якія сумяшчаліся з мясцовымі прыёмамі будаўніцтва. У рамантычнай архітэктуры выкарыстоўваліся формы рэтраспектыўнай готыкі. Магнаты ў стварэнні ўласных рэзідэнцый арыентаваліся на Версаль і Дрэздэн [180, с. 8].

Землеўладальнікі нярэдка фундавалі і размяшчалі ў сваіх маёнтках храмы, як каталіцкія, так уніяцкія і праваслаўныя, з характэрнымі для гэтых канфесій архітэктурна-стылістычнымі асаблівасцямі. У мясцовых парках звычайна суіснавалі элементы рэгулярнага і пейзажнага стыляў, у якіх прасочваліся італьянскія, французскія, англійскія ўплывы. Такім чынам, у сядзібных і сядзібна-паркавых ансамблях дадзенага перыяду ў Беларусі часта спалучаліся архітэктурныя формы некалькіх кірункаў [12, с. 176].

Тыповымі паселішчамі дробнай шляхты Беларусі з’яўляліся ваколіцы, засценкі, фальваркі [133, с. 22—23]. Хата дробнага шляхціца набліжалася да мясцовых узораў жытла заможнага сялянства [299, s. 149]. Ад сялянскага дома такія збудаванні адрозніваліся наяўнасцю коміна, дашчанай падлогі, аконнага шкла. Дробнашляхецкай сядзіба захоўвала традыцыйны тып забудовы (замкнуты ці П-падобны) і планіроўкі дома (хата+сенцы+хата), які складаўся з чатырох—пяці пакояў. Дом падзяляўся сенцамі на гаспадарчую (кухня, камора) і прыватную (спальня, сталовая) паловы, рэпрэзентатыўная — звычайна адсутнічала або складалася з аднаго пакою, які адчыняўся толькі на святы. Распаўсюджаным тыпам дробнашляхецкага жытла з’яўляўся аднапавярховы прастакутны ў плане нешаляваны зруб з чатырохсхільным або вальмавым (чатырохсхільным з трохкутнымі схіламі ў тарцах будынка) дахам (саламяным ці дранкавым) з двухслуповым ці чатырохкалонным порцікам-

ганкам пасярэдзіне і невялікай мансардай над ім [131, с. 170; 126, с. 7]. Дом двараніна сярэдняй заможнасці падзяляўся на парадную і прыватную часткі, налічваў ад сямі да дзесяці пакояў (сталовая, гасцёўня, салон, асобныя пакоі пана, пані і дзяцей), гаспадарчыя памяшканні звычайна выносілася вонкі. Заможная сядзіба ўтрымлівала больш за дзесяць пакояў, мела анфіладную (двухрадную або аднарадную) планіроўку, зрэдку — калідорную. Выкарыстоўваўся і змешаны тып унутранай арганізацыі пакояў. Калі меліся два паверхі, парадная і прыватная паловы як правіла месціліся кожная на сваім узроўні [125, с. 221]. Дом звычайна будаваўся на ўзвышшы, сярод прыгожых краявідаў, у глыбіні маёнтка. Перад жытлом знаходзіўся парадны двор з газонам, клумбай, адным—двума флігелямі, за домам — гаспадарчы (з лямусам, свірнам ці клеццю, стайняй, вазоўняй, лазняй). Гаспадарчыя пабудовы — вяндлярні, вінакурні, кузні, лядоўні, млыны — маглі месціцца ў парку. Двор меў агароджу і браму [241, с. 75—105].

У першай чвэрці XIX стагоддзя адсутнічала дакладнае размежаванне функцый пакояў, якія часта адрозніваліся толькі па колеру сцен і адпаведнай абіўцы мэблі. Сенцы падзялялі дом на рэпрэзентатыўную і гаспадарчую часткі. Выразную функцыянальную прыналежнасць мелі гасцёўня і сталовая, з якой межавалі адзін ці два крэдэнса, невялікія пакоі ці шафы для захоўвання посуду. Звычайна меліся адна-дзве спальні, часам з асобнымі гардэробнымі, альковам. У кабінеце, канцылярыі або бібліятэцы прымаліся афіцыйныя госці. Для слуг адводзіліся асобныя памяшканні.

У другой чвэрці XIX стагоддзя за пакоямі замацоўваецца пэўная функцыя. Разам з новымі ўяўленнямі аб камфорце і свецкіх забавах, што прыходзяць з Захаду, і са зменамі ў становішчы жанчыны з’яўляюцца будуары і салоны. Будуар быў месцам, дзе жанчына адпачывала, прымала блізкіх сяброў, займалася касметычнымі працэдурамі. Актыўная роля адводзілася жанчыне ў салоне, дзе праходзілі ўрачыстасці, прымаліся госці. З пачатку XIX стагоддзя пад уплывам нямецкіх пратэстантаў у Беларусі распаўсюджваецца завядзёнка ўпрыгожваць у салоне калядную ялінку [291]. У заможных дамах меліся таксама вестыбюлі і холы, бальныя залі, більярдныя пакоі, партрэтныя галерэі, хатнія каплічкі, зімовыя сады і аранжарэі, дзе вырошчваліся экзатычныя расліны (магноліі, кіпарысы, мірт, пальмы, цытрусавыя, ананасы). У заможных сем’ях для дзяцей адводзілася некалькі пакояў — спальныя (для розных узростаў і полу асобна) і для навучання.

Асвятляліся сядзібы алейнымі лямпамі і самаробнымі свечкамі з жывёльнага тлушчу і воску. Выкарыстоўваліся бронзавыя, латунныя, срэбныя ці драўляныя з пазалотай жырандолі, насценныя крышталёвыя бра, бронзавыя шматражковыя кандэлябры, фарфоравыя лямпы. Сядзібнае жытло ацяплялася шведскімі ці галандскімі кафлянымі печкамі, камінамі. Іх дэкаратыўнае

афармленне адпавядала пануючым мастацкім стылям. Найчасцей яны мелі прастакутныя формы. Ужывалася пераважна кафля мясцовай вытворчасці, якая зазнала ўплыў саксонскіх, французскіх і галандскіх узораў [131, с. 188]. У рэчышчы эстэтыкі класіцызму выкарыстоўвалася аднатонная кафля з рэльефным дэкорам [203, с. 67]. У аздабленні камінаў ужываўся мармур, граніт, барэльефы, каваныя агароджы [125, с. 171].

Падлога звычайна была дашчаная. У рэпрэзентатыўных пакоях выкарыстоўваўся паркет, дываны турэцкай, персідскай або мясцовай вытворчасці. У гаспадарчых пакоях падлога магла была цаглянаю. Сцены абіваліся шпалерамі (штоф, атлас), дубовымі латамі або ўпрыгожваліся мастацкімі роспісамі, лепкай, габеленамі. На мясцовых мануфактурах над тэхналогіяй і арнаментам тканін для шпалер працавалі майстры з Бельгіі, Галандыі, Нямеччыны, Францыі, Швейцарыі [132, с. 242]. У сюжэтах габеленаў выкарыстоўвалі матывы палотнаў заходнееўрапейскіх майстроў, геральдыкі.

У разглядаемы перыяд у Беларусі ў заможных сядзібах выкарыстоўвалася рознастылёвая мэбля: узоры ў стылі Людовіка XV, Людовіка XVI, ампір, бідэрмеер. Карысталася попытам імпартная мэбля [18, с. 179]. Заможныя сем’і замаўлялі мясцовым мастакам праекты мэблі, інтэр’ераў і дэкарацый для ўрачыстасцяў [127, с. 165]. Але найчасцей мясцовыя ўзоры капіявалі заходнія. Тэндэнцыяй эпохі было імкненне да камфорту. Арганізацыя інтэр’ера бліжэй да сярэдзіны XIX стагоддзя рабілася больш свабоднай, пазбаўлялася сіметрыі. Моднымі сталіся інтэр’еры з гісторыка-этнічным акцэнтам — антычным, турэцкім, маўрытанскім, індыйскім. Вестыбюлі афармляліся часта ў «паляўнічым» стылі з выкарыстаннем мядзведжых і воўчых скураў, мэблі, аздобленай рагамі жывёлін. Часткай інтэр’ера з’яўляліся музычныя інструменты — раяль, піяніна, клавесін. Салоны, гасцёўні аздабляліся вялікімі люстэркамі ў пышных асадах. У дамах дробнай шляхты мэбля заставалася самаробнай, традыцыйных узораў (куфры, лавы, сталы, крэслы), якую фарбавалі ў зялёны і чырвоны колеры. Мяккая мэбля адсутнічала. Падлога ў хаце дробнай шляхты часам пасыпалася сечаным аерам. Падаконнікі аздаблялі вазоны з кветкамі (герань, бальзамін, турэцкі перац) [324, s. 222].

Інтэр’ер заможных сядзіб упрыгожвалі мастацкія калекцыі. У зборах жывапісу пераважалі пейзажы ў італьянскім і галандскім стылях, французскія гравюры, карціны на рэлігійныя і гістарычныя сюжэты, сямейныя партрэты. Падобныя галерэі складаліся як з копій, так і арыгінальных твораў замежных (А. Вато, І. Лампі, П. Рубенс, Рэмбрант) і айчынных (В. Ваньковіч, Я. Дамель, Ф. Смуглевіч, Я. Сухадольскі) аўтараў. Упрыгожвалі панскія сядзібы скульптуры, гадзіннікі, габелены. Начынне сталовых складалі ў заможных

сем’ях калекцыі саксонскага, французскага, італьянскага, кітайскага фарфору, сталовага срэбра. Посуд, іншыя шкляныя мастацка-дэкаратыўныя вырабы былі часта мясцовай вытворчасці, але тэхналогія іх вырабу паходзіла з Галандыі, Германіі, Францыі [131, с. 186; 203, с. 208]. Да элементаў традыцыйнага інтэр’еру можна аднесці калекцыі зброі, партрэтныя — «сармацкія» — галерэі продкаў, вянкі з жыта і палявых кветак у аздабленні сенцаў [56, с. 92]. У хатах дробнай шляхты можна было сустрэць выявы Ісуса Хрыста і Маці Божай, выкананыя алеем, танныя гравюры і партрэты гістарычных дзеячаў, набытыя ў вандроўных гандляроў [327, s. 92].

Пасля няўдалага паўстання 1830—1831 гадоў мясцовае каталіцкае дваранства засяродзілася на прыватным жыцці, узмацніўся геданічны аспект шляхецкай матэрыяльнай культуры. Са зменамі грамадскіх прыярытэтаў адбывалася трансфармацыя побытавага асяроддзя. Панскія двары перарабляліся суладна заходнееўрапейскім крытэрыям камфорту, гігіенічнасці, функцыянальнасці, свецкага этыкету. За ўзоры браліся англійскія катэджы і італьянскія вілы. Бацькоўскія сядзібы звычайна перабудоўваліся маладымі гаспадарамі. Вялікую страту традыцыйнаму выгляду сядзіб наносілі пажары. Многія маёнткі ў выніку канфіскацый пераходзілі да новых уладальнікаў, што таксама не спрыяла захаванню традыцыйных інтэр’ераў [259, с. 89].

Такім чынам, у Беларусі ў разглядаемы перыяд унутраны і вонкавы выгляд жылля прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя фарміраваўся адпаведна эстэтычна-мастацкім патрабаванням агульнаеўрапейскай моды з улікам мясцовых гістарычных, эканамічных і прыродных абставін.

***

Дынаміка міжкультурных сувязяў у Беларусі ў разглядаемы перыяд прасочваецца і ў эвалюцыі касцюму прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя [147, с. 7].

Напачатку XIX стагоддзя ў прывілеяваным грамадстве назіралася тэндэнцыя да эклектыкі ў манеры апранацца. Людзі сталага ўзросту надавалі перавагу або традыцыйнаму шляхецкаму строю, або заходнееўрапейскай модзе другой паловы XVIII стагоддзя. Моладзь прытрымлівалася найноўшых зменаў крою. Строй падкрэсліваў палітычныя погляды, — «сармацкую» вопратку насілі кансерватары, а «нямецкую» — рэфарматары-«касмапаліты» [154, с. 320]. Дэмакратычна настроеныя студэнты Горы-Горацкага земляробчага інстытута выкарыстоўвалі ў штодзённай вопратцы элементы беларускага сялянскага адзення [109, с. 397]. Масавае вяртанне да

традыцыйнай шляхецкай вопраткі адбывалася пад час паўстанняў. Сярод паўстанцаў 1830—1831 гадоў былі папулярнымі чамара, кунтуш і жупан. Інсургенцкі строй дапаўнялі шабля-карабела і ядвабны пас [282, s. 129]. Чамара, кунтуш, жупан выкарыстоўваліся і для дэманстрацыі нацыянальных пачуццяў пад час масавых грамадскіх урачыстасцяў [110, с. 182]. Чамаркі былі папулярным рэквізітам для фотаздымкаў у мясцовай шляхты, якая такім чынам засведчвала свае патрыятычныя перакананні. У сваім асяроддзі прадстаўнікі шляхецкай моладзі, нават паненкі, насілі «канфедэраткі». Жанчыны выяўлялі грамадзянскія пачуцці, апранаючыся ў цёмнае на знак жалобы пасля паражэння шляхецкіх выступаў. Каталіцкія ксяндзы ў знак падтрымкі шляхецкага паўстання 1863—1864 гадоў насілі спецыяльныя чорна-белыя стужкі [108, с. 87].

Па вопратцы можна было вызначыць і занятак — мундзіры насілі не толькі вайскоўцы, але і работнікі канцылярый, настаўнікі гімназій, студэнты [1, с. 100]. Важнай дэталлю строю чыноўніка з’яўляліся ўзнагароды, па якіх, «як па паслужным фармуляры», можна было прачытаць біяграфію чалавека [179, с. 10]. Шляхта мусіла з’яўляцца на сход, дзе абіраліся службовыя асобы органаў дваранскага самакіравання, у мундзірах і пры шпагах, а хто насіў традыцыйнае «польскае адзенне» — пры шаблях [220, с. 8].

Праваднікамі новых тэндэнцый былі часопісы мод [105, с. 59]. Яшчэ адной крыніцай модных уплываў з’яўлялася літаратура. Творчасць Ё. Гётэ, В. Скота, Дж. Байрана падказвала новыя дэталі строю, кшталту блакітных фракаў, жоўтых камізэлек ці шатландскай матэрыі «ў краткі» [282, s. 125]. У мясцовым прывілеяваным грамадстве з’явіўся рамантызаваны тыпаж, аналаг «ангельскага дэндзі», айчынным увасабленнем якога сучаснікі лічылі князя Ф. Сапегу [180, с. 108]. Захапленне тэатрам садзейнічала пранікненню ў штодзённы побыт гульнёвага элементу, матываў гістарычнай і ўсходняй экзотыкі.

Для беларускай прывілеяванай часткі грамадства ўзорам пераймання служылі арыстакратычныя колы Варшавы і Санкт-Пецярбургу, якія ў сваю чаргу арыентаваліся на густы заходнееўрапейскай моды — Парыжа, Дрэздэна, Лондана. Нават у невялікіх правінцыйных беларускіх гарадах паненкі знаходзілі магчымасць замаўляць бальныя сукні, каптуркі, пальчаткі, абутак у Варшаве [256, с. 47]. Прадстаўнікі арыстакратычных сямей значную частку часу бавілі ў сталіцах і курортах Заходняй Еўропы. Сярод гэтай часткі прывілеяванага грамадства засваенне новых павеваў еўрапейскай моды адбывалася найбольш аператыўна.

XIX стагоддзе азначаецца касмапалітызацыяй моды. Хуткае развіццё

прамысловасці, дэмакратызацыя грамадства, дынамічныя змены мастацкіх стыляў спрыялі з’яўленню новых тканінаў, аксесуараў, што абвастрала канкурэнцыю і стымулявала развіццё моды. Многія віды тканіны, фурнітуры завозіліся звонку. Але запатрабаваным на ўнутраным рынку з’яўлялася таксама і айчынныя вырабы: сукно фабрык Патоцкага, Камінскага і Скірмунта, мультан лагойскай фабрыкі Тышкевіча. Мужчынскі і жаночы абутак мінскіх шаўцоў меў попыт як у Беларусі, так і за яе межамі [256, с. 150]. Яшчэ адной прычынай дынамізацыі моды з’явілася павышэнне жаночай канкурэнцыі на шлюбным рынку. Рэдуты — камерцыйныя балі і маскарады — адкрывалі магчымасць жанчынам, што паходзілі з небагатых сямей, звярнуць на сябе ўвагу панства. Павышэнне сацыяльнай мабільнасці рабіла моду інструментам дасягнення поспеху. Павялічвалася роля салонаў у механізме прыняцця палітычных рашэнняў. Салоны сумяшчалі іграваыя формы баўлення часу з грамадска-палітычнымі абмеркаваннямі, і рабілі моду фактарам палітычнага жыцця.

Сацыяльныя зрухі ў грамадствах Заходняй Еўропы, што знаходзілі свой водгук і ў Расійскай імперыі, рабілі непажаданым залішнюю дэманстрацыю багацця ў вопратцы. Адрозненні ў знешнім выглядзе арыстакратыі і сярэдняй шляхты паступова зводзіцца да якасці матэрыялу, з якога зроблена вопратка, ступені майстэрства краўца, густоўнасці аздобы і майстэрства насіць строй. У Расійскай імперыі знешні выгляд, касцюм, нават, форма вусоў і барады служылі візіткай добранадзейнасці і сацыяльнага статусу. Агульным вынікам касмапалітызацыі еўрапейскай моды і намаганняў расійскай дзяржаўнай адміністрацыі па культурнай нівеліроўцы насельніцтва імперыі з’явілася спрашчэнне і ўніфікацыя, якія найбольш прыкметнымі былі ў дачыненні да мужчынскай вопраткі. Вынікам стала страта актуальнасці традыцыйнага культурнага канону. Як прыклад, знішчэнне слуцкіх паясоў, якія суладна модзе пераплаўляліся для штампоўкі срэбнага сталовага посуду [69, с. 86].

Змены элементаў дваранскага касцюма ў разглядаемы перыяд супадаюць з тэндэнцыямі агульнаеўрапейскай моды. Да 1814 году ўплывовай была «антычная» мода («грэцкі», «рымскі» і нават «турэцкі» стылі), што паходзіла з рэвалюцыйнай Францыі. У эпоху Напалеона I яна мадыфікавалася ў стыль «ампір». Сярод мужчын распаўсюдзіліся разнастайныя мундзіры. На змену лёгкім тканінам прыйшлі цяжкія, залатая вышыўка, масіўныя каштоўнасці [79, с. 150—156]. Моду дваццатых гадоў XIX стагоддзя вызначаў рамантызм, з уласцівымі яму сярэднявечнымі і ўсходнімі алюзіямі. У мужчынскі гардэроб увайшоў фрак (чорны ў афіцыйных абставінах і каляровы — штодзённы), сурдут (штодзённая вопратка), камізэлька (найбольш маляўнічая частка строю). Верхняя вопратка складалася з рэдынгота і карыка

(віды паліто). У хатнім ужытку папулярнасць атрымалі шлафрокі. Разнастайнасцю вызначаліся шляпы. Увайшлі ў моду акуляры. Жаночы сілуэт эпохі рамантызму набыў геаметрычныя формы, што вымагала выкарыстання гарсэту. Колеры сукенак пераважалі светлыя, іх упрыгожвалі кветкамі. Распаўсюдзіліся наміткі і баваўняныя тканіны [79, с. 156—164].

У трыццатыя гады ў жаночую моду ўвайшоў капот на кітовым вусе (накідка з атласа на бавоўне), летам — мантылы з тафты, узімку — салопы (футра). Жаночыя капялюшыкі гэтага перыяду ўпрыгожваюцца пер’ем, кветкамі, стужкамі, ужывалася вуаль. З аксесуараў зрабіліся папулярнымі рыдыкюлі, сакі, муфты, парасоны. Мужчынскі сілуэт у модзе трыццатых гадоў паўтараў жаночы, што змушала мужчын карыстацца гарсэтам. Вынаходствам трыццатых гадоў былі курткі, кароткія нагавіцы, купальныя гарнітуры [79, с. 164—170]. На моду саракавых гадоў уплывала творчасць Ч. Дзікенса і Ж. Санд. У жаночы касцюм як праявы эмансіпацыі ўваходзяць дэталі мужчынскай вопраткі. Напрыклад, «амазонка» — строй для верхавой язды. Мужчынскі касцюм ў гэты час набыў выгляд, які амаль без зменаў пратрываў да канца XIX стагоддзя. У мужчынскай вопратцы стаў пераважаць чорны колер. Абавязковым атрыбутам робіцца ляска, распаўсюджваюцца манoклі, пенснэ, ларнеты [79, с. 170—173].

Мода пяцідзесятых гадоў дэмакратызуецца. У жаночай модзе працягваецца тэндэнцыя да запазычвання дэталяў з мужчынскай вопраткі (жакеты «венгеркі» накшталт мужчынскіх фракаў, панталоны пад шырокімі спадніцамі). Распаўсюджваюцца гладкія прычоскі. Вялікай разнастайнасцю вызначаецца верхняя вопратка. У моду ўваходзяць шырокія спадніцы на абручах — крыналіны. Рэгламентуецца выкарыстанне колераў ў вопратцы — дарослыя апранаюцца ў ліловыя, сінія, цёмна-зялёныя, цёмна-чырвоныя строі, моладзь — у белыя, блакітныя, ружовыя. Вопратка арыстакратыі вызначалася сціпласцю колеру і стрыманасцю малюнка [79, с. 173—175].

Іншаземныя ўплывы не ліквідавалі мясцовых асаблівасцяў. Панства бавілася ў еўрапейскіх сталіцах, апраналася па апошняй модзе, але атмасфера іх маёнткаў, заселеных дробнай шляхтай, была закансервавана на ўзор мінулага стагоддзя [234, с. 133]. У маламаёмаснай шляхты было менш функцыянальных відаў строю, у адрозненні ад арыстакратыі, вопратка якой мела размежаванне па гадзінах дня, сезонах і прызначэнню [79, с. 149]. У якасці святочнага касцюма, які апраналі, напрыклад, штотыдня ў касцёл, дробнае шляхецтва выкарыстоўвала рознакаляровае суконнае верхняе адзенне, аздобленае атласам, аксамітам і галунамі (кунтуш, жупан). Сацыяльную прыналежнасць жупана фіксуе прымаўка: «убраўся ў жупан і

гадае, што пан» [239, с. 237]. Абавязковым старашляхецкім аксесуарам з’яўлялася люлька (файка). Ужыванне самакрутных «цыгар», што пачало распаўсюджвацца бліжэй да сярэдзіны стагоддзя, сучаснікі расцэньвалі як прыкмету паўперызацыі шляхты. Істотнымі прычынамі ўстойлівасці густаў дробнай шляхты з’яўляліся беднасць і недастатковая сацыяльная мабільнасць — вясковыя засценкі жылі амаль натуральнай гаспадаркай, тканіна часта выраблялася ў хатніх умовах [256, с. 101].

Новае засвойвалася дробнай шляхтай са спазненнем. Сучаснікі адзначалі ў касцюме дробнай шляхты элементы, якія выйшлі з агульнаеўрапейскай моды, але заставаліся актуальнымі для дадзенага асяроддзя як прадметы франтаўства. Венгеркі, казакіны, фракі з гардэроба правінцыйнай шляхты грашылі супраць моды неадпаведнымі колерамі і празмернай аздобай [256, с. 47]. Падпанкі, найбольш заможная частка дробнага шляхецтва, і асабліва іх жонкі імкнуліся пераймаць вобраз жыцця панства, але ў рэалізацыі найноўшых павеваў выкарыстоўвалі паслугі местачковых краўцоў, танны матэрыял і элементы старой вопраткі.

Для найбольш беднага шляхецтва актуальным было не столькі найноўшыя французскія тэндэнцыі, колькі задача вылучэння з сялянскага асяроддзя. Не маючы для гэтага шырокіх матэрыяльных магчымасцяў, шляхта выкарыстоўвала іншыя спосабы. Сацыяльную інфармацыю мог несці крой вопраткі, якасць матэрыялу і аздобы, афарбоўка, характар упрыгожанняў, манера нашэння строю. Напрыклад, кашулю ў сярэдзіне XIX стагоддзя насілі і сяляне, і шляхта, але апошнія запраўлялі яе ў нагавіцы, у адрозненні ад сялянскай манеры апранаць кашулю [239, с. 234]. Нават у рабочай вопратцы шляхта пільнавалася сацыяльна-рэпрэзентатыўнай функцыі [146, с. 467]. Знакавай часткай шляхецкага ўбрання з’яўляліся боты, што зафіксавалася ў прымаўцы: «бачна пана па халявах». Небагатыя шляхціцы берaглі свае боты і надзявалі іх толькі на святы. У штодзённым побыце дробную шляхту вылучала памяркоўнае стаўленне да ўласнага знешняга выгляду. У хатнім побыце мужчыны не грэбавалі і дзіравымі ботамі [336, s. 200—201]. Штодзённая вопратка вызначалася бясформеннасцю — гэта былі балахоны, дамотканыя капоты [256, с. 57]. Як святочным, так і штодзённым элементам дробнашляхецкага адзення выступаў сурдут. Штодзённай вопраткай былі чорны або шэры суконны кафтан, картуз. Аздобай беларускага шляхціца з’яўляліся вусы. Бароды не адрошчвалі, але галіліся засцянковыя шляхцюкі не штодня [256, с. 79]. Шляхцянкі насілі кофты, спадніцы з паркалю, паліто старажытнага крою, рознакаляровыя кунтушы з пазументамі. Да абеду правілы добрага выхавання раілі жанчынам апранаць практычныя сукні з тканіны, што добра падпадаюць мыццю, каб займацца хатняй гаспадаркай, і

толькі па абедзе рэкамендавалася апранаць лепшыя ўборы для сустрэчы гасцей. Дзіцячая святочная вопратка капіявала дарослыя ўзоры, для яе пашыўкі выкарыстоўвалася часта тканіна ад старых бацькоўскіх касцюмаў. У штодзённай дзіцячай вопратцы прытрымліваліся меркаванняў практычнасці [324, s. 242].

Такім чынам, інтэнсіўнасць засваення замежных модных тэндэнцый залежала ад маёмаснага і сацыяльнага становішча індывіда. Больш адкрытай для пераймання групай з'яўлялася сярэдняя і буйная шляхта.

***

Кулінарыя прывілеяванага саслоўя Беларусі фарміравалася пад уплывам як заходніх (венгерскіх, нямецкіх, польскіх, французскіх), так і ўсходніх (рускіх, татарскіх, яўрэйскіх) традыцый. Захоўваліся і мясцовыя кулінарныя завядзёнкі, што рабіла кухню беларускай шляхты адметнай [324, s. 222]. Рацыён харчавання вагаўся ў залежнасці ад сезона і рэлігійна-абрадавага календара. Асабліва шчодрым перыядам з'яўляўся мясаед — час між Калядамі і Масленіцай. У пост святочны шляхецкі стол уражваў разнастайнасцю страў, гатаваных з выкарыстаннем рыбы, грыбоў, капусты, гароху, рысу, разынак, маку.

У першай траціне XIX стагоддзя на рэцэптуру ўплывала французская мода, а на абсталяванне кухань —англійскія ўзоры [140, с. 14]. Арыстакратычны рацыён вызначаўся шырокім выкарыстаннем імпартных прадуктаў. Модным рабілася вырошчванне цытрусавых і ананасаў. У традыцыі харчавання сярэдняй шляхты ўжываліся агародніна, садавіна, арэхі пераважна мясцовага паходжання. Шляхта ўпадабала тлустыя мясныя стравы, вострыя соусы і прыправы, салодкія прысмакі, шэраг якіх былі запазычаны з Усходу [239, с. 196; 154, с. 350]. У харчаванні дробнай шляхты прысутнічалі тыя ж прадукты, што і ў сялянства. Штодзённай спажывай у сем'ях дробнай шляхты з'яўляўся хлеб, шырока выкарыстоўваліся прадукты збіральніцтва і палявання. Адрозненні з сялянскім рацыёнам палягалі ў якасці і разнастайнасці ежы. Часцей на шляхецкім стале сустракалася марская рыба, мяса птушкі і свойскай жывёлы. Шляхта больш ужывала экспартнай прадукцыі (цукар, соль, кава, вінаградныя віны), наогул, куплёнай ежы (смаргонскія абаранкі, ашмянскія і лідскія крэндзелі і пернікі, ігрушы «сапяжанкі») [33, с. 107; 324, s. 250].

Адбывалася папулярызацыя здабыткаў мясцовай кулінарнай думкі за мяжой. З'явіліся першыя спробы кадыфікацыі айчыннай рэцэптуры [140].

Кулінарыя была часткай міфу аб «залатой эпосе» Рэчы Паспалітай. Сучаснікі наракалі на дэградацыю кулінарнага майстэрства, страту старадаўніх рэцэптаў, змяншэнне асартыменту традыцыйных страў, збядненне жыўнасці лясоў, азёр і рэк [39, с. 98]. У грамадстве пачалі выказвацца меркаванні пра неабходнасць папулярызацыі беларускай народнай кухні і вяртання старадаўніх беларускіх (крывіцкіх) назваў страў [250, с. 230].

На працягу першай паловы XIX стагоддзя пачынала разбурацца традыцыйная натуральная сістэма жыццезабеспячэння шляхецкай гаспадаркі, хоць шляхта і намагалася вырабляць як мага больш шырокі асартымент прадуктаў для ўласнага спажывання, часта насуперак эканамічнай карысці [234, с. 132]. З пашырэннем бульбагадоўлі павялічваецца выраб крухмалу, патакі, гарэлкі, пашырыўся асартымент страў, прыгатаваных з бульбы. Завоз больш перспектыўных парод хатняй жывёлы з Англіі, Галандыі, Швейцарыі стымуляваў на працягу першай паловы XIX стагоддзя развіццё свінагадоўлі, складваліся перадумовы для вытворчасці новай малочнай прадукцыі. У трыццатыя гады XIX стагоддзя з пашырэннем сеткі рускіх установ харчавання распаўсюджвалася руская кулінарная традыцыя. Разам з запазычаннем заходнееўрапейскіх і рускіх кулінарных рэцэптур мясцовая дваранская кулінарная традыцыя зрабілася больш збалансаванай і тэхналагічнай. На працягу разглядаемага перыяду выявілася тэндэнцыя збліжэння шляхецкіх, мяшчанскіх і сялянскіх кулінарных традыцый. Але разнастайнасць стэрэатыпаў спажывання ў асяроддзі айчыннага прывілеяванага грамадства не знікла. Яе вытокамі былі эканамічная і канфесійная неаднастайнасць грамадства [35; 298, s. 315].

Усё вышэйадзначанае ўказвае на значныя змены ў матэрыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд. З уключэннем беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі сярод часткі прадстаўнікоў мясцовага прывілеяванага саслоўя ўзмацніліся празаходнія настроі. У асветніцкіх колах шляхецкай інтэлігенцыі прапагандавалася ідэя прыналежнасці культуры колішняй Рэчы Паспалітай да заходнееўрапейскай цывілізацыі. Разам з ідэямі французскага асветніцтва, пазней — рамантызму сярод прывілеяванай часткі грамадства пачалі распаўсюджвацца новыя ўяўленні аб прыгажосці прыроды, гігіене і камфорце, што паспрыяла трансфармацыі традыцыйнай матэрыяльнай культуры, побытавага асяроддзя і зменам у культурным ландшафце краю.

Традыцыйнымі каналамі знешніх культурных уплываў у Беларусі заставаліся рэлігійныя інстытуты. Папулярызацыя новых культурных узораў адбывалася дзякуючы прэсе, тэатру, арыстакратычным салонам. Замежныя культурныя ўплывы распаўсюджваліся і праз побытавае ўзаемадзеянне з

этнічнымі меншасцямі, дзякуючы міжнацыянальным шлюбам [306, s. 5]. Шмат іншаземцаў выконвалі ў беларускіх дваранскіх сем'ях абавязкі гувернёраў, настаўнікаў. Да іншаэтнічных груп належалі часта прадстаўнікі купецтва, шаўцы, цырульнікі, архітэктары, што выступалі праваднікамі новых тэндэнцый. Пэўная колькасць прадстаўнікоў мясцовага прывілеяванага саслоўя служыла ў напалеонаўскім войску, дзе засвойваліся французскія культурныя стэрэатыпы. Расійская дваранская культура ўдзельнічала ў агульнаеўрапейскім цывілізацыйным узаемаабмене, і здаралася, што рускі культурны ўплыў адбіваўся ў беларускім грамадстве праз пасярэдніцтва заходнееўрапейскай моды.

Такім чынам, важнымі тэндэнцыямі ў развіцці матэрыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд з'яўляліся мадэрнізацыйны і кансерватыўны працэсы. Іх суадносіны ў культурным працэсе вар'іраваліся ў залежнасці ад зменаў у палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сферах грамадскага жыцця. На падставе асаблівасцяў развіцця дадзеных тэндэнцый у азначаны перыяд вылучаюцца тры асноўныя этапы эвалюцыі матэрыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі. На працягу першага перыяду (канец XVIII ст. — 1812 г.) захоўвалася спрыяльная эканамічная кан'юнктура для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, назіраўся рост дабрабыту сярод землеўладальнікаў. Свабодныя і пазыковыя сродкі памешчыкаў шырока выдаткоўваліся на перабудову маёнткаў, на прадметы раскошы і гандлёвыя спекуляцыі. Найбольш глыбокую трансфармацыю адпаведна найноўшым заходнееўрапейскім узорам зазнаў побыт арыстакратыі. Мадэрнізацыйныя ўплывы амаль не закраналі сферу вытворчых тэхналогій. На развіццё матэрыяльнай культуры найбольшае ўздзеянне аказвала заходнееўрапейская мода, пераважна французская.

На другім этапе (1812—1831) назіралася эканамічная рэцэсія пасля вайны 1812 года і кансервацыя экстэнсіўных форм культуры жыццезабеспячэння прывілеяванага саслоўя Беларусі. Адбывалася паступовае разбурэнне традыцыйных канонаў матэрыяльнай культуры прывілеяваных груп краю ў выніку паўперызацыі дробнай шляхты, масавага разарэння сярэдняга шляхецтва і частага пераходу з рук у рукі радавых маёнткаў. Накапленні шляхецтва інвесціраваліся пераважна ў набыццё зямельных уладанняў і адукацыю дзяцей. Праз рамантычную моду на экзотыку атрымала развіццё «сармацкая» арыентальная традыцыя. Дэмакратызавалася індустрыя моды, паступова збліжаліся побытавыя ўзоры матэрыяльнай культуры прывілеяванага і непрывілеяванага саслоўяў.

На трэцім этапе (1831—1864) пасля няўдалага шляхецкага паўстання 1830—1831 гадоў царскі урад пачаў больш рашуча праводзіць палітыку уніфікацыі мясцовай заканадаўчай базы. Палітызацыя грамадскай думкі ў асяроддзі прывілеяванага саслоўя страціла сваю вастрыню. Мясцовыя дваранскія сельскагаспадарчыя і прамысловыя прадпрыемствы пачалі больш шырока ўцягвацца ў агульнарасійскі рынак. Усё гэта спрыяла гаспадарчаму аднаўленню краю і мадэрнізацыі культуры жыццезабеспячэння прывілеяванага грамадства Беларусі. Паскаралася развіццё рыначных адносін і памешчыцкага прадпрыемніцтва. Вялікае значэнне для павышэння эканамічнай і сельскагаспадарчых ведаў, а таксама ўкаранення прагрэсіўных земляробчых тэхналогій паслужыла адкрыццё Горы-Горацкай земляробчай школы (1840—1848). Пашыраліся інвестыцыі ў механізацыю сельскагаспадарчых работ і прамысловасці. Значныя змены адбыліся ў сферы культуры жыццезабеспячэння духавенства ў сувязі з секулярызацыяй духоўнага землеўладання. У сферы побыту мясцовага дваранства выявілася тэндэнцыя кансервацыі традыцыйных формаў матэрыяльнай культуры, «музеефікацыі» жыцця маёнткаў. У архітэктуры і інтэр’еры шляхецкага жытла папулярным становіцца рэтраспектыўны стыль, больш адчувальным робіцца і рускі ўплыў.

Палітыка расійскага ўраду ў дачыненні мясцовых прывілеяваных груп (канфіскацыя маёнткаў удзельнікаў шляхецкіх паўстанняў, разборы шляхты, інвентарная рэформа), пагаршэнне знешнеэканамічнай кан’юнктуры на мясцовую сельскагаспадарчую прадукцыю, павелічэнне канкурэнцыі на мясцовым рынку вымагалі ад землеўладальнікаў інавацыйнай ініцыятывы. Найперш гэтая патрэба ўсведамлялася адукаванымі памешчыкамі, якія мадэрнізавалі ўласныя гаспадаркі, дабіваліся вызвалення прыгонных, рэфармавалі свой і сялянскі побыт адпаведна новым уяўленням аб камфорце і гігіене. Павышаліся патрабаванні да інтэлектуальных кандыцый прадстаўнікоў эліты, іх асабістай ролева-функцыянальнай эфектыўнасці (прафесіяналізму, ініцыятыўнасці, адукаванасці). Аднак недахоп матэрыяльных рэсурсаў для эканамічных пераўтварэнняў сярод пераважнай часткі шляхецтва спрыяў кансервацыі ў краі на працягу разглядаемага перыяду феадальных форм культуры жыццезабеспячэння. Назіралася рэдукцыя кола саслоўных функцыянальных абавязкаў прадстаўнікоў мясцовага набілітэту. Прадстаўнікі мясцовых прывілеяваных груп усё больш замыкаліся ў межах прыватнага таварыскага побыту. Як супрацьвага рускім уплывам прапагандавалася ідэя «еўрапейскасці» шляхецкай традыцыі, што спрыяла распаўсюджванню заходнееўрапейскіх узораў матэрыяльнай культуры. Праваднікамі культурных інавацый у матэрыяльнай культуры Беларусі ў разглядаемы перыяд часта выступалі іншаэтнічныя (нямецкія,

рускія, яўрэйскія) і іншасаслоўныя (купецтва, мяшчанства) групы. У цэлым на працягу разглядаемага перыяду пры наяўнасці пэўных прыкметаў разлажэння феадальна-прыгонніцкага ладу і нараджэння новых капіталістычных адносін у галіне эканомікі, у сферы культуры жыццезабеспячэння прывілеяванага саслоўя Беларусі пераважалі традыцыйныя аграрныя феадальныя формы.

# ГЛАВА 3
# СТРАТЭГІІ КУЛЬТУРНАЙ АДАПТАЦЫІ

## 3.1 Выхаванне і культура паводзін

Шляхецкае выхаванне засноўвалася на сямейна-радавых і саслоўных каштоўнасцях, якія знаходзіліся ў цеснай узаемасувязі. Паняцце роду ў феадальнай традыцыі аб’ядноўвала геральдычную і генеалагічную супольнасці. Невыпадкова сярод шляхты карыстаўся папулярнасцю зварот «браце», было распаўсюджана гербавае братэрства [320, s. 155]. Важнай задачай шляхецкага выхавання з’яўлялася актуалізацыя гістарычнай памяці. Грамадскі прэстыж вымагаў ведання тэрміналогіі і адносін сваяцкасці, арыентацыі ў генеалагічнай гісторыі не толькі сваіх, але і суседскіх сямей. Гісторыя краю набывала сямейную афарбоўку праз веды аб удзеле продкаў у гістарычных падзеях. Істотнае значэнне ў выхаванні моладзі выконвалі «радавыя гнёзды» — «фартуны» — увасабленне «малой радзімы».

Прадстаўнікі дваранства пераважную частку свайго часу бавілі па-за горадам. У планаванні сядзібы выяўлялася жыццёвая філасофія землеўладальнікаў, рэалізавалася іх уяўленне пра бяспеку і свабоду. З’яўляючыся крыніцай сямейных традыцый, сядзіба ўплывала на фарміраванне саслоўна-радавой ідэнтычнасці. Маёнтак выконваў рэпрэзентатыўныя функцыі. Ён існаваў па законах гасціннасці і сведчыў аб грамадскім статусе і дабрабыце гаспадара. Заданні ўслаўлення роду, выхавання маладога пакалення вырашаліся ў межах сядзібы разнастайнымі сродкамі. Збіраліся партрэтныя галерэі продкаў, мемарыялізаваліся месцы пахавання. Усталёўваліся памятныя дошкі з нагоды гістарычных падзеяў, якія звязваліся з дадзенай мясцінай. Франтоны порцікаў і брам шляхецкіх сядзіб запаўняліся гербавымі картушамі ўладальнікаў маёнтку. Патрэбе ўшанавання гісторыі роду слугаваў парк, дзе ўсталёўваліся капліцы-пахавальні, помнікі, абеліскі, камяні з эпітафіямі, сустракаліся памятныя дрэвы. Сямейным гонарам рабіліся заснаваныя родам храмы. Многія сем’і збіралі гістарычныя дакументы, кнігі, прадметы мастацтва. Падобныя маёнткі рабіліся асяродкамі культуры, той школай, дзе маладое пакаленне набывала першыя веды пра край і род.

На працягу разглядаемага перыяду захоўвалася значэнне магнацкіх рэзідэнцый як цэнтраў развіцця і распаўсюджвання высокай культуры. Прадстаўнікі мясцовых магнацкіх родаў, шматэтнічных па свайму складу,

з'яўляліся праваднікамі касмапалітычнай культуры. Магнацкія рэзідэнцыі рабіліся ўзорамі для пераймання ў арганізацыі інтэр'ераў, эстэтызацыі прыродных ландшафтаў, выхоўвалі густ, актуалізавалі мастацкія зацікаўленні, павышалі прэстыж артыстычнай дзейнасці, знаёмілі з найноўшымі сусветнымі тэндэнцыямі ў мастацтве [344, s. 179]. Аднак атмасфера маёнткаў фарміравала не толькі артыстычныя і арыстакратычныя якасці, але і сервілізм. Служба на панскім двары разглядалася прадстаўнікамі дробнага шляхецтва як спосаб свецкай самаадукацыі. Прызнаным выхаваўчым сродкам тут выступаў бізун. Распаўсюджанымі правінамі, за якія дваровую шляхту каралі, з'яўляліся непачцівасць, неахайнасць, лайдацтва, зладзейства, азартныя гульні і злоўжыванне фліртам [262, с. 127].

Практыка шляхецкага выхавання засноўвалася таксама на народнай традыцыі. Асобы з ніжэйшых груп (нянькі, дзядзькі) прымалі ўдзел у выхаванні шляхецкіх дзяцей [39, с. 76]. Узоры вуснай народнай творчасці былі вядомыя шляхце, самі шляхціцы з'яўляліся яе сааўтарамі. Яшчэ ў большай ступені гэта датычыць уніяцкага святарства, якое захоўвала старажытныя мясцовыя традыцыі [159, с. 47—55]. Дзеці дробнай шляхты былі знаёмыя з сельскагаспадарчай працай. З трох гадоў шляхціцу даручалі пасці гусей, з пяці — свіней. Народныя веды, звязаныя з метэаралогіяй і аграноміяй, уваходзілі ў абсяг «хатняга выхавання» небагатага шляхціца. Мадэлі паводзін, уяўленне аб нормах утрымлівалі гавэнды, прымаўкі. Шляхце былі не чужыя народныя абрады і магічныя практыкі [19, с. 168].

Паводле назіранняў Ю. Нямцэвіча, у шляхецкім асяроддзі панапалеонаўскай эпохі павялічылася ў параўнанні з часамі апошніх дзесяцігоддзяў існавання Рэчы Паспалітай разуменне карысці асветы [331, s. 223]. Землеўладальнікі намагаліся даць лепшае выхаванне сваім дзецям. У сем'ях сярэдняй заможнасці на адукацыю выдаткоўвалася значная частка даходаў [116, с. 378]. Заможныя бацькі выпраўлялі сваіх дзяцей за межы краю ўдасканальваць веданне еўрапейскіх моваў і здабываць свецкі лоск. Аднак адносіны дробнага шляхецтва да адукацыі засталіся абыякавымі ў адпаведнасці з «сармацкай» традыцыяй [331, s. 135].

Хатняе навучанне мела фундаментальнае значэнне для сацыялізацыі моладзі. Пачаткі навук шляхецкая моладзь спасцігала дома, дзе з дзецьмі займаліся родныя або запрошаныя настаўнікі. Небагатыя сем'і наймалі настаўнікаў у складчыну [324, s. 225]. У найбяднейшыя сем'і прыходзілі «шпэктары» — вандроўныя самавукі, якія ўвечары вучылі панічоў чытаць, а раніцой маглі працаваць у полі, выконваючы гаспадарчыя сялянскія абавязкі.

Саслоўнае выхаванне прадугледжвала не толькі інтэлектуальнае развіццё, але і сацыяльна-культурнае адасабленне дваранскай моладзі ад непрывілеяваных груп. Гэтая задача патрабавала развіцця валявых якасцяў і рэфлексіўнасці (вядзенне дзённікавых запісаў), навыкаў рацыянальнага планавання часу (прытрымліванне рэжыму дня), фізічнай загартоўкі і дысцыплінаванасці (уменне падпарадкоўвацца і камандаваць), асаблівай пластыкі руху (танцавальныя, коннаспартыўныя, фехтавальныя студыі), умення трымацца на людзях, ведання рытуальнага этыкету, валодання прамоўніцкім майстэрствам і літаратурнымі стылямі, генеалагічнымі ведамі. Чым вышэй быў статус асобы, тым больш рытуалізаваным з’яўляліся яе паводзіны. Для дзяцей арыстакратыі навучанне этыкету зрабілася асновай выхавання і сацыялізацыі. Этыкет успрымаўся як мастацтва жыцця, а яго веданне — перадумовай поспеху ў грамадстве. У большай ступені кіравацца законамі добрага тону патрабавалі ад дзяўчат, ад якіх чакалася прыстойнасць у паводзінах, ветлівасць, досціп, інтэлігентнасць і наяўнасць мастацкіх талентаў [14, с. 37—38].

Мастацкае выхаванне заставалася асноўным элементам дзявочай адукацыі. Ад жанчыны патрабавалася быць «музай паэта» — ад яе чакалася тонкае разуменне і захапленне мастацтвам, але не акта творчасці. Дваранкі мусілі добра танцаваць, спяваць, граць на музычных інструментах. Распаўсюджаным навыкам было маляванне. Бедныя шляхцянкі вучыліся граць на «польскай» (сяміструннай) гітары, паненкі з заможных сем’яў гралі на фартэпіяна, арфе, гуслях. Дзяўчаты-шляхцянкі вучыліся спевам у жаночых кляштарах і пансіёнах. Жанчыны ўдзельнічалі ў хатніх тэатральных імпрэзах, на аматарскім узроўні займаліся кампазіцыяй [181, с. 214—215].

Першапачатковае артыстычнае выхаванне (веданне кампазіцыі, гісторыі музыкі і выяўленчага мастацтва, уменне граць на музычных інструментах, маляваць, танцаваць) шляхецкая моладзь атрымлівала ў хатніх умовах. Хатняе навучанне ў артыстычнай сферы часам прадвызначала прафесійную кар’еру шляхціца. Больш грунтоўныя артыстычныя веды можна было набыць у гімназіях, семінарыях ці універсітэце. Акрамя артыстычнага выхавання, шляхецкая моладзь навучалася ў хатніх умовах мовам. Узмацненне захапленняў заходнееўрапейскай культурай выявілася ў тым, што акрамя традыцыйных польскай, лацінскай і нямецкай моў, пачалі шырока вывучацца французская і англійская; з меркаванняў адміністратыўнай кар’еры актуальным зрабілася вывучэнне рускай мовы [180, с. 8].

Дваранская сям’я не заўсёды з’яўлялася культурна аднародным арганізмам. Распаўсюджанай практыкай заставаліся міжэтнічныя шлюбы.

Беларуска-рускія саюзы санкцыянаваліся вышэйшымі коламі Расійскай дзяржавы як сродак інтэграцыі каталіцкай эліты ў агульнадзяржаўнае жыццё імперыі. У падобных сем'ях на этнічнае самавызначэнне дзяцей у значнай ступені ўплывала маці. З боку мясцовай арыстакратыі такія шлюбы разглядаліся з прагматызмам [39, с. 132].

У арыстакратычных сем'ях маленства дзяцей праходзіла амаль без непасрэднага ўдзелу ў іх даглядзе бацькоў. Аднак гэта не азначала адсутнасці бацькоўскай увагі і кантролю. Бацькі звычайна выпрацоўвалі агульную канцэпцыю выхавання, якая рэалізавалася праз пасярэдніцтва гувернёраў і настаўнікаў. Пані пазбягалі кармлення грудзьмі і наймалі карміліц з прыгонных сялянак, якія кармілі панскіх дзяцей ад нараджэння да года [191, с. 47]. Першынцаў і апошніх дзяцей звычайна песцілі больш [257, с. 97]. У заможных шляхецкіх сем'ях дзеці знаходзіліся ва ўласных пакоях, дзяўчаты і хлопцы асобна. У шляхецкім грамадстве існаваў стэрэатып, адпаведна якому хлопчыкі мусілі расці рыцарамі, а дзяўчаты — гаспадынямі дому, захавальніцамі традыцый роду [260, с. 50]. Паненкі займаліся хатнімі справамі (ручным прадзеннем, вышыўкай), даглядалі за кветкамі. Хлопчыкі-падлеткі мелі большую мабільнасць і магчымасць перасоўвацца па-за межамі бацькоўскай сядзібы, яны самастойна палявалі на лясную птушку і дробную дзічыну, збіралі грыбы [327, s. 6]. У выхаванні хлопчыкаў можна вылучыць умоўна жаночую і мужчынскую стратэгіі. Маці прытрымліваліся свецкага ідэалу. Мужчыны намагаліся загартаваць сваіх дзяцей, спрыялі ранняй палавой «асвеце» панічоў [39, с. 90]. Ад дзяцей вымагалася паслушэнства старэйшым, якое забяспечвалася не толькі маральным, фізічным, але і эканамічным прымусам. На варце бацькоўскага аўтарытэту знаходзіліся юрыдычныя і рэлігійныя інстытуты [261, с. 490].

Можна вылучыць некалькі ўзроставых перыядаў сталення шляхецкай моладзі: ад нараджэння да трох гадоў — ранняе маленства, ад трох да пяці — сярэдняе маленства, ад пяці да сямі — дзяцінства, ад сямі да дванаццаці — падлеткавы ўзрост, ад дванаццаці да семнаццаці — юнацтва, ад семнаццаці да дваццаці — маладосць, ад дваццаці да дваццаці пяці — ранняя дарослась [327, s. 39]. Паводле Статута 1588 года паўналецця дзяўчынкі дасягалі ў трынаццаць, хлопцы — у васемнаццаць гадоў. Але і пасля дасягнення паўналецця дзеці працягвалі знаходзіцца пад уладай сям'і пакуль не ўступалі ў шлюб [270, с. 195].

Стаўленне да фізічных пакаранняў дзяцей у шляхецкім асяроддзі ілюструе наступнае выслоўе: «rószczką Duch Święty dziateczek bić radzi, rószczką bynajmniej zdrowiu nie zawadzi» («Розгаю Дух Святы дзетак біць

радзіць, розга аніяк здароўю не вадзіць») [19, с. 23]. У кляштарных школах цялесныя пакаранні практыкаваліся ў дачыненні вучняў малодшых класаў [351, s. 191]. На магнацкіх дварах фізічныя экзекуцыі прымяняліся і да дарослых, нават — да шляхцянак. Выракі выносіліся панам або ксяндзом. Шляхту секлі бізунамі, знявольвалі ў прыватным парадку без судовага выраку, пераводзілі на хлеб і ваду [174, с. 60]. Выкарыстоўваліся эканамічныя (вылічэнне грошаў на кошт касцёла) і маральныя пакаранні. Шляхецкіх дзяцей ставілі ў кут [324, s. 214]. Часам, запалохвалі, напрыклад, інсцэніравалі «адпраўленне ў рэкруты», пазбаўлялі забаў, накладалі абавязак шматразовага чытання малітваў [324, s. 218]. У езуіцкіх калегіумах на вучняў, якія блага адказвалі на занятках, надзявалі каўпак з аслінымі вушамі.

Добрыя паводзіны стымуляваліся ўзнагародамі, выдатным вучням надаваліся ганаровыя званні, рабіліся паслабленні пры штодзённай праверцы ведаў [19, с. 320]. Сярод настаўнікаў на ўсіх узроўнях адукацыйнай сістэмы сустракалася шмат адданых свайму педагагічнаму пакліканню асобаў, якіх з удзячнасцю згадвалі іх былыя вучні [213, с. 284]. Аднак талерантнасць грамадства да пакарання дзяцей спрыяла з'яўленню ў настаўніцкім асяроддзі асобаў з садысцкімі схільнасцямі. З іншага боку, настаўнікі скардзіліся на цяжкасці адносінаў з няўдзячнымі, разбэшчанымі, пераспелымі, інертнымі вучнямі-шляхціцамі [127, с. 154].

Дзеці дробнай шляхты рана набывалі ў сваіх сем'ях заганныя звычкі. З сямі гадоў ім давалі алкаголь у якасці лекавага сродку («ад глістоў»). Прыкладна ў гэтым жа ўзросце яны самастойна, хоць і хаваючыся, прызвычайваліся да тытуню. Дзеці шляхты выхоўваліся ў пачуцці вышэйшасці і варожасці да сялянства, яўрэяў, расіян, немцаў-лютэран. З пяцігадовага ўзросту панічы прывучаліся выкарыстоўваць бізун супраць сваіх аднагодкаў з іншых сацыяльных і этнічных груп. Шляхціцы-падлеткі мелі цвёрдую антыпатыю да працы, заснаваную на перакананні ў сваім высокім шляхетным прызначэнні. Апошняе не замінала некаторым з іх займацца крадзяжом [327, s. 43].

Школьная адукацыя ў пэўнай ступені выпраўляла хібы дробнашляхецкага сямейнага выхавання. Навучанне ў школе давала шляхецкай моладзі вопыт міжсаслоўнай камунікацыі. У школах, якія ўтрымлівалі каталіцкія ордэны і базыльяне, вучыліся дзеці засцянкоўцаў, паноў, служачых, мяшчан, уніяцкіх святароў [351, s. 195]. У адрозненні ад народных вучылішчаў, заснаваных расійскім урадам, у каталіцкіх і базыльянскіх школах не існавала сумеснага навучання для дзяўчат і хлопцаў. Абмежаванасць кантактаў з супрацьлеглым полам, адарванасць ад сям'і,

прыклады педагагічнага садызму, пражыванне ў канвіктах, дзе вучні не мелі асабістай прасторы — усё гэта спрыяла, з аднаго боку, выяўленню жорсткасці ў міжасабовых адносінах школьнікаў, з іншага боку, — з’яўленню прыкладаў сентыментальнага рамантычнага сяброўства [350]. Сяброўскія сувязі, якія завязваліся пад час навучання, захоўваліся на ўсё жыццё. Падобныя кантакты вызначалі далейшую кар’еру маладых людзей. Сэнс школьнага навучання для дзяцей дробнай шляхты часта зводзіўся да ўсталявання неабходных сацыяльных сувязяў [349, s. 46]. Пэўныя таварыствы наўпрост ставілі сваёй мэтай прасоўваць уласных сяброў на лепшыя вакансіі пасля сканчэння навучання, як гэта меркавалася рабіць, напрыклад, у філаматаў [329, s. 22].

Праграма навучання ў каталіцкіх і базыльянскіх школах насіла схаластычны характар, надаючы шляхціцам больш «полеру», чым практычных ведаў. Лічылася, што калі навука не вядзе да Бога, яна згубная для душы. Каталіцкія школы актыўна спрыялі паланізацыі краю, на ўроках гісторыі і літаратуры ідэалізавалася і міфілагізавалася мінуўшчына колішняй Рэчы Паспалітай, часам адбываліся падбухторванні вучняў да стварэння таемных арганізацый [127, с. 156]. Знешне больш карэктная атмасфера панавала ў адукацыйных установах езуіцкага ордэну, які прытрымліваўся палітыкі касмапалітызму. Найбольш актыўна ў сферы адукацыі выявілі сябе езуіты, піяры, дамінікане, бернардынцы, кармеліты, марыявіткі і базыльянскі ордэн [127, с. 136]. Пасля паражэння паўстання 1830—1831 гадоў на працягу 1831—1834 гадоў манаскія школы былі пераўтвораны ў свецкія павятовыя вучылішчы ці зачынены [202, с. 510]. Пачалі распаўсюджвацца падпольныя хатнія школкі, дзе навучанне праводзілася на польскай мове, як правіла, у антыўрадавым духу.

Добрыя вынікі прынесла развіццё свецкай адукацыйнай сістэмы. Выдатную падрыхтоўку давалі Мінская і Віцебская гімназіі. У іх мурах атрымалі адукацыю шэраг выдатных дзеячаў культуры, навукі і грамадскага руху Беларусі [108, с. 126]. Станоўчай рысай эпохі стала развіццё жаночай адукацыі, з’яўленне прэцэдэнтаў сумеснай адукацыі хлопцаў і дзяўчат [127, с. 146].

У справе выхавання маладога пакалення свецкія і рэлігійныя інстытуты выступалі салідарна. Напрыклад, у Віленскім універсітэце дэканы факультэтаў штомесяц патрабавалі ад студэнтаў дакументальнае пасведчанне аб споведзі, праўджанае свяшчэннікам [315, s. 34]. Рэлігія мацавала сямейныя і міжсаслоўныя сувязі. У патрыярхальных дамах з агульнай малітвы дамачадцаў і слуг пачынаўся дзень [68, с. 150]. Паводле дасціпных назіранняў бытапісальнікаў шляхецкага побыту, першымі словамі немаўлят у шляхецкіх

сем’ях былі радкі з малітвы [174, с. 3]. Асаблівы ўплыў на маральнае развіццё моладзі аказвала першыя прычасце і споведзь. Лічылася карысным для грамадскай маралі, каб святар ведаў сямейныя справы прыхаджан. Персанальныя маральныя заганы апошніх выкрываліся перад усёй касцельнай грамадой. Такім чынам арганізоўваўся грамадскі ціск на асобных людзей. Напрыклад, абвяшчалася, што нечыя амаральныя ўчынкі сталі прычынай граду ці пажараў [174, с. 61]. Пад час паўстання 1830—1831 гадоў многія каталіцкія ксяндзы не захоўвалі нейтралітэту [56, с. 111]. У сваю чаргу, святары праваслаўнай царквы выкарыстоўваліся расійскім урадам для вядзення тлумачальнай работы сярод прыхаджан [60, с. 393].

Побач з традыцыйнымі рэлігійнымі інстытутамі значную ролю ў грамадскім жыцці адыгрывалі масонскія ложы. Масоны праводзілі дабрачынную дзейнасць, мулярскія ложы выступалі як мецэнаты для мясцовых мастакоў і студэнтаў, садзейнічалі развіццю тэатральнай культуры ў краі, разглядаючы тэатр як сродак выхавання і прапаганды, ініцыявалі з’яўленне маладзёжных арганізацый. У 1822 годзе масонскія ложы былі забароненыя [127, с. 166].

Тэатр выкарыстоўваўся рознымі грамадскімі сіламі ў мэтах трансляцыі палітычных або рэлігійных ідэй. Пытанням выхавання публікі падпарадкоўвалася праца драматургаў-асветнікаў. Падбор рэпертуару на палітычную злабу дня гарантаваў тэатру аншлаг. Выбар мовы тэатральнай дзеі таксама меў выхаваўчы аспект. Урэшце, атмасфера тэатральных ложаў, дзе збіралася грамадская эліта, уплывала на фарміраванне густаў і распаўсюджванне новых модных тэндэнцый. Усё большае значэнне ў дваранскім выхаванні і сацыялізацыі на працягу разглядаемага перыяду набывала прэса. Важнымі інстытутамі сацыялізацыі дваранства з’яўлялася войска і палестра. Прадстаўнікі дробнага шляхецтва, часта непісьменныя, ведалі лацінамоўную судовую тэрміналогію і заканадаўчыя нормы Статута ВКЛ. Пэўную выхаваўчую ролю адыгравала традыцыя палявання. Рытуальная дзея, якая суправаджала ловы, паляўнічыя паказкі-гавэнды, апавядаючыя пра «залатыя часы» Рэчы Паспалітай, самі паляўнічыя касцюмы, вытрыманыя ў «сармацкім» стылі, спрыялі патрыятычнаму выхаванню. Ловы маглі выконваць таксама трэніровачную функцыю напярэдадні шляхецкіх паўстанняў.

Такім чынам, на працягу разглядаемага перыяду сфера выхавання разам з распаўсюджваннем асветніцкіх тэндэнцый і станаўленнем нацыянальна-вызваленчага руху пачала ўсведамляцца як важны грамадскі інстытут.

Шляхецтва пачало разглядаць адукацыю як магчымасць павышэння свайго сацыяльнага статусу.

***

Тэрмін «этыкет» можна вызначыць як сукупнасць правіл паводзін, якія рэгулююць знешнія праявы чалавечых адносін. Этыкетныя паводзіны выяўляюць структуру грамадства — палавыя, узроставыя, канфесійныя, маёмасныя адрозненні, і адначасова самі фарміруюць структуру чалавечых узаемадачыненняў, акрэсліваюць сацыяльную дыстанцыю і спрыяюць усталяванню іерархіі. Этыкет мае выразна азначаны сітуацыйны характар. Набор сітуацый абмежаваны — гэта сустрэча, развітанне, прыём гасцей, святочная бяседа. Этыкетныя паводзіны выяўляюцца праз жэстыкуляцыю і традыцыйныя вербальныя формулы.

Сістэма маральных установак, што вызначае характар камунікацыі, у прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя Беларусі грунтавалася на агульначалавечых каштоўнасцях: шанаванне старэйшых, бацькоў, жанчын, гасціннасць, паняцце гонару і годнасці, талерантнасць, але саслоўныя, этнакультурныя, канфесійныя асаблівасці стваралі пэўную спецыфіку этыкетных дачыненняў у шляхецкім асяроддзі. Культура паводзін прадстаўнікоў мясцовага прывілеяванага саслоўя мела ў аснове барочны «сармацкі» ідэал, які на працягу разглядаемага перыяду зазнаў значныя трансфармацыі, звязаныя як з уплывам ідэй Асветніцтва і заходнееўрапейскіх, пераважна французскіх, узораў паводзін, так і з неабходнасцю прыстасавання да расійскіх палітыка-культурных рэалій. З паглыбленнем працэсу дэкласацыі дробнага шляхецтва, станаўленнем інтэлігенцыі стаў адчувальным уплыў разначынных, перад усім, мяшчанскіх узораў паводзін.

Паводзіны шляхціца вызначаліся абставінамі часу і месца. Змены паводзін вымагалі святочныя і будзённыя дні, абавязкі гаспадара або госця, знаходжанне ў маёнтку, касцёле ці карчме. Істотным фактарам беларускага шляхецкага этыкету з’яўлялася гасціннасць, якая вылучалася сваёй пышнасцю нават на фоне хлебасольных звычаяў славянскіх народаў. Для суседскіх наведванняў не патрабавалася важкай нагоды. У нядзелю ў госці выпраўляліся зранку. У астатнія дні — звычайна пасля абеду. Ухіленне ад супольных таварыскіх сустрэч выклікала асуджэнне. Адмова ад падарункаў і пачастунку рабілася падставай для канфлікту. Нават незнаёмы чалавек, прадстаўнік прывілеяванага саслоўя, мог завітаць у дом шляхціца без папярэджання і разлічваць на зычлівасць гаспадароў не толькі ў дачыненні сябе, але і сваіх слуг і коней. Гасцявалі па некалькі дзён, але звычайна не болей за тры.

Гаспадары пакідалі штодзённыя заняткі і ахвяравалі свой час баўленню госця. Прыём складаўся з пачастунку, дэманстрацыі гаспадаркі, размовы, партыі ў карты, танцаў, падарункаў. Падарыць маглі ўсё, што пахваліць госць — зброю, коней, сабак, упрыгожванні, сталовы посуд, мэблю [119, с. 18].

Гасцявы рытуал прадугледжваў сустрэчу госця на парозе. Калі пра візіт было вядома загадзя, гаспадар здаралася выязджаў насустрач да мяжы сваіх уладанняў. Бомканне званочкаў на конскай збруі, чутнае здалёк, з'яўлялася сігналам да падрыхтоўкі сустрэчы госця, нават і незапрошанага. Прыём адбываўся ў гасцёўні. Там госць пасля настойлівых запрашэнняў распяразваўся і здымаў зброю. Абодва бакі абменьваліся кампліментамі. Пасля надыходзіў час алкагольнага пачастунку. За здароўе пілі з аднаго келіха. Спажыванне алкаголю праходзіла з пацалункамі і тостамі. Жанчын у асобным пакоі забаўляла гаспадыня. Важнай часткай рытуалу гасцявання з'яўлялася гутарка, тэму якой складалі сямейныя навіны, палітыка, пытанні вясковай гаспадаркі, кошты, мода, гістарычныя рэмінісцэнцыі, паляўнічыя показкі. Шляхецкая гутарка вызначалася напалам і шырынёй тэматыкі, што супярэчыла рэкамендацыям еўрапейскага свецкага кодэксу [327, s. 38].

Шляхецкая гасціннасць з'яўлялася дэманстрацыяй асабістага багацця і пышнасці роду. Шляхціц-«сармат» дамагаўся, каб яму зайздросцілі і здзіўляліся яго багаццю. Гарэлка выступала абавязковым элементам шляхецкай гасціннасці. Яна «у гарачае лета халодзіць, а ў зімовыя маразы — грэе» [19, с. 148]. Алкаголю надавалася пазітыўнае значэнне, прыпісваліся лекавыя ўласцівасці. Цвярозы вобраз жыцця не ўхваляўся. Лічылася, што прыхільнікі цвярозасці вызначаюцца скрытнасцю, крывадушнасцю, нетаварыскасцю. Тытунекурэнне з'яўлялася маркерам сталага ўзросту і атрыбутам мужнасці.

Праяўленнем культу гасціннасці можна лічыць існаванне інстытуту рэзідэнтаў — нахлебнікаў высакароднага паходжання, якія жылі ў маёнтку на забеспячэнні гаспадара гадамі. Часам і дзеці рэзідэнтаў вучыліся ва ўніверсітэтах за кошт пана-дабрадзея [234, с. 132]. Для буйных паноў шматлікая кліентура з'яўлялася своеасаблівым палітычным рэсурсам. Для паноў сярэдняй рукі наяўнасць рэзідэнтаў была справай прэстыжу, а таксама крыніцай адносна кваліфікаванага персаналу. Філантрапічная дзейнасць з'яўлялася адным з атрыбутаў панскага ладу жыцця, указвала на высокі сацыяльны статус дабрадзея [127, с. 145].

Гасціннасць беларускай шляхты вынікала з самога характару шляхецкай культуры ў Беларусі. Шляхта з'яўлялася меншасцю, расцярушанай па маёнтках і засценках у шматмоўным і шматканфесійным грамадстве. Неразвітасць сродкаў масавай інфармацыі, адсутнасць сталага саслоўнага форуму вымагалі іншых формаў мацавання саслоўнай салідарнасці. У

падобнай сітуацыі сваяцкія і суседскія абавязкі, звычай гасціннасці дазвалялі падтрымліваць высокі ўзровень камунікацыі. Адмоўным бокам падобнай стратэгіі з’яўляліся празмерныя выдаткі на падтрымку прыязных адносін. Паводзіны індывіда ў дваранскім асяроддзі карэкціраваліся ўяўленнем пра радавую годнасць.

Пачынаючы з сямейных адносінаў шляхціц быў уключаны ў сістэму іерархічных адносін. Іерархію падкрэслівала практыка сацыяльнага рытуалу, што вызначала парадак вітання, прадстаўлення, цалавання, шэсця, месца за сталом. У сям’і малодшыя мусілі падпарадкоўвацца старэйшым, браты апекаваліся сёстрамі. Павага да старэйшых, у асобе якіх ушаноўваўся культ роду, традыцыі, мела рытуалізаваныя формы. Напрыклад, у таварыстве дарослых моладзь не садзілася ў фатэлі ці на канапу, а толькі на крэслы. Захоўвалася завядзёнка падаць у ногі бацькам, наогул, старэйшым пры сустрэчы пасля доўгай адсутнасці. Крытэрыям стратыфікацыі былі ўзрост, заможнасць, радавітасць, сувязі, пасада [321, s. 322].

Другім бокам іерархічнасці шляхецкага грамадства з’яўляецца спаборнасць — канкурэнцыя, што выяўлялася ў вызначэнні лепшага — на паляванні, у бойках, гулянках. Адсюль пагарда да ашчаднасці. Дыхтоўная вопратка, зброя, конская і сабачая збруя, бяседны стол рэпрэзентавалі не столькі багацце, колькі веліч і старажытнасць роду. Цаніліся рэчы «з гісторыяй». Сярод асоб аднолькавага статусу прадметам спаборніцтва магла з’яўляцца нават ветлівасць. Пры знаёмстве шляхціц называў не толькі сваё імя і прозвішча, але і «гонар» ці «тытул». Заходнееўрапейскую ганаровую тытулатуру тутэйшай шляхце замянялі назовы шляхецкіх урадаў у колішнім ВКЛ — «кашталян», «возны», «харужы», «ротмістр», «лоўчы». Нават непісьменны шляхціц умеў падпісвацца сваім «тытулам». «Тытулы» пераходзілі на дзяцей і унукаў, якія самавольна называліся «харужычамі», «лоўчыцамі», часам самавольна павышаючы пасады, што займалі калісьці іх продкі [327, s. 15].

Тэзіс аб шляхецкай роўнасці звычайна не аспрэчваўся, аднак існаванне паблажлівых моўных форм, такіх як «шляхетка» ці «шляхтун», сведчыла пра неаднолькавую вагу шляхецкага статуса. В.С. Макарэвіч вылучае наступны шэраг тэрмінаў, якія мелі выразна зневажальны характар, — шляхта босая, капатовая, сярмяжная, лыкавая, убогая, хадачковая, шарачковая (шарачкі, шаракі), паночкі, паўпаночкі, «ашмянскі» шляхціц [145, с. 3]. Зварот «брат» ці «сястра» былі магчымымі толькі да асоб, якія стаялі ніжэй у шляхецкай іерархіі. Да тытулаваных персонаў звярталіся больш фармалізавана, напрыклад, «вяльможны пан» [73, с. 366]. Сам тэрмін «шляхта» у першай палове XIX стагоддзя набыў канатацыі ніжэйшасці ў дачыненні паняцця «дваранін». Паны

аддавалі перавагу такім азначэнням свайго статусу як «земянін» або «дваранін».

Сервільнае становішча дробнай шляхты выяўлялася ў гіпертрафіраваных жэстах адданасці. Перад вышэйшымі шляхта выяўляла «пашаноту, лісливасць, паслужлівасць і запабяганні» [146, с. 467]. Паклоны да зямлі, паданне ў ногі, цалаванне рук, грудзей, каленяў дабрадзея, слёзы, пышныя сентыментальныя прысяганні — складнікі падобных цырымоній [51, с. 86]. Пантаміме прыніжэння адпавядалі з другога боку патэрналісцкія жэсты, напрыклад, блаславенне. Эмоцыі акцэнтаваліся тэатральным рытуалізаваным жэстам. Сустракаліся акты публічнага самакатавання [51, с. 86]. Можна меркаваць, барочная экспрэсія сацыяльнага жэста падтрымлівалася рэлігійнай традыцыяй. З «сармацкай» экспрэсіяй добра спалучаўся рамантычны жэст, — сентыментальнымі прызнаннямі поўняцца мемуары і перапіска філаматаў.

У жыцці шляхціца выразна прасочваецца элемент гульні, тэатральнасці. Канфлікты шляхта схільная была развязваць сілай, але гэтыя збройныя сутычкі выглядалі як рытуальнае тэатралізаванае відовішча. За ўзор паводзін браліся старажытныя постаці, часта літаратурныя, рыцарскія ўчынкі ранейшых часоў. Шляхціц увесь час адчуваў сябе нібыта пад пагрозай выкрыцця законнасці сваіх шляхетных прэтэнзій. Адсюль спрэчкі пра гербы, радаводы, праўдзівыя спосабы палявання, гатавання страў.

Разуменне рыцарскага ўчынку ў шляхецкім асяроддзі заставалася барочным. Цанілася зухаватасць, якая магла выяўляцца ў самых разнастайных сітуацыях, але перадусім — за бяседным сталом. Напрыклад, бутэлькі шампанскага адкрываліся адбіваннем рыльца бутэлькі аб стол [62, с. 99]. Карчма займала асаблівае месца ў культуры шляхецтва. Існавалі асобныя рытуальныя цырымоніі, звязаныя з спецыфічнай роляй карчмы як своеасаблівага сінтэзу клуба і біржы. Напрыклад, пасля заключэння здзелкі на кірмашы купцу і гаспадару тавару належала піць барыш — «замочваць» торг у карчме [213, с. 205]. Барочны тып паводзін, які трывала захоўваўся ў асяроддзі правінцыйнай шляхты і дробнага чыноўніцтва, вымагаў экспрэсіі, тэатральнасці і спантаннасці. Такі спосаб самапрэзентацыі можна патлумачыць патрэбай дробнага шляхецтва сцвярджаць свой сацыяльны статус ва ўмовах страты эканамічнай і палітычнай вагі ў грамадстве. Носьбіты «сармацкага» этасу востра адчувалі неабходнасць у падмацаванні свайго статусу. Адсюль высокая ступень дэманстратыўнасці і акцэнтавання прыкмет сваёй саслоўнай прыналежнасці, гіпертрафіраваны «тэатр гонару». Гонар у выніку падмяняўся ганарлівасцю і фанабэрыяй. Дробны шляхціц у грамадскіх месцах, такіх як карчма, патрабаваў пашаны да сябе з дапамогай сілы [146, с.

467]. Працэс дэградацыі заходнееўрапейскіх элементаў рыцарскага этасу, паводле высноў І.Р. Вугліка, разгортваўся ўжо на працягу XVIII стагоддзя — пад час існавання Рэчы Паспалітай [51, с. 85].

Традыцыйна стрыжнем культуры паводзін прывілеяванага грамадства з'яўлялася паняцце асабістай годнасці [173, с. 175]. Кодэкс гонару мусіў акрэсліваць вядучую маральную ролю прывілеяваных груп у грамадстве і абмяжоўваць магчымасці іншых супольнасцяў да прасоўвання ў сацыяльнай іерархіі. Уяўленні аб гонары, блізкія да агульнаеўрапейскіх, пачалі распаўсюджвацца ў шляхецкім асяроддзі даволі позна. На думку А. Брукнера, гэта адбывалася ў апошнія гады існавання Рэчы Паспалітай, дзякуючы дзейнасці кадэцкай школы і ўстаноў асветы, рэфарміраваных Адукацыйнай камісіяй [287, s. 178].

Пасля далучэння зямель Рэчы Паспалітай да Расійскай імперыі, кіруючыя колы якой былі дастаткова вестэрнізаванымі, агульнаеўрапейскія арыстакратычныя этыкетныя нормы пачалі ўспрымацца кансерватыўнымі коламі шляхецтва як каспамалітычны асімілятыўны пачатак. Адсюль эксцэсы дэманстрацыі «сармацкіх» узораў паводзін.

Гарантыяй асабістай годнасці арыстакрата ў еўрапейскай традыцыі з'яўлялася яго гатоўнасць абараняць свой гонар са зброяй у руках. Так, у асяроддзі русінскай знаці традыцыя «выкліку на поле» (судовага паядынку) была вядома яшчэ ў эпоху ранняга Сярэднявечча [91, с. 77]. Умацаванне абсалютызму ў еўрапейскіх дзяржавах прывяло да юрыдычнай рэгламентацыі пытанняў абароны асабістай годнасці і барацьбы з самасудам. Дзеянне ў выпадку злачынства супраць асабістай годнасці ў Расійскай імперыі юрыдычна пачало рэгламентавацца ў часы Пятра І. У Рэчы Паспалітай класічная форма дуэлі была распаўсюджана толькі ў арыстакратычным вайсковым асяроддзі. Для дробнай шляхты дуэль не магла быць дзейсным сродкам абароны асабістай годнасці. Больш заможнае панства адмаўляла ніжэйшым прадстаўнікам саслоўя ў здавальненні на полі бою.

Сваю годнасць дробны шляхціц мог бараніць праз суд, што і было шырока распаўсюджана ў грамадстве колішняй Рэчы Паспалітай. Але рашэнні судоў мусілі прыводзіць у дзеянне самі пацярпелыя. Адсюль распаўсюджанасць такой завядзёнкі як наезд [39, с. 81]. Такім чынам, абарона асабістага гонару ва ўмовах колішняй Рэчы Паспалітай рабілася справай роду, клану, суседства. Толькі салідарны адпор, падтрымка групы родных, сяброў, суседзяў, а яшчэ лепей — магната, забяспечвала шляхціцу пэўныя гарантыі абароны асабістай годнасці.

Ваяўнічыя традыцыі шляхты, напрыклад, завядзёнка боек на шаблях, ставілі за мэту не столькі абарону асабістай годнасці, колькі знявагу праціўніка. У шляхецкім асяроддзі лічылася, напрыклад, ганаровым адцяць вушы ці кончык носу праціўніка. У такіх бойках не прытрымліваліся класічных еўрапейскіх дуэльных правілаў. Пад класічным двубоем разумеецца паядынак, які адпавядае наступным прыкметам: 1) мэтай двубою з'яўляецца задавальненне зняважанай годнасці; 2) удзельнікаў двубою толькі двое; 3) сродак двубою — смяротная зброя; 4) пры паядынку строга прытрымліваюцца спецыяльных правіл адносна месца, часу, зброі і агульных умоў правядзення бою [229, с. 87].

Для шляхецкага разумення годнасці быў уласцівы моцны саслоўны ці карпаратыўны кампанент. Карпаратывізм, традыцыя калектыўнага адстойвання гонару групы, выяўляецца ў такіх завядзёнках як «бітва ў пальцаты», аналагу ўсходнеславянскіх «пацешных баёў на паліцах», што практыкавалася сярод вучняў каталіцкіх школ, ці пагромах яўрэйскага і пратэстантскага насельніцтва вучнямі езуіцкіх калегіумаў [303, s. 1—3].

Двубой у класічных формах пачаў распаўсюджвацца на землях колішняй Рэчы Паспалітай досыць позна, калі прадстаўнікі тутэйшай шляхты разам са службай у расійскім войску і ў напалеонаўскіх шэрагах прызвычаіліся да агульнаеўрапейскага вайсковага кодэксу гонару. Разыходжанне «шляхетнага» стылю паводзін з класічным еўрапейскім арыстакратычным этасам было ўласціва не толькі для мірных, але і ваенных часоў. Так, адзначаецца нізкая ступень дысцыпліны, схільнасць да марадзёрства, неапраўданая жорсткасць да іншаверцаў у шляхецкіх рэгулярных і паўстанцкіх фарміраваннях [327, s. 89].

Такім чынам, можна гаварыць аб захаванні ў разглядаемы перыяд феадальных інстытутаў радавой і саслоўнай годнасці, і адначасова — аб неразвітасці ў шырокіх колах шляхецтва прымата годнасці асабістай.

Завядзёнка цялесных пакаранняў была звыклай справай у дачыненні тых прадстаўнікоў сярэдняга і дробнага шляхецтва, якія служылі на панскіх дварах на землях былой Рэчы Паспалітай. За найменшую правіну шляхціца лупцавалі бізунамі, але не інакш як на дыване ці падушцы і са зваротам да яго на «вы» [39, с. 60; 349, s. 57]. У Расійскай імперыі дваране былі вызваленыя ад цялесных пакаранняў (за выключэннем часоў кіравання Паўла I) [271, с. 559; 194, с. V]. Аднак выпадкі самасуду з лупцоўкай у шляхецкім асяроддзі сустракаліся і ў разглядаемы перыяд. У традыцыях шляхты прымяненне дадзенай экзекуцыі дапускалася нават у дачыненні да шляхцянак [127, с. 175]. Годнасці літоўскага шляхціца не замінала таксама служба ў магната на абслугоўваючых пасадах.

Важным элементам культуры паводзін з’яўляюцца адносіны паміж паламі. У залежнасці ад таго, на якой прыступцы сацыяльнай лесвіцы знаходзілася жанчына, міжпалавыя адносіны набывалі форму або спорту, або кахання, або служэння. Ідэал жанчыны ў шляхецкай культуры насіў містычны характар. Рыцар-шляхціц лічыўся абаронцам Дзевы Марыі, якую называлі часам каралевай шляхты [73, с. 18]. Шляхецкая галантнасць вызначалася тэатралізаваным жэстам [297, s. 15; 324, s. 215]. Галантныя адносіны распаўсюджваліся толькі на асоб дваранскага паходжання. У дачыненні да сялянак і прадстаўніц іншых ніжэйшых груп шляхцюкі маглі ўжываць гвалт.

Мода, развіццё матэрыяльнай культуры змянялі традыцыйную культуру паводзін. Уяўленні пра здаровы лад жыцця і гігіену развіваліся пад уплывам поспехаў натуральных навук і філасофіі пазітывізму. Зубная шчотка рабілася неабходным сродкам асабістай гігіены. Дваранскае грамадства стала меней цярпімым да насякомых (прусакоў, блох, клапоў) і смуроду, наяўнасцю якіх вызначаліся прыдарожныя корчмы і шынкі. Для дэзадарацыі пакой абкурваўся духмянымі смоламі, хату пасыпалі сечаным аерам. За рэжымам дня, утрыманнем паноў у чысціні, камфорце і бяспецы сачыў спецыяльны лёкай — камердынер [56, с. 80—99].

Шляхціцу-«сармату» быў супрацьпастаўлены новы ідэал «свецкага чалавека», спажыўца заходнееўрапейскай моды, як побытавай, так і інтэлектуальнай. З’яўленне ідэалу «свецкага чалавека» было абумоўлена секулярызацыяй сістэмы адукацыі, павышэннем ролі горада як культурнага асяродка і, у прыватнасці, салонаў, агульнай фемінізацыяй дваранскага выхавання. Важнай свецкай якасцю было ўменне падабацца. Яго складалі такія рысы як нязмушанасць, гасціннасць, далікатнасць, сардэчнасць, асвечанасць, адсутнасць руціннага наследавання этыкету, роўны і вясёлы нораў.

З другога боку, публіцысты адзначалі працэс бруталізацыі і вульгарызацыі паводзін дробнага шляхецтва. З дробнашляхецкага ўжытку знікала насоўка. Асаблівым шляхецкім шыкам лічылася ўменне сплёўваць праз зубы, чаго, напрыклад, не дазвалялі сабе рабіць у грамадскім месцы сяляне. Шырока распаўсюджаным было брыдкаслоўе і праклёны, якія шляхта ўжывала не толькі ў шынку ці на кірмашы, але і ў сваім доме ў дачыненні да блізкіх. Жарты і залёты набывалі нахабны і брутальны характар [327, s. 21—22].

Уплыў на сацыяльныя паводзіны, асабліва ў маладзёжных асяродках, у разглядаемы перыяд аказвала мода на канспірацыю. Апошнюю спарадзіла агульная палітызаваная атмасфера ў еўрапейскіх дзяржавах паміж напалеонаўскімі войнамі і французскай рэвалюцыяй 1848 году. Масонскі рух таксама заставаўся папулярнай формай палітычнай самаарганізацыі

грамадства. Палітычная канспірацыя прыўнесла элементы новай маралі ў адносіны прадстаўнікоў прывілеяванага грамадства. Побач з сямейнымі, сяброўскімі і суседскімі формамі ўзаемадзеяння, заснаванымі на традыцыйных рыцарскіх і хрысціянскіх каштоўнасцях, з'явіліся згуртаванні, якія падпарадкоўваліся дысцыпліне, клятве, аўтарытэту кіраўніка. Таталітарныя прынцыпы самаарганізацыі таемных таварыстваў відавочна адрозніваліся ад індывідуалістычнага дваранскага этасу. Шпегаванне і падазронасць, містыфікаванне свайго асяроддзя, тэатралізацыя паводзін, экзальтацыя, арыентацыя на гвалтоўныя неправавыя формы вырашэння сацыяльных канфліктаў, амбівалентная мараль, дэмагагічнасць, і разам з тым — ідэйнасць, дэмакратызм, самаахвярнасць — усе гэтыя рысы субкультуры таемных таварыстваў стварала новыя формы сацыяльных паводзін прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд [296, s. 82].

Такім чынам, культура паводзін прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя з'яўлялася досыць устойлівай да знешніх уплываў. У асяроддзі дробнага шляхецтва і святарства заставаліся актуальнымі барочныя «сармацкія» формы паводзін. Пэўную ролю ў кансервацыі барочных экспрэсіўных элементаў выконваў каталіцкі касцёл. Культура паводзін з'яўлялася найбольш складанай сферай для пераймання. Спробы наследавання арыстакратычных узораў паводзін з боку дробнай і сярэдняй шляхты, у адрозненні, напрыклад, ад практыкі капіравання элементаў арыстакратычнай вопраткі, рабіліся прадметам высмейвання. Малазямельная шляхта, «падпанкі», захаваўшы прэтэнзіі на сацыяльную выключнасць, не мела эканамічных магчымасцяў і адукацыйнага цэнзу для асіміляцыі новых цывілізацыйных узораў. Фанабэрыя і неадукаванасць змушалі дробную шляхту фантазіраваць на тэму свецкіх узораў жыцця і вынаходзіць фантасмагарычныя формы ў побыце і сацыяльных адносінах. Адукаваныя і сацыяльна-мабільныя асобы хутчэй пазбаўляліся барочных сацыяльных узораў, засвойваючы касмапалітычныя па сваёй сутнасці формы чыноўніцкай і разначынскай інтэлігенцкай субкультур імперскай Расіі. Сярэдняе і буйное дваранства, страціўшы палітычную зацікаўленасць у падтрымцы ілюзіі гамагеннасці шляхецкай культуры, крытыкавала праз пасярэдніцтва пазітывісцкі скіраваных публіцыстаў спробы дробнага шляхецтва наследаваць узорам арыстакратычнай культуры. Кодэкс свецкіх паводзін спрыяў фарміраванню рафінаванага слою еўрапейскай арыстакратыі. Сармацкае — барочны ірацыяналізм і залішняя эмацыйнасць — не адпавядала новаму элітарнаму этасу, які палягаў на тэхніках рацыяналізацыі паводзін і эмацыйнага самакантролю.

## 3.2 Формы баўлення вольнага часу

Вольны час — сфера культуры, у абсягу якой, акрамя аднаўлення фізічных і псіхічных сіл, адбываюцца працэсы духоўнага і эстэтычнага выхавання асобы. Структура і формы баўлення вольнага часу залежаць ад сезону, узросту і полу адпачываючых. У Беларусі ў разглядаемы перыяд на выбар формаў адпачынку ўплывалі таксама веравызнанне, адукацыйны і маёмасны цэнз адпачываючых. У буйных землеўладальнікаў і дробнай шляхты змест паняцця «вольны час» адрозніваўся.

«Цяпер толькі паны спяць да дня; за іх іншыя думаюць і працуюць», — так у творы Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня» фармуляваўся дробнашляхецкі стэрэатып аб арыстакратычным стылі жыцця [19, с. 167]. Зразумела, забавы панства не засноўваліся толькі на прывілеі працяглага сну. У магната М.К. Агінскага, напрыклад, раніца прызначалася для навучання, палітычных і гаспадарчых перамоваў, работы над мемуарамі. Дзень — конным выездам. Увечары пачыналася «музыкатворчасць» [75, с. 143]. Прадстаўнікі розных грамадскіх груп рэдка сыходзіліся на агульным гульнёвым полі. Такую магчымасць давалі ў вёсцы свята Дажынак або імяніны пана, у мястэчку і горадзе — рэлігійныя фэсты, кірмаш і маскарад. Арганізатарамі разнастайных святаў (фэстаў, одпустаў, шэсцяў і працэсій) выступалі цэрквы і касцёлы. Да фэстаў часта прымяркоўваліся кірмашы [157, с. 166]. Слова «кірмаш» у XIX стагоддзі азначала не толькі торг, але і гулянне. Звычайна кірмашы ладзіліся летам і восенню ў гадавыя рэлігійныя святы [109, с. 234]. У канцы пяцідзесятых гадоў XIX стагоддзя ў Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай і Гарадзенскай губернях налічвалася каля 270 кірмашоў. Большасць з іх былі аднадзённымі, асобныя працягваліся тыдзень і болей. Найбуйнейшымі з’яўляліся Бешанковіцкі ў Віцебскай, Зэльвенскі ў Гродзенскай, Любавіцкі ў Магілёўскай губернях, контрактавы ў Мінску і Троіцкі ў Гомелі [53, с. 103]. На кірмашы прыязджалі прыватныя тэатральныя антрэпрызы, адбываліся цыркавыя дэманстрацыі, касцюміраваныя танцавальныя вечарыны [256, с. 78—79]. Кірмашовыя імпрэзы вылучаліся масавасцю і сацыяльнай разнастайнасцю ўдзельнікаў. Кірмашы супадалі часам з дваранскімі выбарамі, пачаткам школьных вакацый, кантрактамі, што павялічвала памеры ўрачыстасцяў. Кантракты, гандлёва-фінансавыя імпрэзы, адбываліся штогод у буйных гарадах краю. Пад час сакавіцкіх кантрактаў у Мінску набывалі і арандавалі маёнткі, браліся і выплачваліся пазыкі, замацоўваліся ўмовы на пастаўкі тавару, намаўляліся эканомы, пісары [39, с. 97]. Віленскія святаюр’еўскія кантракты, у якіх бралі ўдзел і прадстаўнікі беларускіх губерняў, з’яўляліся тым рэдкім момантам, калі ў край, каб сплаціць або

атрымаць пазыкі, вярталася арыстакратыя, што перабывала звычайна за яго межамі [334, s. 7]. Да кантрактаў прымяркоўваліся тэатральныя і цыркавыя паказы, канцэрты, балі, званыя абеды [263, с. 287].

Папулярнымі зонамі адпачынку з'яўляліся грамадскія паркі, бульвары, корчмы. Месцам, дзе бавілася сацыяльна-змешанае грамадства, з'яўляліся таксама рэдуты, касіны — камерцыйныя танцавальныя вечары, якія арганізоўваліся ў буйных гарадах краю асабліва шырока зімой — на запусты [256, с. 150]. Прывілеяванае грамадства не бавілася танцамі пад час пастоў. Удзел у рэдутах (або рэсурсах) вымагаў ад удзельнікаў наяўнасці маскі. Апошняя мусіла ствараць камфортныя ўмовы — ілюзію роўнасці — для сацыяльна-змешанай кампаніі адпачываючых (дваранства, купецтва, разначыннай інтэлігенцыі). Маскарад з'яўляўся месцам, дзе дазваляліся паводзіны, забароненыя ў звычайных абставінах. Маска стварала авантурныя абставіны ў адносінах палоў. Сучаснікі адзначалі дэградацыю маральнай атмасферы рэдутаў [195]. Вакол маскарадаў узнікалі легенды, мемуарысты распавядаюць пра містычныя здарэнні, звязаныя з маскарадамі. Галоўнымі забавамі на рэдутах былі танцы і картачная гульня. Танцавалі мазуркі, вальсы. Баляванні працягваліся да ўсходу сонца [309, s. 150].

Саслоўнымі асяродкамі баўлення вольнага часу з'яўляліся «дваранскія зборні», дзе некалькі разоў на тыдзень ладзіліся балі і вечарыны. Тут гралі ў карты, більярд, шахматы, знаёміліся з прэсай. Падобную функцыю выконвалі таксама клубы («англійскія», афіцэрскія). У клубах быў абмежаваны ўваход, жанчыны не дапускаліся акрамя выпадкаў, калі ладзіліся святочныя сустрэчы, напрыклад, «з'езды». Прыватныя бальныя вечарыны для запрошаных гасцей адбываліся таксама ў асобных дваранскіх дамах. Баль, у адрозненні ад іншых танцавальных імпрэзаў, з'яўляўся рытуалізаванай дзеяй. У ім, як правіла, удзельнічалі людзі аднаго сацыяльнага кола. Ён быў важным кампанентам у матрыманіяльных стратэгіях арыстакратыі. Баль з'яўляўся месцам разнастайных камунікацый — ад мілосных да грамадска-палітычных [272, с. 76]. Тут упершыню выяўляліся і замацоўваліся модныя тэндэнцыі. Балі праводзіліся ўвесь год, за выключэннем пастоў. Галоўным бальным сезонам была зіма [80, с. 144]. Грамадскія балі і абеды часам ладзіліся ў гонар асобных людзей ці з нагоды пэўных падзеяў. Па сведчанню мемуарыстаў, напярэдадні вайны з Напалеонам «шал забаваў» на беларускіх землях «ахапіў рэзідэнцыі магнатаў, двары, нават дворыкі» [180, с. 183]. Балі, што ладзіліся для каранаваных асобаў, узнімаліся да вышынь мастацтва. Прыкладам служаць імпрэзы, якія адбываліся ў Вільні на працягу 1812 года па чарзе ў гонар расійскага і французскага імператараў. Часткай гэтых дзеяў былі кантаты, спевы, алегарычныя транспаранты [97, с. 153].

Танцавалі на балях пад аркестр. Балі адкрываліся менуэтам, а пазней — паланезам, што уяўляў сабой папарнае шэсце ланцугом пад музыку праз бальную залю, часамі праз увесь палац. Пасля паланеза звычайна пачыналася кадрыля. Існавалі нацыянальныя віды гэтага танца — руская, нямецкая, французская (кантрданс), польская. Кадрыля дапускала фантазію, што ператварала гэты танец у сапраўдную прыгоду для танцуючых. Наступным танцам з'яўляўся вальс. Ён набыў папулярнасць сярод моладзі ў канцы XVIII — пачатку XIX стагоддзя. Галоўным танцам на бале лічылася мазурка. Характэрнай асаблівасцю мазуркі з'яўлялася мужчынскае сола. Заканчваўся баль катыльёнам — танцам-гульнёй, які выконваўся на матыў вальса [162, с. 21—28].

Да гарадскіх формаў баўлення вольнага часу можна аднесці грамадзянскія ўрачыстасці. Спецыялістамі ў дадзенай сферы з'яўляліся езуіты. Напрыклад, адкрыццё Полацкай езуіцкай акадэміі ў 1812 годзе праходзіла пад салют пяцідзесяці гармат, пры ўдзеле школьных і вайсковых музычных калектываў, з касцюміраванымі вулічнымі працэсіямі, транспарантамі, феерверкамі, ілюмінацыяй, тэатралізаванымі імпрэзамі з дэкламацыяй на розных мовах [189, с. 108].

Значная частка формаў баўлення вольнага часу была звязана з рэлігійна-абрадавай сферай [46, с. 229]. Кожную нядзелю дваранства збіралася ў парафіяльным храме. Для дробнага шляхецтва наведванне касцёла з'яўлялася святам, нагодаю дэманстрацыі строяў і добрых манер [212, с. 473]. Багатымі на забавы былі Каляды [300, s. 15]. Пад час Масленкі адбываліся кулігі — раз'езды на санях шляхецкай кампаніі ў масках па суседзям. Падрыхтоўка да споведзі, наведванне школьнікамі астрогаў і шпіталяў з міласцінай у Чысты Чацвер рабілі ўрачыстым пярэдадзень Вялікадня [19, с. 92]. На Вялікдзень шляхта ладзіла ілюмінацыі з смаляных бочак, салют са стрэльбаў і марціраў. На Юр'ю землеўладальнікі запрашалі святароў у поле адпраўляць імшу, каб быў добры ўраджай. Сёмуха з'яўлялася часам масавых гулянняў, якія адбываліся звычайна за паселішчам [23, с. 219]. На пярэдадзень Купалля прымяркоўваліся буйныя кірмашы [102, с. 249—266]. Агульным святам для сялянства і паноў з'яўляліся Дажынкі, якія вызначаліся патрыярхальным духам [98, с. 282]. Але ў 20—30-ых гадах XIX стагоддзя сярод панства выявілася тэндэнцыя забараняць або абмяжоўваць святкаванне Купалля і Дажынак [249, с. 209]. Гэта можна патлумачыць дэнацыяналізуючым уплывам ідэалогіі польскага асветніцтва, а таксама ростам міжсаслоўнага напружання ў беларускай вёсцы.

Гасціннасць заставалася важнай адзнакай арыстакратычнага стылю жыцця. Пэўныя дваранскія сем'і, якія пераязджалі зімой у гарады, трымалі «адкрытыя дамы», куды можна было патрапіць на званы абед ці вячэру.

Падставамі падобнай гасціннасці з’яўляліся матрыманіяльныя разлікі або палітычныя меркаванні з увагі, напрыклад, на будучыя дваранскія выбары. Нагодай для збору гасцей з’яўляліся імяніны, хрэсьбіны, заручаны, вяселле. Мода на спажыванне гарбаты спарадзіла завядзёнку збіраць увечары за самаварам суседскае таварыства. Беларуская шляхта выдаткоўвала на святкаванні значную частку сваіх даходаў. Пад час масленічных куліг маглі цалкам знішчацца шматмесячныя запасы прымаючай гасцей сям’і [24, с. 234]. Захоўвалася завядзёнка сілай затрымліваць гасцей на колькі дзён [335, s. 84]. Праграму шматдзённых збораў родных і суседзяў складалі шпацыры, абеды, танцы, вячэра, спевы, гульня ў карты [38, с. 67]. Пажаданымі гасцямі ў дваранскіх дварах былі паэты, мастакі, музыкі, навукоўцы. Пэўныя сем’і амаль усё лета бавілі ў адведванні суседскіх двароў. Утрыманне службы і коней гасцей клалася на прымаючы бок.

Перыядычна ўзнікала свецкая мода на містыфікацыі і жарты: ладзіліся Primum aprilis [172, с. 23], строіліся «фіглі» [154, с. 290]. Моладзь містыфікавала старэйшых, радавітыя — «паспольства», афіцэры — студэнтаў і наадварот. Досціпы насілі не заўжды бяскрыўдны характар [297, s. 11]. Распаўсюджанай з’явай быў містыцызм. Прыхільнікамі містычнага вучэння А. Тавяньскага, напрыклад, з’яўляўся А. Міцкевіч [101, с. 126]. У канцы XVIII — пачатку XIX стагоддзя атрымалі папулярнасць сеансы «жывёльнага магнетызму» ці месмерызму. Гэты містычны накірунак быў абавязаны сваім з’яўленнем нямецкаму фізіятэрапеўту Ф.А. Месмеру, які прапагандаваў свой метад як лячэнне ад нервовых захворванняў і меланхоліі. Былі папулярныя вечаровыя шпацыры на могілках, «выкліканне духаў», аповеды пра радавыя праклёны [180, с. 130]. У дамах дробнай шляхты зімовыя вечары грамадства бавіла, тлумачачы сны і апавядаючы пра ваўкалакаў і іншыя жахі [292, s. 9]. Пад час Каляд паненкі займаліся варажбой. У рэчышчы падобных настрояў развівалася цікаўнасць да «літаратуры таямніцы» — рамантычных і гатычных раманаў В. Скота, І. Гётэ, Г. Рэдкліф.

Значную частку вольнага часу прадстаўнікі прывілеяванага саслоўя праводзілі сярод блізкіх. Тут панавалі гульні і забаўкі, якім быў уласцівы інтэлектуальны кампанент. Л. Галамбёўскі апісаў 195 гульняў, адрозніваючы іх адпаведна ўзроставай, полавай, саслоўнай, сезоннай, нацыянальнай прыналежнасці [303, s. 5—6]. Класічнымі «хатнімі» гульнямі з’яўляліся фанты і шарады, што вымагалі літаратурнай падрыхтоўкі і фантазіі. Захоўвалі папулярнасць шашкі — на 64 поля і «польскія», што мелі сто палёў. На такой дошцы гулялі ў ваўка, млынок, трыктрак. Мелі прыхільнікаў шахматы. Гульнёй у косці бавіліся звычайна ў карчме, на кірмашах. Гулялі ў більярд, часам — на грошы. Неад’емнай часткай забаў дваранства былі карты. Іх з’яўленне ў Польскім каралеўстве адносяць да XVI стагоддзя. З Польшчы яны

пачалі распаўсюджвацца на беларускія землі. У XIX стагоддзі існавала некалькі відаў карт — фламандскія, польскія, найбольшую папулярнасць мелі французскія карты. Картачныя гульні падзяляліся на камерцыйныя (пікет, віст, прэферанс) і азартныя (банк, фараон). Камерцыйныя гульні вымагалі інтэлектуальных высілкаў, азартныя — засноўваліся на гульні выпадку. Гульня дзеля грашовага выйгрышу фармальна асуджалася [180, с. 61]. Пройгрыш у карты з'яўляўся часам замаскіраванай формай хабару [96, с. 415]. За картачным сталом вырашаліся кар'ерныя і палітычныя пытанні. Асаблівыя памеры картачная гульня набывала пад час масавага побыту ў краі расійскіх вайскоўцаў, якія прываблівалі сваёй азартнай гульнёй варшаўскіх і віленскіх шулераў [39, с. 74]. Патрыятычныя маладзёжныя суполкі (філаматы, дэмакратычнае таварыства Ф. Савіча) ставілі мэту адцягнуць моладзь ад карт [198, с. 239]. Да квазіазартных забаў можна аднесці латарэі, мода на якія ўзнікла ў канцы XVIII стагоддзя. Латарэі ладзіліся як на грамадскіх пачатках, з меркаванняў дабрачыннасці, так і афіцыйна [334, s. 106].

Тых, хто не любіў карты, у салонах чакалі спецыяльныя столікі з часопісамі мод, гравюрамі, літаграфіямі, карыкатурамі [334, s. 31]. Чытанне нельга лічыць папулярнай формай баўлення часу сярод прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя. Дробная шляхта не мела матывацыі, а часам і сродкаў, каб набываць кнігі. Было пашырана меркаванне пра «несур'ёзнасць» такога занятку, як чытанне. Лічылася, што замежная літаратура, асабліва французская, разбэшчвае моладзь [180, с. 167]. Любімым чытвом у шляхты з'яўляліся календары (віленскі, бердычаўскі), а таксама Біблія [213, с. 304]. Папулярным таварам былі малітоўныя кнігі, музычныя ноты, падручнікі. Попытам карысталася літаратура на польскай і французскай мовах, меней — на нямецкай і рускай. Адукацыя ў каталіцкіх і базыльянскіх школьных установах прывучала да лацінскіх і старагрэчаскіх аўтараў [256, с. 150].

Публічныя літаратурныя чытанні, якія ладзіліся ў Віленскім універсітэце прафесарам Л. Бароўскім, заахвочвалі моладзь да творчасці. Сярод адукаванага грамадства паўставаў рамантычны культ паэта («прарока», «вайдэлота»). Версіфікацыя зрабілася ў дваранскім асяроддзі распаўсюджаным заняткам. Вершы перапісваліся, перасылаліся ў лістах, вывучваліся напамяць. Заняткі літаратурай з'яўляліся сродкам павышэння сацыяльнага статуса для беднай правінцыйнай шляхты. Станаўленне рынка прэсы, пашырэнне адукацыі ў краі і пралетарызацыя шляхты спрыяла таму, што аматарскія заняткі літаратурай рабіліся для шэрагу прадстаўнікоў шляхецкай інтэлігенцыі прафесіяй.

Распаўсюджанай формай забаў з'яўлялася чытанне ўголас. Папулярным заняткам было слуханне спеваў «дзядоў» — народных лернікаў і гусляроў, многія з якіх атэставаліся ветэранамі напалеонаўскіх войнаў або шляхецкіх

паўстанняў. У дваранскім асяроддзі распаўсюджваліся рукапісныя творы на французскай, польскай і рускай мовах — узоры аматарскай галантнай літаратуры, антыўрадавая сатыра. Сустракаліся беларускамоўныя творы, напрыклад, паэма «Энеіда навыварат» [109, с. 25], пераклады творчасці А. Міцкевіча на беларускую мову [104, с. 327]. Вядомымі аўтарамі рукапіснай літаратуры былі ўраджэнцы Падзвіння Я. Баршчэўскі, Я. Аношка, Ф. Рысінскі [108, с. 231]. Атрымалі папулярнасць рукапісныя літаратурна-мастацкія альманахі-альбомы. Пісаліся мемуары, гаспадарчыя трактаты (І. Манькоўскі, Г. Цюндзявіцкая, Ю. Струміла) [141]. Высокіх эстэтычных вышынь дасягала эпісталярнае мастацтва. Лісты са сталіц ці замежжа замянялі ў правінцыі прэсу. Пэўных паралітаратурных здольнасцяў вымагалі сямейныя святкаванні, з нагоды якіх складаліся вершаваныя віншаванні, застольныя тосты. Значнасць тоста ў шляхецкім таварыскім жыцці з’яўлялася настолькі вялікай, што нават прафесійныя літаратары займаліся іх напісаннем. Выходзілі зборнікі тостаў на розныя жыццёвыя выпадкі. Паважнай свецкай якасцю было ўменне пісаць эпіграмы. Пэўнай формай вуснай літаратурнай творчасці ў асвечаным грамадстве з’яўляліся разнастайныя досціпы («bon mot»). Высока цаніліся паэтычныя імправізацыі. Значную частку літаратурнай творчасці шляхты складалі вусныя ананімныя формы, якія можна аднесці да шляхецкага фальклору — показкі-гавэнды на паляўнічыя, містычныя, гістарычныя тэмы, радавыя паданні [230, с. 56].

Напачатку XIX стагоддзя распаўсюджваюцца прыватныя чытальні, якія на платнай падставе давалі магчымасць жадаючым азнаёміцца з навінкамі літаратуры і перыёдыкай [172, с. 71]. Такой установай у саракавых гадах XIX стагоддзя была, напрыклад, «сумесная сяброўская бібліятэка» братоў Вярыгаў-Дарэўскіх у Віцебску [196, с. 245]. Кнігі можна было здабыць таксама ў гімназічных, семінарскіх, клубных, манастырскіх бібліятэках [234, с. 43]. У Беларусі існавалі прыватныя кнігазборы агульнаеўрапейскага значэння (Пуслоўскіх, Радзівілаў, Сапегаў, Тышкевічаў, Храптовічаў, Т. Нарбута, Я. Наркевіча-Ёдкі), якія былі абмежавана даступныя [312, s. 256]. Губернскія ўлады рабілі сціплыя захады па арганізацыі публічных бібліятэк [171. 1, спр. 1741, л. 3—20; 171. 3, спр. 15, л. 11]. Небагатае чыноўніцтва выпісвала часопісы на складкі, кнігамі абменьваліся. Паступова павялічваўся ўплыў на грамадскую думку прэсы. На рускамоўныя выданні («Вестник Европы», «Московский телеграф», «Новое время», «Отечественные записки», «Северный Архив», «Сын Отечества») падпісваліся губернскія публічныя бібліятэкі, жадаючыя маглі атрымаць рускую перыёдыку поштай. Падшыўкі польскамоўных сродкаў масавай інфармацыі («Kurier Litewski», «Dziennik Wileński», «Tygodnik Wileński», «Wiadomości Brukowe») у Вільні можна было пачытаць у цукернях. Па-за сталіцамі яны распаўсюджваліся ў адзінкавых

асобніках. Новыя выданні выходзілі дзякуючы зборам ад падпіскі. Правінцыйныя аматары чытання ездзілі за кнігамі ў Вільню, Варшаву, Санкт-Пецярбург, Маскву. Кнігі можна было замаўляць таксама поштай па кніжных каталогах. Сталічныя гандляры прывозілі кнігі на рэгіянальныя кірмашы [213, с. 305].

У сталіцах і ў правінцыі ладзіліся літаратурныя пасяджэнні, арганізоўваліся мастацкія салоны. У Вільні месцам збірання інтэлігентнай грамадскасці была кнігарня Я. Завадскага, цэнтрам гуртавання інтэлектуальных сілаў краю рабіліся рэдакцыі віленскіх газет. Вядомымі інтэлектуальнымі асяродкамі былі гурткі А. Кіркора, І. Лялевеля, Э. Мастоўскага, А. Адынца, Р. Падбярэскага ў Вільні, Я. Баршчэўскага ў Санкт-Пецярбурзе, А. Вярыгі-Дарэўскага ў Віцебску. Навуковымі штабамі краю з’яўляліся Віленскі музей Е. Тышкевіча, Віленская археалагічная камісія [200, с. 49]. Аматары навукі займаліся прыватнымі вышукамі ў антыкварыятах, бібліятэках, праводзілі археалагічныя раскопкі, збіралі і апрацоўвалі фальклор [214, с. 433; 250, с. 228]. Ствараліся прыватныя музейныя калекцыі. Найбуйнейшымі з іх з’яўляліся зборы Радзівілаў, Тышкевічаў, Агінскіх, А. Плятэра, Р. Тызенгаўза, Э. Чапскага, Т. Нарбута, П. Румянцава [99, с. 5]. Папулярнасцю карысталіся публічныя лекцыі віленскіх прафесараў (І. Лялевель, І. Галухоўскі). Асаблівы розгалас іх выступленні мелі сярод жанчын, для якіх публічныя лекцыі з’яўляліся магчымасцю далучыцца да універсітэцкай адукацыі [101, с. 118].

Прыватныя забавы дваранскага саслоўя былі багатыя на разнастайныя артыстычныя формы. Музыка з’яўлялася элементам штодзённага жыцця ў беларускіх дваранскіх сем’ях з высокім і сярэднім узроўнем дабрабыту. У святарскім асяроддзі музыка з’яўлялася таксама распаўсюджаным відам баўлення часу. Пашыралася папулярнасць аматарскіх музычных вечарынаў, якія адбываліся пры ўдзеле самадзейных артыстаў з прывілеяванага саслоўя [332, s. 81]. У Вільне, культурным цэнтры заходнебеларускага рэгіёну, рэгулярна ладзіліся канцэртныя выступленні замежных выканаўцаў і мясцовых прафесіяналаў (тэатральных і касцёльных музыкаў) — віяланчэлістаў, піяністаў, скрыпачоў. Давалі гастрольныя выступленні оперныя спевакі з Дрэздэна, Варшавы, італьянскіх гарадоў. Актыўную ролю ў арганізацыі музычнага жыцця выконвалі дабрачынныя таварыствы. Аматарскія аркестры з пяці—шасці інструментаў, хоры, дуэты дэманстравалі сваё майстэрства на сямейных урачыстасцях, загарадных гуляннях. Пэўныя прыватныя аркестры прымалі ўдзел у драматычных і оперных пастаноўках публічных тэатраў. Высокага ўзроўню дасягала сольнае інструментальнае выканальніцтва. Фартэпіяна, скрыпка, гітара, віяланчэль, кларнет і флейта былі найбольш папулярнымі музычнымі інструментамі ў дваранскім асяроддзі

[172, с. 71]. У беларускіх дваранскіх дамах сустракаліся часам рарытэтныя інструменты работы вядомых майстроў.

Распаўсюджанымі творамі ў рэпертуары аматараў з’яўляліся мелодыі мазурак, полек, кракавякаў, рамансы, куплеты, творы І. Гумеля, Дж. Фільда. Больш амбітныя выканаўцы прапагандавалі творчасць Ф. Шапэна, Ф. Ліста, С. Тальберга. У дамах Юндзілаў, Ратынскіх, Манюшкаў адбываліся камерныя канцэрты. На густы аматараў музыкі ўплываў рэпертуар прафесійных тэатраў, які ўключаў творы польскіх, італьянскіх, венгерскіх, французскіх, нямецкіх выканаўцаў — Л. Бетховена, Э. Горыя, К. Вэбера, Л. Лакомба, С. Манюшкі, Г. Даніцэці, Д. Расіні, Л. Раселена, В. Беліні. Аглядам музычнага жыцця краю займаўся аўтарскі калектыў варшаўскага часопіса «Ruch muzyczny», чытачамі і карэспандэнтамі якога былі і прадстаўнікі прывілеяванага грамадства беларускіх зямель [196, с. 254].

Стварэнне ананімных са злабадзённым зместам польскамоўных песень у два тэмпы (кракавяк) або ў тры (мазурка) зрабілася ў першай чвэрці XIX стагоддзя распаўсюджанай з’явай сярод студэнцкай і гімназічнай моладзі [158, с. 143]. Пісаліся песні на беларускай мове, якія спяваліся на папулярныя народныя мелодыі і таксама мелі пэўную палітычную накіраванасць. Прадстаўнікамі мясцовага дваранства на прыватных вечарынах выконваліся і народныя беларускія песні [332, s. 100]. Але пераважную частку рэпертуару хатніх канцэртаў складалі польскамоўныя і франкамоўныя творы. Уваходзілі ў моду арыі з італьянскіх опер і аперэт. Карысталіся папулярнасцю рамансы [332, s. 62]. Вулічныя музыкі і паэты, якія зараблялі сабе на жыццё з дапамогай катрынкі, мелі ўласную аўдыторыю [337, s. 114].

Адной з любімых форм баўлення вольнага часу ў прывілеяваным грамадстве з’яўляўся тэатр. Тэатральная ложа была своеасаблівым філіялам салону. Наведванне тэатру рабілася нагодай для дэманстрацыі модных строяў, навязвання свецкіх кантактаў. У Мінску, Віцебску, Гродна на працягу разглядаемага перыяду складвалася ўласная тэатральная традыцыя. Вядомы імёны больш пяцідзесяці антрэпрэнёраў, музычна-тэатральныя калектывы якіх пад час кірмашоў і кантрактаў гастралявалі ў першай палове XIX стагоддзя ў Беларусі [196, с. 249]. У рэпертуары прафесійных тэатральных калектываў пераважалі музычныя спектаклі. Пад час пастоў і ў летнія месяцы ў тэатральным сезоне адбываліся перапынкі. Акрамя прафесійных існавалі аматарскія, школьныя і прыватнаўласніцкія тэатральныя калектывы. Іх выступленні адбываліся звычайна з пэўнай нагоды (сямейныя ўрачыстасці, грамадскія падзеі або дабрачынныя акцыі). Ставілі пераважна камедыі і вадэвілі на польскай, французскай і рускай мовах [180, с. 74].

Карысталіся поспехам «жывыя карціны», якія ствараліся аматарскімі сіламі з выкарыстаннем дэкарацыяў і гістарычных строяў на сюжэты палотнаў

вядомых мастакоў, абразкоў з біблейнай і сусветнай гісторыі, з літаратуры і міфалогіі. У дадзенай забаве актыўна ўдзельнічалі дзеці ў амплуа амураў і анёлаў. Асабліва папулярнымі «жывыя карціны» рабіліся пад час пастоў, калі забаранялася бавіцца танцамі. Былі распаўсюджанымі таксама псеўданародныя букалічныя паказы з жыцця экзатычных этнасаў, пад час якіх выконваліся «нацыянальныя» песні і танцы [180, с. 70].

Тэатралізаваны характар насілі публічныя дэкламацыі — у салонах, на дабрачынных канцэртах. У гульнёвай форме праводзіліся зборы ахвяраванняў (велікодныя, дабрачынныя). Вялікую ролю ў выхаванні моладзі надавалі тэатральнаму мастацтву каталіцкія школы. Відовішчам былі іспыты ў каталіцкіх і базыльянскіх школах, якія ладзіліся публічна. На вачах бацькоў шкаляры экзаменавалі адзін аднаго, удзельнічалі ў дыспутах, дэкламавалі, ставілі драматычныя творы [19, с. 93]. У правінцыі, па дасціпнай заўвазе сучасніка, тэатральныя спектаклі замянялі публіцы судовыя паседжанні. Прамовы адвакатаў (глосы), выкладанне прэтэнзіяў (маніфесты) друкаваліся і распаўсюджваліся [39, с. 80]. Мясцовая адвакацкая школа да скасавання ў 1840 года галоснай судавытворчасці вызначалася адукаванасцю і красамоўствам [101, с. 122].

Патрэба землеўладальнікаў у эстэтычнай дзейнасці задавальнялася таксама пры планіроўцы сядзіб і паркаў, закладцы садоў, разбіўцы кветнікаў і ўладкаванні аранжарэй. Вырошчванне кветак звычайна з’яўлялася заняткам жанчын, якія выпісвалі экзатычныя гатункі з-за мяжы, абменьваліся насеннем і вопытам з суседкамі, складалі гербарыі і букеты, рабілі замалёўкі кветак у альбомах [267, с. 32].

Важнай падзеяй у жыцці прадстаўнікоў дваранства ў разглядаемы перыяд з’яўлялася вандроўка, у якую выпраўляліся дзеля навучання, аздараўлення, азнаямлення з тэндэнцыямі моды, па рэлігійных меркаваннях. Яна была неадменнай часткай выхавання моладзі. У магнатаў у вандраваннях праходзіла значная частка жыцця. Напрыклад, князь Ф. Сапега бавіўся ў вандроўках штогод, вяртаючыся на радзіму ў канцы лета, каб позняй восенню зноў выпраўляцца за мяжу [180, с. 141]. Папулярнасцю карысталіся Парыж, Варшава, Дрэздэн, італьянскія гарады, а таксама курорты — Шлёнскія воды, Карлсбад, воды Зальцбурга, адпачынак на моры пад Каралеўцам [180, с. 52]. Найбольш вядомым месцам аздараўлення ў беларуска-літоўскім краі былі Друскінікі. Там меліся мінеральныя ванны, парк, галерэя для шпацыру пад час дажджу, рэстарацыі, кнігарні, тэатр, прыязджаў аркестр з Вільні, выдаваўся зборнік «Ундзіна», з якім супрацоўнічалі вядомыя літаратары, ладзіліся балі, гулянні па Нёману [57, с. 62—63]. Адпачываць і лячыцца ў краі можна было таксама на Бірштанскіх і Стаклішскіх водах, у сернай водалячэбніцы «Лазенкі» ля Відзаў, у Баркоўшчыне на Вушаччыне [57, с. 61].

Намаганнямі рамантыкаў папулярызаваліся вандроўкі па роднаму краю. На падставе такіх падарожжаў складаліся літаратурныя дзённікі (Ю. Крашэўскі, А. Плуг, А. Кіркор, У. Сыракомля) [215, с. 425]. Экскурсіі па ваколіцах уключалі наведванне бажніц, многія з якіх мелі каштоўныя гістарычныя і мастацкія зборы, дваранскіх сядзіб, якія таксама захоўвалі досыць гістарычных памятак, ці служылі ўзорам гаспадарання [71, с. 49]. Не абміналіся і помнікі прыроды. Пачалі выходзіць даведнікі па памятных мясцінах. Загарадныя шпацыры набывалі часам элемент патрыятычнай дэманстрацыі, як, напрыклад, наведванне віленчукамі магілы Я. Снядэцкага ў Яшунах. Ладзіліся паломніцтва на рэлігійныя фэсты да цудатворных абразоў Божай Маці ў Бялынічах, Жыровічах, Чанстахове. Асаблівае шанаванне меў абраз Вострабрамскай Божай Маці ў Вільні [96, с. 412].

Развіццё прыродазнаўчых навук, медыцыны і гігіены скіроўваў увагу грамадства да забаў на вольным паветры. Фізічныя практыкаванні былі ўлучаны ў школьныя праграмы яшчэ пад час рэформы Адукацыйнай камісіі. Папулярызатарам фізічнага выхавання напачатку XIX стагоддзя з’яўляўся прафесар Віленскага ўніверсітэту А. Снядэцкі. У буйных гарадах пачалі ўзнікаць першыя гімнастычныя школы і спартыўныя таварыствы, набылі папулярнасць лыжы, гульні з мячыкам, валанам. Не былі забытыя і традыцыйныя формы шляхецкіх забаў: катанне на санях узімку — кулігі і шліхтады, конныя шпацыры летам. Нагодай дэманстрацыі рыцарскіх здольнасцяў з’яўляліся спаборніцтвы па стральбе. Да традыцыйных формаў шляхецкіх забаў адносілася паляванне. Калі раней ловы з’яўляліся «галоўным заняткам вышэйшага класу і школай вайсковага побыту» [100, с. 45] — выконвалі мабілізуючую і трэніровачную функцыю — «былі вайною, а не разнёй» [309, s. 119], а таксама праводзіліся з гаспадарчых меркаванняў — каб назапасіць ежы [240, с. 284], то ў XIX стагоддзе яны пачынаюць насіць рэкрэацыйна-спартыўны і статусны характар. У паляванні бралі ўдзел нават жанчыны. На працягу разглядаемага перыяду скарачаліся памеры ловаў, чаму спрыялі неаднаразовыя разбраенні краю і паляўнічыя рэгламентацыі расійскай адміністрацыі [103, с. 72].

Скачкі былі кірмашовай забавай моладзі. Прафесійныя скачкі адбываліся ў Варшаве. Парода чыстакроўных польскіх коней разводзілася ў Сапегавых, Пацеевых, Радзівілаўскіх статках. Беларуская шляхта цаніла таксама арабскіх коней, што гадаваліся ў табунах Радзівілаў, Сангушкаў, Патоцкіх. Карысталіся вядомасцю заводы Храптовічаў, Верашчакаў, Абуховічаў, Вайніловічаў, Раецкіх, Рдултоўскіх. Значнай падзеяй для аматараў коней былі кірмашы ў Міры, Бешанковічах, Зэльве, Асвеі [180, с. 143]. У шляхецкіх дварах заводзіліся манежы, дзе займаліся вальтыжыроўкай. Аб’язджаць коней спрабавалі нават жанчыны [334, s. 64].

Калі восень і зіму заможныя людзі бавілі за мяжой імперыі або ў буйных гарадах краю, то вясну і лета праводзілі ў вясковых рэзідэнцыях [19, с. 308]. Чыноўнікі, што не мелі магчымасць пакінуць летам горад, вечарамі бавіліся рыбарствам. Гараджане спалучалі шпацыры за горадам са зборам грыбоў, арэхаў і ягад. Эпіцэнтрамі «моднага» жыцця летам рабіліся гарадскія бульвары з шынкамі і рэстарацыямі, грамадскія паркі і сады, дзе ўвечары грала музыка, а на святы ладзіліся ілюмінацыі і феерверкі. Жанчыны любілі цукерні, дзе можна было паспрабаваць шакалад, пагартаць перыёдыку [172, с. 82].

Захоўвалі папулярнасць загарадныя шпацыры. Віцябляне, напрыклад, хадзілі глядзець на захад і ўсход сонца, крыгаход [172, с. 48]. Загарадныя шпацыры ўлучалі часам і пазнавальныя мэты, кшталту збору батанічных гербарыяў. Традыцыйна шырока праводзіліся маёўкі-пікнікі — гулянні ў маляўнічых прыгарадных ваколіцах з паленнем вогнішчаў, гатаваннем юшкі. Традыцыйным часам масавага паломніцтва на прыроду з’яўляліся Зялёныя Святкі. Правядзенне таварыскіх маёвак з гульнямі ў лапту і спажываннем малака было завядзёнкай у філаматаў [332, s. 26]. Неадменным пунктам загараднага шпацыру, у выпадку мужчынскай кампаніі, з’яўляліся корчмы, дзе, да скасавання сістэмы вінных водкупаў, можна было набываць больш танны алкаголь, а таксама пагуляць на більярдзе ці ў косці. Для дробнай шляхты карчма замяняла «клуб, сойм і біржу» [146, с. 467].

Спецыфічныя формы баўлення часу мелі жанчыны. Асобную сферу жаночых забаў утваралі «работкі» — рукадзелле. Пад час зімовых вечароў шляхцянкі выраблялі штучныя кветкі, карункі, вышываныя карціны, перабіралі насенне кветак, займаліся шыццём кашуль і чапцоў для жабракоў, вырабам корпіі для параненых [334, s. 143]. Пад час паўстання 1830—1831 гадоў вышывалі вайсковыя сцягі інсургентаў, шылі паўстанцам чамаркі [56, с. 111; 108, с. 270]. Жанчыны захапляліся медыцынай, выраблялі самаробныя пластыры, настойкі, лячылі сялян ва ўласных уладаннях. Догляд і гульні з хатнімі дэкаратыўнымі жывёламі можна вылучыць у асобны від жаночых забаў.

Забавы дзяцей з дваранскага саслоўя з большага капіравалі забаўкі дарослых. Напрыклад, цацкі імітавалі зброю (шаблі, стрэльбы), коней, жаўнераў (папяровыя ці металічныя) [154, с. 265]. Хлопчыкі любілі гуляць у вайну, іх гульні капіравалі рэчаіснасць — на адным баку змагаліся літвіны (палякі), на іншым — рускія (казакі). Многія дзіцячыя групавыя гульні амаль без зменаў дайшлі да нашых часоў («сляпая бабка» ці жмуркі, хованкі, гульня ў ваўка і гусей). Яны былі распаўсюджаныя і сярод дзяцей сялянства [58]. Вядомым дзецям пачатку XIX стагоддзя быў і мяч (скручаны з ануч і абшыты скурай) — «палянт». Старасвецкай «рыцарскай» гульнёй шкаляроў езуіцкіх калегіумаў з’яўляліся пальцаты (фехтаванне кіямі, акручанымі саломай), пад

час якой адна каманда бараніла «крэпасць», а іншая яе здабывала [73, с. 266]. Брутальныя гульні былі папулярнымі і ў свецкіх школах (напрыклад, гімназісты біліся супраць ланкасцерцаў) [172, с. 81]. Гэтаксама, як і дарослыя, дзеці гулялі ў карты (хапанка, трышак, мар'яш, віст, цвік, фараон), косці, шахматы, шашкі, більярд, у «цнот — лішак» [154, с. 265]. У першай чвэрці XIX стагоддзя любімым відовішчам для дзяцей быў паказ дрэсіраваных мядзведзяў са славутай Смаргонскай акадэміі, якіх вадзілі па шляхецкіх дварах [334, s. 33]. Для дзяцей арганізоўваліся балі, маскарады. Дзеці побач з дарослымі прымалі ўдзел у святочных дэкламацыях, дабрачынных канцэртах, спектаклях, «жывых карцінах».

Формы баўлення вольнага часу мясцовым святарствам адпавядалі забавам шляхецтва. Пэўныя прадстаўнікі святарства не цураліся і такой рыцарскай забавы як паляванне [157, с. 46]. Гэта тлумачыцца тым, што значная частка каталіцкага і ўніяцкага святарства рэкрутавалася з шляхецкіх сем'яў [127, с. 127]. Дваранскі стан традыцыйна ўспрымаўся іншымі сацыяльнымі групамі як заканадаўца моды ў «мастацтве жыцця» [349, s. 10]. З другога боку, шляхецкія дзеці навучаліся ў школах, якія ўтрымлівалі каталіцкія і базыльянскі ордэны. Гэта быў яшчэ адзін канал магчымых узаемных уплываў. Праваслаўныя і ўніяцкія святары ў сваім побыце таксама выкарыстоўвалі элементы шляхецкай культуры, асабліва гэта датычыць жонак і дачок духавенства [234, с. 96].

Формы баўлення часу чыноўніцтвам і афіцэрствам, сярод якога было шмат выхадцаў з Расіі, таксама падпадалі ўплыву шляхецкіх ўзораў. Тутэйшае прывілеяванае саслоўе ўключала ў сваё кола багатыя старажытныя сем'і і магло даць расійскаму губернскаму чыноўніцтву «палажэнне і значэнне» — адчуванне рэспектабельнасці [234, с. 109]. Прадстаўнікі дадзенай часткі прывілеяванага грамадства ў абавязковым парадку ўдзельнічалі ў афіцыйных імпрэзах — парадах, казённых святкаваннях, ілюмінацыях у царскія дні, малебнах і ўрачыстых трыумфах над пераможанымі ворагамі імперыі. У Вільні і буйных гарадах краю дзейнічалі рускія салоны і клубы, якія арганізоўвалі сямейныя вечарыны, калядныя маскарады, язду на тройках [234, с. 68].

Такім чынам, характар баўлення вольнага часу прадстаўнікамі прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд падпаў трансфармацыі, што вынікала з тэндэнцыі перанясення цэнтра культурнага жыцця краю з рэзідэнцый і маёнткаў шляхецтва ў гарады [127, с. 91]. Развіццё адукацыі і прэсы спрыяла распаўсюджванню ідэй асветніцтва, а пазней — пазітывізму, з іх ідэаламі здаровага ладу жыцця, эканамічнай карысці, палітычнай мэтазгоднасці і прыматам навуковай арганізацыі грамадства. Працягвалася далейшая камерцыялізацыя і прафесіяналізацыя сферы

адпачынку. Дэмакратызацыя, складванне гарадской культуры, фарміраванне прафесійнай інтэлігенцыі можна лічыць галоўнымі тэндэнцыямі ў культурным жыцці айчыннага прывілеяванага грамадства ў разглядаемы перыяд, што адбівалася таксама на змесце і структуры вольнага часу.

## 3.3 Формы этнічнага самавызначэння і трансфармацыя саслоўнай свядомасці

Ад 1750-х гадоў і да канца панавання Напалеона, паводле высноваў англійскага этнолага Э. Сміта, доўжылася першая стадыя этнічнага ўздыму ў Еўропе [208, с. 17]. Гэта быў час нараджэння нацыянальнай ідэі, заснаванай на прынцыпе міжсаслоўнай салідарнасці (Ж.—Ж. Русо, Ё.Г. Гердэр) [43, с. 37—38]. Такім чынам, уключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі прыпала на эпоху «абуджэння народаў». Абавязковым для ідэнтычнасці нацыянальнага тыпу зрабілася ўяўленне аб ідэалагічнай радзіме — веды пра геаграфічны абшар айчыны і яе гісторыю, колькасць суайчыннікаў, наяўнасць этнагенетычнага міфа і пантэону герояў. Прыкметы гэтай інтэлектуальнай дзейнасці мы знаходзім у тэкстах В. Дуніна-Марцінкевіча. Паводле яго вызначэння, «зямля, на каторай мы радзіліс, каторую ўпраўляем сваёй працай, на каторай пахаронены косці бацькоў, дзядоў і праатцоў нашых, паветрыя, каторым мы атдыхаем, то завецца атчызна» [106, с. 8].

Для рускага франкамоўнага дваранства «адкрыццё» нацыянальнай гісторыі, па сведчанню сучаснікаў, адбылося ў 1816 годзе з выйсцем першых тамоў «Гісторыі дзяржавы Расійскай» М.М. Карамзіна [113, с. 4]. З'яўленню беларускай нацыянальнай ідэі папярэднічала «адкрыццё» беларускага этнасу, якое адбывалася пры ўдзеле палітычных і навуковых колаў суседніх народаў. Прыкладам такой дзейнасці з'яўлялася работа навуковага гуртка пад кіраўніцтвам рускага арыстакрата М.П. Румянцава, Рускага геаграфічнага таварыства, афіцэраў Генеральнага Штаба расійскай арміі, губернскіх статыстычных камітэтаў, Варшаўскага таварыства сяброў навукі [113; 90, с. 117—120]. Пад «адкрыццём» разумеецца шэраг навуковых і грамадска-палітычных прэцэдэнтаў — прызнанне моўнай самабытнасці беларускага сялянства, вызначэнне пераемнасці гісторыі беларускага народу з дзяржаўнай спадчынай полацкіх крывічаў, апазнанне канфесійнай гетэрагеннасці беларускага этнасу, геаграфічная лакалізацыя тэрміна «Беларусь», высвятленне генетычнай сувязі беларускай гутарковай мовы з мовай афіцыйнага справаводства ў ВКЛ [206, с. 65; 253, с. 342; 319; 250, с. 215; 256, с. 100; 171. 2, спр. 85, л. 1—4].

Згаданыя вышэй крокі не праводзіліся сістэмна з мэтай інспірацыі беларускага нацыянальнага руху, але зрабілі магчымым яго з'яўленне [90, с. 110]. «Адкрыццё» спрыяла аб'ектыўнаму выяўленню самабытных рысаў беларускага этнасу, і адначасова спрычынілася да канструявання дадзенай супольнасці, падзеленай на той час на саслоўныя, канфесійныя і рэгіянальныя групы, якім бракавала пачуцця агульнай тоеснасці. Найбольш

падрыхтаванымі да ўспрымання беларускай нацыянальнай ідэі з’яўляліся выхадцы з уніяцкага і праваслаўнага святарскага асяроддзя. Але пасля 1839 года ўніяцкія асяродкі былі дэзарганізаваныя, а праваслаўныя — знаходзіліся ў інтэлектуальнай стагнацыі. Сялянства Беларусі да скасавання прыгоннага права ў 1861 годзе не разглядалася як суб’ект грамадска-палітычных адносін. Прадстаўнікі дробнага шляхецтва амаль не адрозніваліся ад сялян адукаванасцю і скарбам [257, с. 97]. З боку буйнога панства рабіліся спробы запрыгоніць збяднелую шляхту, што змушала дадзеную групу да выпрацоўкі стратэгій культурнага адасаблення ад сялянства. «Разборы» шляхты, патрэба дакументальна даводзіць расійскаму ўраду правы на дваранства, таксама не спрыялі дэманстрацыі салідарнасці з непрывілеяванымі саслоўямі. Арыстакратыя, у сваю чаргу, выхоўвалася ў касмапалітычнай атмасферы і не была адпаведна шчыльна заангажаваная ў нацыянальныя рухі. Канфесійная пярэстасць, рэгіяналізм як частка свядомасці прывілеяваных груп, ідэалогія шляхецкай выключнасці — таксама стрымлівалі фарміраванне надсаслоўнай этнакультурнай беларускай ідэнтычнасці. У падобных умовах нават непаслядоўныя захады расійскай адміністрацыі па вывучэнню «Паўночна-Заходняга краю» можна разглядаць як істотную дапамогу беларускаму этнічнаму самавызначэнню.

У феадальных грамадствах пад «народам», «нацыяй» разумелася сукупнасць разнастайных груп прывілеяванага саслоўя, часта этнічна неаднастайная [218, с. 32]. Рэч Паспалітую двух народаў, як вынікае з назвы дзяржавы, складалі дзве палітычныя нацыі — прывілеяванае саслоўе Польскага каралеўства і прывілеяванае саслоўе ВКЛ. Шляхта была дзяржаватворчай «нацыяй» Рэчы Паспалітай: «права яе продкаў не прызнавала ні пана, ні мужыка, ні мешчаніна, а толькі шляхціца» [213, с. 186]. Для азначэння падатковага насельніцтва на землях колішняй Рэчы Паспалітай выкарыстоўвалася назва «люд». Паводле Ю. Бардаха, у XVIII стагоддзі прывілеяваныя грамадскія групы Рэчы Паспалітай характарызаваліся шматузроўневай ідэнтычнасцю. Першы ўзровень ахопліваў усіх прывілеяваных грамадзян Рэчы Паспалітай, якія называліся «палякамі», другі ўзровень вызначаў сярод іх «каронных» (жыхароў Польскага каралеўства) і «літвінаў» (ураджэнцаў ВКЛ). Адзін чалавек мог адначасова (сама)характарызавацца як беларус (рэгіянальнае паходжанне), русін (прыналежнасць да праваслаўнай — «рускай» канфесіі), літвін (выхадзец з тэрыторыі ВКЛ) і паляк (грамадзянін Рэчы Паспалітай, шляхціц) [280, s. 36].

Ліцвінская шляхта мела ўласную этнагенетычную міфалогію (Я. Длугаш, М. Стрыйкоўскі, М. Літвін) і падкрэслівала сваё адрозненне ад «каронікаў». Але ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай была ліквідавана

аўтаномія ВКЛ, а разам з тым і кансалідацыйны фактар у фарміраванні Natio Lithuanus — ліцвінскай шляхты, надэтнічнай прывілеяванай супольнасці, значную частку якой складалі нашчадкі «русінаў» (праваслаўнага беларуска-ўкраінскага насельніцтва ВКЛ). На працягу XIX стагоддзя літвіны былі вымушаны змяніць сваю гістарычную форму самавызначэння [243, с. 38]. У XIX стагоддзі сярод літвінаў у шырокім сэнсе пачалі вылучаць этнічных літоўцаў ці летувісаў (саманазва — «lietùvisè») і беларусаў [17, с. 34]. На пачатку XIX стагоддзя ўзнікалі праекты аднаўлення ВКЛ. Але ў здзяйсненні падобных планаў іх аўтарам бачыўся толькі прамежкавы этап перад вяртаннем польскай улады. Праект М.К. Агінскага прадугледжваў, напрыклад, увядзенне «пальшчызны» як мовы справаводства ў адноўленым ВКЛ [178].

Дзякуючы навукова-публіцыстычнай дзейнасці прадстаўнікоў Віленскага універсітэту сярод літвінскай інтэлігенцыі пашыралася гіпотэза пра прыярытэтнасць удзелу балтамоўных плямёнаў у пабудове літоўскай дзяржаўнасці. Падобныя меркаванні мелі задачу нейтралізаваць канцэпцыю расійскай гістарыяграфіі аб «рускім» характары ВКЛ. Высновы віленскіх гісторыкаў папулярызаваліся прадстаўнікамі рамантычнай плыні краёвай польскамоўнай літаратуры [164, с. 12; 166, с. 20]. Такім чынам, літвінская польскамоўная інтэлігенцыя (Т. Нарбут, І. Анацэвіч, І. Ярашэвіч) мела ўскоснае дачыненне да фарміравання ідэалогіі маладога літоўскага (жмудскага) нацыянальнага руху. Але масавага ўдзелу ў палітычных праектах літоўскага (жмудскага) абуджэння шляхецкая інтэлігенцыя не прымала, больш таго, з'яўлялася ў дачыненні да яго варожай сілай. Для літвінскай каталіцкай шляхты ўключанасць у польскамоўную супольнасць заставалася справай прэстыжу і эканамічнага разліку.

Нацыянальны літоўскі (жмудскі) праект, які нарадзіўся напачатку XIX стагоддзя, паставіў пад пытанне легітымнасць выкарыстання тэрміну «Літва» ў дачыненні да грамадска-палітычных пачынанняў польскамоўных дзеячаў [11, с. 149]. Напрыклад, лідэр літоўскага (жмудскага) этнічнага адраджэння С. Даўкантас лічыў польскамоўных шляхціцаў балцкага паходжання здраднікамі, якія заслужылі на выключэнне са складу літоўскага народа [170, с. 39]. Беларуская праваслаўная інтэлігенцыя таксама аспрэчвала правамернасць выкарыстання тэрміна «Літва» на тэрыторыях, заселеных славянамоўным насельніцтвам [190, с. 121]. Расійскі ўрад спрыяў такому развіццю падзеяў. У пяцідзесятых гадах XIX стагоддзя на ўрадавым узроўні разглядалася пытанне адмежавання жмудзінаў ад польскага ўплыву шляхам пераводу парафіяльных школ Ковенскай губерні і Ковенскай гімназіі на літоўскамоўнае навучанне. Рускія вучоныя дапамагалі даследаванню і кадыфікацыі жмудскага фальклору і балцкіх дыялектаў [170, с. 37].

На працягу разглядаемага перыяду польскамоўная літвінская інтэлігенцыя не страціла цалкам свайго значэння. Літвінскія інтэлігенты лічылі сябе нашчадкамі дзяржаўна-палітычнай традыцыі Рэчы Паспалітай, валодала польскай мовай, падзялялі каштоўнасці шляхецкай традыцыі і касцёлу, але адначасова мелі ўяўленне пра гісторыка-культурную адметнасць Літвы як рэгіёна Рэчы Паспалітай і самабытны характар народнай культуры яе аўтахтонных этнасаў. А. Кіркор так сфармуляваў сваё патрыятычнае крэда ў дыдактычным лісце да жонкі: «Я літвін, і ніколі гэта пачуццё ў ва мне не будзе знішчана. (...) Маю сэрца і адчуваю сімпатыю да Польшчы настолькі, наколькі яе лёс звязаны з нашым» [253, с. 341]. Іншы вядомы прадстаўнік ліцвінскай інтэлігенцыі Я. Чачот таксама адасабляў сябе ад этнічных палякаў [248, с. 306].

Аднак А. Кіркору належаць таксама і развагі аб прагрэсіўнай місіі польскай цывілізацыі на ўсходзе [101, с. 136]. У сваім штодзённым побыце інтэлектуалы-«літвіны» былі творцамі і спажыўцамі каштоўнасцяў польскай культуры. Тэрмін «Рэч Паспалітая» ўспрымалася шляхецтвам як сінонім Польшчы. Гістарычны лёс былых зямель ВКЛ бачыўся ім непарыўна злітаваным з польскай дзяржаўнасцю. У паэме А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш», напрыклад, тэрмін «літвін» — азначэнне такога ж парадку, што і «мазур» — гісторыка-этнаграфічнае [165]. Літвіны, мазуры і яўрэі ў паэме А. Міцкевіча называюцца адначасова палякамі, гэта значыць ураджэнцамі, а перад усім патрыётамі Рэчы Паспалітай [266, с. 178].

Прычыны аслаблення нацыянальнага імунітэту літвінаў у дачыненні да польскай культуры вынікаюць з папярэдняга гістарычнага перыяду. Носьбіты літвінскай — пераважна каталіцкай — шляхецкай ідэнтычнасці ў адрозненні ад русінскай праваслаўнай арыстакратыі і мяшчанства былі лепш інтэграванымі ў грамадска-палітычныя інстытуты Рэчы Паспалітай і больш падпадалі рацыям рэчпаспалітаўскага патрыятызму. Паланізацыі няпольскай шляхты дапамагло і распаўсюджанне сармацкай тэорыі [243, с. 40]. Сармацкая ідэалогія была заклікана абгрунтаваць прэтэнзіі каталіцкага шляхецтва на дамінуючую палітычную пазіцыю ў краіне. У сармацкай этнагенетычнай дактрыне ўклад праваслаўнай арыстакратыі і мяшчанства ў дзяржаўным будаўніцтве ВКЛ ігнараваўся, гісторыя фарміравання Княства фальсіфікавалася. Канчатковыя змены ў этнакультурнай арыентацыі мясцовых эліт — пераход да польскага рэгіяналізму (яго формула: «gente Lithuanus, natione Polonus» — «па паходжанню літвін, па нацыянальнасці паляк») — адбыліся ў выніку войнаў сярэдзіны XVII стагоддзя. Шляхецтва скарыстала крызісны момант у дзяржаве для барацьбы з магнатэрыяй ВКЛ за пашырэнне ўласных прывілеяў. Хаўруснікамі шляхецтва з’яўляліся польскія ўладныя колы і касцёл.

Разрыў паміж польскім выхаваннем і палітычнымі амбіцыямі на асобную ад «кароннікаў» кіруючую ролю ў «літоўска-рускім» краі — з’яўляўся невырашальнай дылемай для ліцвінскіх дзеячаў першай паловы XIX стагоддзя. Іх пазіцыя ўспрымалася вялікапольскімі патрыётамі як сепаратызм. Напярэдадні вызвалення сялянства ад прыгону адбывалася пэўная дэмакратызацыя грамадскай свядомасці і актывізацыя маладых нацыянальных рухаў. Перад літоўскай каталіцкай шляхецкай інтэлігенцыяй паўстала пытанне выбару: цалкам — палітычна і культурна — зліцца з польскім ці рускім этнасам або далучыцца да «мужыцкіх» нацыянальных рухаў. Зварот часткі ліцвінскай каталіцкай шляхецкай інтэлігенцыі да беларускага пытання (Я. Чачот, Р. Падбярэскі, У. Сыракомля, В. Каратынскі, В. Дунін-Марцінкевіч, К. Каліноўскі, Ф. Багушэвіч) паспрыяў пераходу беларускай рэгіянальнай ідэнтычнасці на новы агульнанацыянальны ўзровень і пашырэнню тэрміна «Беларусь» на ўсю тэрыторыю пражывання славянамоўнага («літоўска-рускага») сялянства. Але прадстаўнікоў шляхецкай інтэлігенцыі на ніве беларускай культуры было мала. Пераважная частка ліцвінскага каталіцкага шляхецтва абрала рацыі польскай культуры. Пошукі «трэцяга шляху» — больш познія надэтнічныя праекты ліцвінскай каталіцкай шляхецкай інтэлігенцыі, напрыклад, ідэалогія краёўцаў, аб’ектыўна служылі праваднікамі польскага ўплыву ў Беларусі [206, с. 118].

Спыненне развіцця шляхецкай ліцвінскай культуры айчынныя даследчыкі адносяць да сярэдзіны XIX стагоддзя. Надалей рэлікты ліцвінскай культуры лакалізуюцца ў межах шляхецкіх маёнткаў [50, с. 68]. Прыспешыла дадзены працэс няўдалае шляхецкае паўстанне 1830—1831 гадоў. У выніку апошняга расійскі ўрад пачаў захады па адасабленню беларускага сялянства ад уплыву каталіцкага дваранства. У дадзеным рэчышчы праводзілася інвентарызацыя маёнткаў, ліквідацыя ў 1839 годзе грэка-каталіцкай царквы і, урэшце, адмена прыгону ў 1861 годзе з правам для беларускага сялянства на выкуп зямлі за дзяржаўны крэдыт. Заняпаду ліцвінскай шляхецкай культуры паспрыялі таксама скасаванне дзеяння III Статута ВКЛ (1831, 1840), закрыццё Віленскага універсітэта (1832), Віленскіх Медыка-хірургічнай і Духоўнай рымска-каталіцкай акадэмій (1842), а таксама большасці школ, што ўтрымлівала каталіцкае святарства.

У грамадскай свядомасці імя «Літва», якое некалі абазначала ўсе землі, што ўваходзілі ў склад ВКЛ, пачала рэдукавацца да назвы гісторыка-культурнага рэгіёну. Месцазнаходжанне «Літвы» У. Сыракомля вызначыў наступным чынам: «старая мяжа Літвы... хоць і страціла сваё палітычнае значэнне, не пераставала, аднак, існаваць, бо ў польскія часы стала мяжой Наваградскага і Мінскага ваяводстваў, у нашы ж часы аддзяляла Гродзенскую

губерню ад Мінскай, а сёння падзяляе Мінскі і Наваградскі паветы» [213, с. 179]. Этнонім «літвіны» ў дачыненні да славянамоўнага насельніцтва пераважаў у Гродзенскім, Ваўкавыскім, Слонімскім і часткова Слуцкім паветах. Этнонім «беларусы» ў найбольшай ступені быў распаўсюджаны ў Віцебскім, Дзісенскім, Лепельскім і Полацкім паветах Віцебскай і ў Магілёўскай губернях [218, с. 83]. Пасля 1860-х гадоў тэрміны «літвіны», «літоўцы» ў дачыненні да беларусаў Мінскай, Віленскай і Гродзенскай губерняў цалкам знікаюць з афіцыйных дакументаў [218, с. 79]. Разам з крызісам ліцвінскай ідэнтычнасці на працягу разглядаемага перыяду надыходзіць маргіналізацыя сармацкай ідэалогіі. З міфалагемы сарматызма працягвалі карыстацца інтэлектуальна малакваліфікаваныя колы шляхецкай інтэлігенцыі. У кнігах Т. Нарбута, творчасці дробнашляхецкіх літаратараў-рамантыкаў сармацкія вобразы трансфарміраваліся ў метафару «залатога веку» Рэчы Паспалітай [328, s. 1].

Такім чынам, тэрмін «літвіны» («літоўцы») з’яўляўся не толькі беларуска-летувіскім палітонімам пад час існавання ВКЛ, але — і адным з беларуска-жмудскіх субэтнонімаў першай паловы XIX стагоддзя, што адыграў пэўную ролю ў этнагенезе абодвух народаў. Аднак праявы шляхецкага «літоўскага сепаратызму» ў разглядаемы перыяд у адносінах да палітычнага дамінавання польскай Кароны нельга разглядаць у якасці вытокаў беларускага нацыянальнага руху [137, с. 9].

Як сінонім паняцця «шляхціц» у Рэчы Паспалітай ужывалася азначэнне «паляк». Дэфініцыя «паляк» утрымлівала ў дачыненні да беларускай шляхты пад час існавання Рэчы Паспалітай палітыка-дзяржаўны і саслоўна-канфесійны змест. Са стратаю суверэнітэту Рэчы Паспалітай у шляхецкім асяроддзі ўзнікае настальгічнае ўспрыманне сімвалаў гэтай дзяржавы, пашыраўся рэчпаспалітаўскі патрыятызм, і тэрмін «паляк» пачаў больш актыўна ўжывацца як саманазва шляхтай Беларусі [41, с. 340—341]. Але большасць шляхціцаў была нашчадкамі карэннага насельніцтва і працягвала захоўваць культурную і моўную беларускую спецыфіку [218, с. 90]. У канцы XVIII — пачатку XIX стагоддзяў асвечанымі прадстаўнікамі польскай арыстакратыі і інтэлігенцыі (А. Чартарыйскі, А. Замойскі, Т. Чацкі, Я. Снядэцкі) ставіцца задача мацавання этнакультурнай польскай ідэнтычнасці сярод беларуска-літоўскай шляхты і мяшчанства, фактычна — іх культурнай асіміляцыі [245, с. 312]. Гэтай патрэбе служылі рэфарміраваная сістэма адукацыі, перадусім дзейнасць школ Віленскай навучальнай акругі і Віленскага універсітэту, касцёл, польскамоўныя тэатр і прэса. Лаяльнае стаўленне расійскіх манархаў Паўла I і Аляксандра I дапамагала польскай эліце праводзіць палітыку паланізацыі беларуска-літоўскага шляхецтва [346,

s. 70; 106, с. 28; 23, с. 322—324]. Да шляхецкага паўстання 1830—1831 гадоў адносіны царскай улады ў дачыненні да нацыянальнага пытання ў Беларусі заставаліся індыферэнтнымі. Напрыклад, да 10 лютага 1831 года ва ўрадавай перапісцы магла ўжывацца польская мова, да 1834 года яна скарыстоўвалася пры навучанні ў вучылішчах і гімназіях Беларусі. Асабліва інтэнсіўна дэфармацыя ідэнтычнасці беларускай шляхты ў польскім этнакультурным кірунку адбывалася на эміграцыі [230, с. 66]. Прыкладам можа служыць постаць А. Рыпінскага (1811—1886), ураджэнца Падзвіння, аўтара работы «Białoruś. Kilka słów o poezii prostego ludu téj naszéj polskiéj prowincii; o jego muzyce, śpiéwie, tańcach, etc» (1840). Дадзеная кніга, напісаная А. Рыпінскім за мяжой, вядомая, у прыватнасці, заклікам аўтара да беларусак не даваць дзецям ежу пакуль тыя не папросяць яе па-польску [336, s. 10—11]. Пасля вяртання на Бацькаўшчыну прапольская экзальтацыя А. Рыпінскага лагаднее. «Можа дарэмна мы горнемся да гэтай няшчаснай Польшчы», — піша ён у больш познія гады [197, с. 176]. Падобная змена этнічнай свядомасці магла адбывацца на працягу жыцця аднаго чалавека неаднойчы, што, паводле П. Церашковіча, не з’яўляецца незвычайным для пачатковых перыядаў развіцця нацыянальных рухаў [218, с. 72—73]. Першая генерацыя культурных дзеячаў нацыянальнага тыпу прыходзіла да беларускасці (або польскасці) у выніку рэфлексіі. На працягу жыцця яны маглі некалькі разоў змяняць вызначэнне сваёй этнічнай прыналежнасці [163, с. 146; 17, с. 76].

Працэс нацыянальнага самавызначэння закрануў у разглядаемы перыяд перадусім шляхецкую інтэлігенцыю, фарміраванне ідэнтычнасці якой зазнала ідэалагічны ўплыў сталічных універсітэцкіх асяродкаў, грамадска-культурных салонаў Вільні, Варшавы, Санкт-Пецярбурга, Масквы, эміграцыйных гурткоў, таемных таварystваў. Кансерватары працягвалі і надалей укладаць у тэрмін «паляк» надэтнічны — саслоўны ці канфесійны — змест. Ідэнтычнасць падобнага кшталту можна вызначыць тэрмінам «тутэйшы». У пэўных асяродках беларускай шляхты «тутэйшасць» як форма гістарычнай свядомасці, што прадугледжвала суіснаванне разнародных этнічных элементаў, была апазіцыяй польскай і велікарускай нацыянальным ідэнтычнасцям [17, с. 152]. Пэўныя аналогіі з беларускай тутэйшасцю можна знайсці ў настроях славянафільскага маскоўскага гуртку канца саракавых — пачатку пяцідзесятых гадоў XIX стагоддзя. Маскоўскія славянафілы называлі сябе «туземниками» і тым супрацьпастаўлялі сваё разуменне этнічнага заходнееўрапейскім мадэлям мадэрнай нацыі [121, с. 147].

Шляхта Беларусі ў сваёй масе валодала беларускай (русінскай) і польскай мовамі. У разглядаемы перыяд «пальшчызна» заставалася мовай друкарскага варштату, адукацыі, касцёла, справаводства. На працягу XIX

стагоддзя пры разнастайных апытаннях рэгістраваліся выпадкі называння польскай мовы «панскай». У асяроддзі дробнага шляхецтва польская мова выконвала такую ж функцыю прэстыжна-статуснага адрозніка, як французская мова для арыстакратыі. Дробны шляхціц звычайна не ўмеў чытаць і пісаць, але ў сваю беларускую гаворку абавязкова дамешваў колькі польскіх і лацінскіх словаў, каб давесці сваю шляхецкасць [336, s. 201]. Для дробнай шляхты знаёмства з літаратурнай польскай мовай абмяжоўвалася слуханнем касцельных казанняў і чытаннем календара [213, с. 304]. Як вынік, ступень валодання польскай мовай заставалася нізкай. Польская мова беларускай шляхты выклікала ў этнічных палякаў здзіўленне, як гэта адбываецца, напрыклад, з каментатарамі творчасці А. Міцкевіча. «Мова, якую ўжываў Міцкевіч не толькі ў штодзённым жыцці і ў лістах, але і ў паэзіі, не была моваю ва ўсіх яе асаблівасцях спрадвечна польскаю, а была моваю правінцыйнаю», — піша польскі даследчык спадчыны А. Міцкевіча Г. Корбут, — «каб добра зразумець мову Міцкевіча... належыць, перадусім, даследаваць гутарковую мову палякаў, якія жылі на беларускіх і літоўскіх абшарах у часы Міцкевіча» [115]. Пра наяўнасць вялікай колькасці беларускай лексікі — «дыялектызмаў, правінцыялізмаў і перыферычных архаізмаў» — гаворыцца і ў дачыненні да творчай спадчыны У. Сыракомлі [235, с. 11]. У гэтым звязку слушным выглядае меркаванне пра наяўнасць «асаблівага варыянта польскай мовы» [230, с. 6], які склаўся ў побытавай камунікацыі беларускай шляхты ў выніку «ўзаемадзеяння розных моў пры засваенні польскай мовы як другаснай» [128, с. 19].

Падтрымка рэчпаспалітаўскага вызваленчага руху сярод шляхецкага грамадства Беларусі мела непаслядоўны характар. Прахалодныя адносіны «да польскай справы», няведанне польскай мовы больш выразна выяўляліся ў Віцебскай і Магілёўскай губернях [218, с. 138]. А. Рыпінскі ў характарыстыцы грамадзянскай пазіцыі дробнага ўсходнебеларускага шляхецтва выказваўся ў тым духу, што беларускага чыншавага шляхціца мала абыходзіць лёс Рэчы Паспалітай [335, s. 200]. Падобны стэрэатып быў дастаткова распаўсюджаны, каб трапіць на старонкі тагачасных літаратурных твораў [73, с. 218]. Удзел беларускай шляхты ў шэрагах напалеонаўскага войску быў мізэрным [5, с. 29—30; 40, с. 420; 254, с. 104]. Паўстанне 1830—1831 гадоў яшчэ больш вызначыла светапоглядное расслаенне ў шляхецкім асяроддзі, — выявіўся новы тып краёвага патрыятызма, у аснове якога замест абароны традыцыйных шляхецкіх вольнасцяў паўсталі ідэя эвалюцыйнага культурнага і эканамічнага развіцця краю. Палітычны радыкалізм на беларускіх землях экспартаваўся і падтрымліваўся высілкамі нацыяналістычных колаў Польскага каралеўства, што ставіла пад удар урадавага пераследу мясцовае насельніцтва [209, с. 102; 226, с. 11]. І пасля падаўлення паўстання 1830—1831 гадоў дзейнасць эмісараў

польскай эміграцыі («экспедыцыя Ю. Заліўскага» (1833), змовы Ш. Канарскага (1835—1839), К. Алендскага (1840), Я. Рэра (1845—1846)) правакавала царызм на рэпрэсіі, што, з аднаго боку, стрымлівала фарміраванне беларускай самасвядомасці, з другога, «стыгматызавала» беларускае каталіцкае шляхецкае грамадства і тым прыспешвала працэс яго паланізацыі. Удзел каталіцкага святарства ў антырасійскіх змовах спрыяў таму, што галоўным крытэрыям «нядобранадзейнасці» мясцовага дваранства ў вачах прадстаўнікоў расійскай адміністрацыі зрабілася канфесійная прыналежнасць. Пасля паражэння шляхецкага паўстання 1830—1831 гадоў і выцяснення польскай мовы з афіцыйнага справаводства касцёл робіцца асноўным апірышчам паланізацыі ў Беларусі [346, s. 74]. Беларускія шляхціы-каталікі ў 30—60-ыя гады XIX стагоддзя ў афіцыйных дакументах кваліфікаваліся як «палякі», што таксама спрыяла іх паланізацыі.

Беларускі гісторык З. Шыбека вылучае тры этапы развіцця рэчпаспалітаўскага («польскага») патрыятызму на землях былога ВКЛ. Найбольшую падтрымку ідэі адраджэння Рэчы Паспалітай мелі сярод беларускай шляхты ў 1795—1830 гадах. У 1831—1863 гады падтрымка «польскага руху» мясцовай шляхтай пачынае зніжацца. Канчаткова маргіналізуецца гэтая ідэя пасля паражэння паўстання 1863—1864 гадоў [258]. Паводле высноваў А. Смаленчука, паняцце «паляк» да трыццатых гадоў XIX стагоддзя ўтрымлівала саслоўна-палітычны сэнс, у трыццатыя—шасцідзесятыя — пачало набываць культурна-канфесійнае значэнне, і толькі пасля паўстання 1863—1864 гадоў атрымала ў Беларусі ў дачыненні да каталіцкага дваранства ўласна нацыянальны змест [206, с. 122]. Такім чынам, сучасныя беларускія даследчыкі прыходзяць да парадаксальнай высновы: ад пачатку XIX стагоддзя да шасцідзесятых гадоў у Беларусі сярод прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя памяншаецца палітычная падтрымка ідэі аднаўлення Рэчы Паспалітай і адначасова мацуецца этнакультурная польская свядомасць. Дадзеную супярэчнасць можна растлумачыць працэсам станаўлення буржуазных адносін і распаўсюджваннем ідэалогіі пазітывізму. На змену змоўшчыку-інсургенту прыходзіць новы тып шляхецкага дзеяча — асветнік-інтэлігент.

Напачатку XIX стагоддзя польскія і велікарускія інтэлектуальныя колы пачалі ўсведамляць этнакультурную адметнасць беларусаў, але яшчэ адсутнічала ўстойлівая тэрміналагічная традыцыя, якая б дазваляла пазначаць беларускую этнічную прыналежнасць. Напрыклад, А. Міцкевіч называў беларускую мову «русінскай або літоўска-русінскай», Я. Чачот — «славяна-крывіцкай» [250, с. 215]. У трыццатых гадах XIX стагоддзя адбываецца грамадскае абмеркаванне, у выніку якога мова сялянства (як праваслаўнага,

так і каталіцкага) «Паўночна-Заходняга краю» апазнаецца як беларуская [230, с. 17]. Беларускай прызнаецца таксама мова, на якой ствараліся дакументы ў канцылярыі вялікіх князёў літоўскіх [216, с. 492]. У саракавых гадах XIX стагоддзя межы Беларусі акрэсліваюць яшчэ толькі тэрыторыяй Віцебскай і Магілёўскай губерняў [176, с. 250]. Але ў канцы XIX стагоддзя геаграфічная лакалізацыя тэрміна «Беларусь» значна пашыраецца на захад [66, с. 20]. Прычыну паступовай экспансіі гэтага першапачаткова рэгіянальнага вызначэння на астатнюю этнічную тэрыторыю пражывання беларусаў айчынны этнолаг М.Ф. Піліпенка тлумачыць тым, што з уваходжаннем беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі і развіццём украінскага нацыянальнага руху з'явілася неабходнасць адрознення беларусаў ад украінцаў, якія мелі ў ВКЛ агульнае азначэнне «русіны», а таксама ад велікарусаў і балтамоўных літоўцаў. Колішнія тэрміны «літвіны» і «русіны» не давалі такой універсальнай магчымасці [182, с. 73].

Логіка змагання польскай і велікарускай нацыянальных ідэй змушала варагуючыя бакі апеляваць да беларускага сялянства [15, с. 21]. У падмурку «беларускага» і «літоўскага» урадавых праектаў знаходзілася ідэя ўмацавання этнічнасці гэтых супольнасцяў, пазбаўленых уласнай эліты і лаяльных уладзе, як супрацьвага польскім уплывам. Для памяркоўных дзеячаў царскай адміністрацыі (П. Шырынскі-Шахматаў, А. Сямёнаў, У. Назімаў) мацаванне «беларускасці» бачылася прамежкавым этапам на шляху далейшай асіміляцыі беларусаў. П. Церашковіч указвае на рызыкоўнасць падобнай палітыкі. З аднаго боку, яна замінала фарміраванню моцнага нацыянальнага руху, з другога — сама «канструявала» беларускасць [218, с. 140]. Этнаграфічныя экспедыцыі і навуковыя публікацыі па беларусістыцы, санкцыянаваныя Санкт-Пецярбургам, з аднаго боку, пракламацыі і «гутаркі» на беларускай мове, ствараемыя польскімі рэвалюцыянерамі, з другога боку, ускосна мацавалі беларускую ідэнтычнасць, спрыялі працэсу этнічнага самавызначэння беларусаў.

Традыцыйна імперская ідэалогія засноўвалася на ідэі дынастычнай вернасці. Прывілеяваныя групы з новадалучаных тэрыторый, калі яны выяўлялі лаяльнасць манарху, дапускаліся да кіраўніцтва імперыяй. Іх традыцыі не падпадалі гвалтоўнай уніфікацыі. Пасля няўдалага шляхецкага паўстання 1830—1831 гадоў расійскі ўрад змяніў падобную стратэгію ў дачыненні да каталіцкага дваранства і ўзяў курс на культурную уніфікацыю «Паўночна-Заходняга краю». Гэта адпавядала і агульнарасійскім этнічным працэсам — у сярэдзіне XIX стагоддзя імперская ідэнтычнасць пачала саступаць месца нацыянальнай велікарускай ідэнтычнасці [206, с. 55].

Расійская ўнутраная палітыка фарміравалася пад уплывам антаганістычных інтарэсаў розных груп арыстакратыі, што прыводзіла да адміністрацыйнай непаслядоўнасці. Пры Кацярыне II да Беларусі ставіліся як да рускіх зямель. Для паўлаўска-аляксандраўскага перыяду былі характэрныя паланафільскія тэндэнцыі. Палітыку уніфікацыі праводзіў Мікалай I. Аляксандр II зноў зрабіў палёгку для «польскай справы» [253, с. 347]. Але пры ўсіх разыходжаннях у тактыцы існаваў пэўны кансенсус, што датычыўся стратэгічнага бачання будучыні «securityнабытых» зямель. «Тут была некалі Русь — і будзе з часам» — з'яўлялася дэвізам расійскай нацыянальнай палітыкі ў Беларусі [39, с. 76].

1794—1863 гады беларускі даследчык В. Швед характарызуе як падрыхтоўчы перыяд выяўлення беларускай нацыянальнай ідэі. У гэты час праходзіла паэтапная кансалідацыя беларускай нацыі — першапачаткова на падставе лакальных супольнасцяў («літвіны» ў Панямонні і «беларусы» ў Падзвінні і Падняпроўі) [253, с. 346]. С. Куль-Сяльверстава, у сваю чаргу, вылучае «ліцвінскую» і «заходнерускую» традыцыі, у межах якіх на працягу XIX стагоддзя адбывалася «беларускае культурнае накапленне» [127, с. 74]. Фарміраванню беларускай нацыянальнай ідэі спадарожнічала пераасэнсаванне ролі мовы ў этнічным самавызначэнні. На працягу разглядаемага перыяду захоўвалася перавага саслоўнай і канфесійнай самасвядомасці над этнічнай [218, с. 83]. Але паступова павялічвалася разуменне месца мовы ў этнічнай самаідэнтыфікацыі. З сярэдзіны XIX стагоддзя афіцыйныя расійскія колы пачынаюць адносіць беларускамоўных сялян-каталікоў да беларусаў. У «беларускіх» уездах Віленскай губерні склад беларусаў-каталікоў даходзіла да 52%, а ў Магілёўскай — да 2,2% [218, с. 83]. Заслуга ў асэнсаванні дадзенага факта належыць перадусім прадстаўнікам мясцовай праваслаўнай інтэлігенцыі [253, с. 342].

Этнічная эмансіпацыя беларусаў часта адбывалася ў студэнцкіх асяродках пад час навучання ў велікарускіх універсітэтах [108, с. 9]. Каб паўстаць, беларуская ідэнтычнасць павінна была адасобіцца ад усяго, што замінала ўсведамленню ўласных нацыянальных інтарэсаў. У Беларусі зрабіць гэта было цяжка, а на эміграцыі польскі нацыянальна-вызваленчы рух цалкам нейтралізаваў нараджэнне беларускага сепаратызму [230, с. 64]. Праваслаўная шляхта ў сваёй масе адыходзіла ад палітычнай падтрымкі ідэй адраджэння Рэчы Паспалітай, але захоўвала мясцовую культурную спецыфіку, якая вылучала яе сярод велікарусаў. Такім чынам, мясцовая праваслаўная інтэлігенцыя, што цярпела і ад экзальтаваных праяў рэчпаспалітаўскага патрыятызму, і ад падазронасці расійскай адміністрацыі, рабілася патэнцыйным рэзервам беларускага культурнага руху [234, с. 54].

Шэраг сучасных айчынных даследаванняў указвае на пэўную ролю полацкіх езуітаў у фарміраванні беларускай ідэнтычнасці [206, с. 50—52; 11]. Апошнія называлі сябе беларускімі езуітамі, і запісвалі сваіх шкаляроў беларусамі. Дапускаецца магчымасць уплыву езуітаў на фарміраванне беларускай ідэнтычнасці і праз адукацыйную дзейнасць у асяроддзе грэка-каталікоў. Такая актыўнасць, накіраваная ў першую чаргу на ізаляцыю мясцовага насельніцтва ад польскага ўплыву, была пэўнай формай удзячнасці езуітаў Кацярыне II за прэферэнцыі Ордэну ў Расійскай імперыі [264, с. 26].

У першай палове XIX стагоддзя да творчасці на беларускай мове звяртаюцца прадстаўнікі каталіцкай шляхецкай інтэлігенцыі. А. Пыпін характарызаваў іх свядомасць наступным чынам: «гэты патрыятызм быў «беларускі», але сутнасць яго была польская» [190, с. 87]. Ф. Турук разглядаў беларускамоўную творчасць Я. Чачота, А. Вярыгі-Дарэўскага, А. Рыпінскага як спробу пашырэння польскай прапаганды сярод беларускага сялянства [222, с. 8].

Але ёсць сведчанні таго, што шляхецкая і разначынная інтэлігенцыя першай паловы XIX стагоддзя была заангажаваная ў беларускім культурным руху не толькі інтэлектуальна, але і эмацыйна. Так, Я. Баршчэўскага сучаснікі характарызавалі як шчырага адданага беларуса [176, с. 70]. В. Дунін-Марцінкевіч прычыну сваёй творчасці на беларускай мове тлумачыў тым, што жывучы сярод народа, які гаворыць на беларускай мове, адчуваў сваё падабенства, пародненасць і повязь з ім [106, с. 10—12]. Падобныя думкі выказваў і П. Шпілеўскі [256, с. 38]. Адной з першых прэзентацый Беларусі ў польскамоўнай літаратуры XIX стагоддзя з’яўляецца творчасць Я. Баршчэўскага [230, с. 10]. Беларускі патрыятызм Я. Баршчэўскага, калі зважаць на небагаты беларускі літаратурны кантэкст эпохі, здаецца беспрэцэдэнтным. Але яго творчасць з’яўлялася наследаваннем традыцыйных рэгіянальных замілаванняў краёвай шляхты, а таксама культурнай фронды ў асяроддзі тутэйшай праваслаўнай і грэка-каталіцкай інтэлігенцыі, у коле якой не забываліся на высокую пісьмовую культуру русінаў і дзяржаўную спадчыну крывічоў [136, с. 9—10; 232, с. 14; 230, с. 12]. Крытыкуючы мясцовую арыстакратыю, пісьменнік супрацьпастаўляе сармацкаму кансерватызму беларускі традыцыяналізм, які гераізуе і легітымізуе спасылкамі на крывіцкую архаіку [19, с. 89].

Такім чынам, свядомасць прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд зрабілася полем змагання польскай і рускай нацыянальных ідэй. «Ліцвінскасць» польскамоўнай шляхецкай інтэлігенцыі, як пераходная культурная ідэнтычнасць, не здолела спарадзіць нацыянальны рух з прычыны псіхалагічнай непадрыхтаванасці мясцовай шляхты да

салідарызацыі з народнай этнакультурнай традыцыяй (беларускай ці жмудскай) [11, с. 148]. Вырашальнымі ў пашырэнні беларускай нацыянальнай свядомасці былі ўнутраныя фактары. Беларускі нацыянальны праект быў спраецыраваны на гістарычную славянскую спадчыну часоў Полацкага княства і скарыстоўваў з постуніяцкага інтэлектуальнага рэсурсу, які з'яўляўся сінтэзам каталіцкіх і праваслаўных элементаў, што абумовіла большую канкурэнтаздольнасць беларускай ідэі ў дачыненні да літвінскасці шляхецкай інтэлігенцыі — монаканфесійнай ідэалогіі, якая апелявала да вузкасаслоўных каштоўнасцяў. «Беларуская» свядомасць тутэйшага прывілеяванага саслоўя ў разглядаемы перыяд была далёкай ад сучаснай нацыянальнай свядомасці. Але беларуская ідэя развівалася на працягу XIX стагоддзя ў асяроддзі менавіта прывілеяванага саслоўя. 65 тысяч беларускамоўных дваран (43,3 % ад агульнага складу шляхты), паводле рэканструкцыі П. Церашковіча на падставе перапісу 1897 года [77, с. 35], важкі аргумент, каб разглядаць генезіс гэтай прывілеяванай групы як складнік этнічнай гісторыі беларусаў.

***

Пераасэнсаванне саслоўных каштоўнасцяў і стэрэатыпаў, ролі шляхецтва і каталіцкага духавенства ў жыцці краю, абумоўленае ўключэннем беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі, а таксама агульнаеўрапейскія працэсы секулярызацыі і дэмакратызацыі культуры, закранула некалькі пакаленняў мясцовага набілітэта. Паказальным узорам саслоўнай рэфлексіі эпохі з'яўляецца творчасць гадаванца Полацкага езуіцкага калегіума Я. Баршчэўскага, празаічныя творы якога адрасаваліся ніжэйшаму дваранству Беларусі [19]. Можна вылучыць некалькі кампанентаў ідэалагічнага зместу твораў Я. Баршчэўскага: гэта крытыка сацыяльна-культурнай спадчыны эпохі шляхецкай анархіі; прапанова этычна арыентаванага эканамічнага дзеяння для ніжэйшага дваранства, заснаванага на дбайным выкарыстанні мясцовых рэсурсаў; фармуліраванне грамадскага ідэалу, што грунтаваўся на беларускім краёвым патрыятызме і апеляваў да традыцыйнай народнай этыкі; урэшце, культываванне і сакралізацыя назвы «Беларусь». У творчасці Я. Баршчэўскага выяўлялася тэндэнцыя светапогляднага збліжэння часткі дробнашляхецкай грамады і беларускага сялянства, ствараліся ідэйныя падмуркі надсаслоўнай беларускай нацыянальнай ідэі [19, с. 98].

Героя-шляхціца твораў Я. Баршчэўскага можна ахарактарызаваць як «чалавека сумлення». Дзе б не фарміравалася грамадская думка (у карчме ці ў касцёле) і што б не ляжала ў яе аснове (хрысціянская мараль ці суседская зайздрасць), небагаты шляхціц мусіў прытрымлівацца кампрамісу з

меркаваннямі грамады. Яго паводзіны рэгуляваліся не толькі грамадскай думкай набілітэту, але — і ніжэйшых саслоўяў. Значнай часткай свайго дабрабыту ён быў абавязаны цывільнай службе ў прыватных асобаў, гэта значыць добрым рэкамендацыям: «зарабляй на кавалак хлеба і будзь пачцівы: усемагутнасць Божая цябе не пакіне; любі бліжніх і жыві ў згодзе з людзьмі. А як непрыемнасці цябе спаткаюць у жыцці — трывай. Будзеш служыць — будзь верны і працавіты» [19, с. 199].

Адрознае бачанне айчыннага грамадства паўстае ў творах сучасніка Я. Баршчэўскага паэта-філамата А. Міцкевіча. Паэма апошняга «Пан Тадэвуш» — гімн аднаму саслоўю — мілітарнай арыстакратыі. На старонках паэмы няманіводнага выразнага сялянскага вобразу [263, с. 286]. Беларускі край паўстае ў паэме А. Міцкевіча канфедэрацыяй шляхецкіх маёнткаў, аточаных сацыяльна чужым асяроддзем, у лясным некранутым цывілізацыяй краі, дзе, як прыдатак пейзажу, зрэдку сустракаецца «селянін-іншаверац». Да сялянства, як элементу пейзажу, шляхціц можа мець сантыменты, але для носьбітаў саслоўнай сармацкай ідэнтычнасці непамысна шукаць свае этнічныя вытокі ў вёсцы [165, с. 329].

Культура маёнткаў і засценкаў, пра што сведчылі і творы А. Міцкевіча, на працягу першай паловы XIX стагоддзя працягвала кансервавацца. Землеўладальнікі засяроджваліся ў сферы таварыскіх забаў, суседскіх чутак і каляпалітычных фантазій. Сармацкі рыцарскі ідэал, страціўшы сваю функцыянальнасць, працягваў культывавацца ў рамантычных колах дробнашляхецкай інтэлігенцыі, дзе яму надавалася этычнае і эстэтычнае значэнне. Гэты ідэал набываў настальгічны рэтраспектыўны характар, існуючая рэчаіснасць не прымалася яго носьбітамі, адзнака высакароднай якасці бачылася ім у даўніне.

У прывілеяваным грамадстве Беларусі ў разглядаемы перыяд існаваў попыт на міф «залатога веку» — пра «прыгожыя ўчынкі і пабожныя справы дзядоў». Дадзеную сацыяльную замову выконвалі не толькі літаратары, але і гісторыкі, якія міфалагізавалі мінулае Рэчы Паспалітай [106, с. 14—22]. Прапагандаваўся тэзіс пра ўнікальны характар палітычнай сістэмы Рэчы Паспалітай. Галоўным яе здабыткам лічылася палітычная свабода, якой карысталіся грамадзяне шляхецкай дзяржавы. Апошняй супрацьпастаўляліся дэспатычныя рэжымы ў суседніх краінах. Аднак не ўдакладняўся саслоўны характар рэчпаспалітаўскай дэмакратыі. На стыку сеймікавых традыцый і застольнай тоставай практыкі сфарміравалася любоў шляхецтва да патрыятычнай фразы [39, с. 62]. Шляхціц-патрыёт паўставаў перадусім абаронцам інтарэсаў шляхецкага саслоўя — «залатой вольнасці», сістэмы шляхецкіх прывілеяў. Атаясамленне саслоўных інтарэсаў з нацыянальнымі —

выразная рыса шляхецкай ментальнасці. Вобраз Айчыны асацыіраваўся ў шляхціца з правам, юрыдычным парадкам, што гарантаваў шляхце яе выключны сацыяльны статус. Шляхецкаму саслоўю ўласціва адчуванне ўнікальнасці сваёй місіі — быць абаронцамі і распаўсюджвальнікамі заходніх хрысціянскіх каштоўнасцяў. Значную ролю ў фарміраванні ўяўленняў аб шляхецкім ідэале захоўвалі рэмінісцэнцыі з біблейскай гісторыі, твораў антычных аўтараў.

Ідэальны вобраз беларускага шляхціца, які ствараўся высілкамі публіцыстаў, літаратараў, святарства, уключаў як маральныя, так інтэлектуальныя і фізічныя якасці. У іх ліку падкрэслівалі фізічны спрыт і жывы розум, злучэнне якіх, паводле ўпэўненасці сучаснікаў, вылучала шляхту сярод іншых славянскіх тыпаў і набліжала яе да французаў і італьянцаў. Меркавалася, што ўніверсальнасць і differentlyразнабаковасць талентаў шляхціца рабілі яго аднолькава прыдатным для заняткаў земляробчых, вайсковых, мастацкіх, а таксама адміністрацыйных і навуковых. Але перадусім шляхціц — абаронца айчыны, патрыёт. Ён поўны самаахвярнасці, гарту, пачуцця абавязку, аптымізму і веры ў боскую міласэрнасць. Шляхціц шануе магілы продкаў, з’яўляецца аматарам усяго нацыянальнага, у тым ліку і звычак простага народа. Ідэальны вобраз шляхціца ўключаў і такія рысы як дэмакратызм, праўдзівасць, адукаванасць, цвярозы розум [227, с. 236—239]. Сярод эксклюзіўных шляхецкіх рысаў называліся таварыскасць, гасціннасць, сардэчнасць і весялосць духу. Лічылася, што самыя высокія маральныя і інтэлектуальныя якасці ўласцівыя шляхціцу ад нараджэння і перадаюцца па крыві ад продкаў да нашчадкаў.

На працягу першай паловы XIX стагоддзя ў заходнееўрапейскім і расійскім грамадствах назіралася ўзаемапранікненне дваранскіх і буржуазных (разначынскіх) этычных узораў [173, с. 427]. Падобнай трансфармацыі элітарнай свядомасці патрабаваў працэс фарміравання нацыянальных дзяржаў, якія прыходзілі на змену саслоўна-дынастычным утварэнням, і стварэнне рэгулярных армій.

Беларускае панства ў сваіх паводзінах працягвала кіравацца паняццямі радавога (гербавага) і саслоўнага гонару. Паняцце высакароднасці ў шляхецкім асяроддзі засноўвалася на феадальнай ідэі прыроджаных якасцяў — высакароднасці крыві. У шляхецкага пачуцця ўласнай вышэйшасці, як і ў ксенафобіі, былі адзіныя карані — фрустрацыя дэкласаванага дробнага шляхецтва, разрыў паміж саслоўнымі прэтэнзіямі на выключную ролю ў грамадстве і немагчымасцю іх пацвердзіць. Негатовая развіваць і выяўляць

індывідуальныя здольнасці ў канкурэнтным асяроддзі, шляхецтва вымагала для сябе сацыяльнага авансу за гістарычныя заслугі сваіх продкаў.

Шляхціц усведамляў сябе часткай сямейнага клану, гербавага брацтва, шляхецкага суседства, якое, у сваю чаргу, з’яўлялася складовай часткай магнацкай партыі. Феадальная залежнасць трансфарміравалася ў экзальтаваную любоў шляхты да вялікіх паноў, якая не выключала маральнага і фізічнага прыніжэння. Вялікія паны, у сваю чаргу, былі звязаныя патрыманіяльнымі абавязкамі і не адчувалі сябе ў поўнай ступені свабоднымі ад шляхецкага асяроддзя. Адносіны магнатаў да шляхты адлюстроўвае наступная характарыстыка графа В. Тышкевіча, якую яму даў Л. Патоцкі: «ён калі і любіў шляхту, то не таму, што тая была яму роўнаю, але як бацька любіць дзяцей, як апякун даручаных яго клопатам, як дабрадзей яму абавязаных» [180, с. 46]. Міфалагема «шляхецкай роўнасці» была заклікана мабілізоўваць нізы шляхецтва на палітычную патрэбу арыстакратыі. З другога боку, яна з’яўлялась стрымліваючым фактарам для магнатэрыі ў яе адносінах да шарачкоў.

Саслоўная закасцянеласць, фанабэрыя, ксенафобія, рэгіяналізм, брак адукацыі, фанатызм, п’янства, марнатраўства, схільнасць да азартных гульняў, нежаданне займацца гаспадарчымі справамі, даматурства — звыклы пералік заганаў шляхецкага саслоўя, пра якія сведчылі як прадстаўнікі мясцовай інтэлігенцыі, так і замежныя назіральнікі [89; 214, с. 303]. Што датычыць заганаў буйнога панства, то сярод іх пераважалі, па перакананню сучаснікаў, касмапалітызм, эгаізм і марнатраўства [213, с. 304]. Эксцэсам станаўлення нацыянальнай свядомасці ў першай палове XIX стагоддзя стала ўзмацненне сярод шляхецтва месіянскіх настрояў. Увасабленнем падобнай тэндэнцыі быў трактат «Księgi narodu polskiego i pielgrzymstwa polskiego» (1832) А. Міцкевіча [325].

Рускімі назіральнікамі адзначалася наяўнасць «падвойнага дна» ў выхадцаў з шляхецкага асяродка. Прадстаўнікі шляхецтва на правах зняволенага народа сапраўды спавядалі двайную мараль — таварыскую, для прадстаўнікоў свайго сацыяльна-культурнага асяродка, што палягала на ідэі шляхецкай роўнасці і братэрскай узаемадапамогі, і канформную, неабходную для кар’ернага прасоўвання ў чужым культурным і этнічным асяроддзі. Руская грамадская думка бачыла ў шляхецкім характары дзве вялікія заганы, вынікаючыя адна з другой, — фанабэрыю (рус. — *надменность*) і дурноту (рус. — *глупость*), праз якія, суладна стэрэатыпнаму меркаванню, і адбываліся ўсе гістарычныя катастрофы з Рэччу Паспалітай [56, с. 86]. Прычыну шляхецкіх вызваленчых паўстанняў руская грамадская думка прыпісвала

такім асаблівасцям характару «шляхецкай нацыі», як няўдзячнасць і шалёнасць (рус. — *буйность*) [56, с. 86].

Падобныя меркаванні нельга лічыць вынікам аб'ектыўных назіранняў: рускаму дваранству было ўласціва паблажлівае пачуццё да «сарматаў», як да пераможанага народа [56, с. 96]. Немалую ролю ў дадзеным меркаванні грала таксама няпэўнасць, якую адчувалі рускія, што жылі на землях былой Рэчы Паспалітай [56, с. 96]. Характэрна, што для заходнееўрапейскіх назіральнікаў прыкметнымі рабіліся не столькі адрозненні, колькі падабенства ў нацыянальным характары прадстаўнікоў велікарускага дваранства і шляхты [129, с. 348].

Значнае месца ў жыцці шляхціца займала сям'я, якая традыцыйна ўключала ў сябе не толькі сваякоў, але і астатняе насельніцтва домаўладання. Жонка шляхціца, адпаведна патрыярхальнаму ўяўленню, — гэта паплечніца, ад якой у значнай ступені залежыць дабрабыт дома: «добрая жонка — скарб найдаражэйшы, бо дзе ў хаце каханне і згода, там і блаславенне Божае» [19, с. 47]. Аднак на практыцы мужчыны шукалі ў шлюбе спосаб умацавання свайго эканамічнага становішча, а жанчыны прагнулі радавітасці і свецкіх забаў. Папулярызавалася ідэя, паводле якой кахаць можна па-за шлюбам, а ствараць сям'ю варта паводле эканамічнага і палітычнага разліку. У творах рамантыкаў жанчына зрабілася галоўнай гераіняй, дэкларавалася яе права на каханне. І самі жанчыны больш актыўна далучаліся да фарміравання грамадскіх ідэалаў праз стварэнне салонаў, літаратурныя і тэатральныя заняткі [127, с. 146]. Адзначалася нязмушанасць шляхцянак, якія часта бралі на сябе ініцыятыву ў любоўных адносінах [39, с. 73; 324, s. 265]. Жаночай эмансіпацыі спрыяла знаходжанне ў беларускім краю значнай колькасці расійскага афіцэрства і чыноўнікаў, а таксама працэс камерцыялізацыі сферы забаў. Танцавальныя рэдуты рабіліся «кірмашом нявест». Павышалася матрыманіяльная мабільнасць шляхцянак, якія атрымалі магчымасць выйсця за кола суседскіх знаёмстваў. Манернасць, сарамлівасць, сціпласць, паважнасць у паводзінах жанчыны высмейваліся свецкім грамадствам як праявы правінцыялізму. Павялічвалася колькасць міжэтнічных і міжканфесійных шлюбаў. Такая з'ява канца XVIII — пачатку XIX стагоддзя, як фаварытызм, суладна якой сярод прадстаўнікоў уладнай эліты зрабілася прэстыжным дэманстраваць свае пазашлюбныя сувязі — «мужы з'яўляліся фірмаю, жонкі — таварам», уключала жанчын у дзяржаўныя сферы [180, с. 228]. У арыстакратычным асяроддзі зрабілася звыклай практыка скасавання шлюбу.

Істотным кампанентам шляхецкага светапогляду заставалася рэлігійная вера, у якой шукалі індывідуальнае і нацыянальнае апірышча. Сярод моладзі, якая атрымлівала свецкую адукацыю, распаўсюджваліся асветніцкія стэрэатыпы адносна месца рэлігіі ў грамадстве. Выявіўся дыферэнцыяльны

падыход да рэлігіі: выказваліся меркаванні аб неабходнасці ўмацавання веры сярод народу, як сродку выхавання і мацавання маралі, і адначасова — прапаноўвалася абмежаваць уплыў клерыкалаў на свецкую дваранскую культуру [246, с. 199—200; 247, с. 202]. На месца традыцыйнай рэлігійнасці, што не патрабавала доказаў і засноўвалася на прынцыпах феадальнай вернасці, прыходзіў дэізм, містыцызм, эзатэрычныя вучэнні. У дробнашляхецкім асяроддзі з хрысціянскай верай суіснавалі народныя язычніцкія прымхі [213, с. 205].

Роля каталіцкага святарства ў фармуляванні нацыянальнай і саслоўнай шляхецкай ідэалогіі заставалася істотнай. Светары выконвалі ролю дарадцаў магнатаў і павадыроў паўстанцкіх партый. Мабілізуючая роля касцёла ў паўстаннях з’яўлялася часта вырашальнай. Шляхта працягвала спавядаць «шляхецкага» Бога. «Сарматцкая» вера асвячала рыцарскія якасці, надавала ім этычную вартасць.

Важным кампанентам шляхецкага этасу з’яўлялася ваяўнічасць. Шляхецкая зухаватасць, пазбаўленая звычкі да дысцыпліны, прыводзіла часта да вайсковага канфузу. Прымаўка «варта пачаць, а там паглядзім» добра ілюструе імпульсіўны характар гэтай шляхецкай якасці. Яе другім бокам з’яўлялася арыентацыя на гвалтоўнае вырашэнне сацыяльна-палітычных праблем. Высокая ступень саслоўнай салідарнасці рабіла шляхецкі асяродак крыніцай перманентнай нестабільнасці, што несла пагрозу не толькі расійскаму панаванню, але і развіццю маладога беларускага руха [89].

Неаднолькавымі былі адносіны ў асяроддзі прывілеяванага саслоўя да мабільнасці, навацый і моды. Жанчыны і моладзь дэманстравалі большую адкрытасць зменам. Найбольш істотна пад уздзеяннем заходніх асветніцкіх тэндэнцый змяняліся побытавыя стэрэатыпы, якія не закраналі саслоўных ідэалагічных асноў. Такія праявы новаўерапейскай рацыяналізацыі, як пунктуальнасць ці абавязковасць у грашовых адносінах, не зрабіліся падставамі саслоўнай шляхецкай псіхалогіі. Уяўленне аб эканоміі як грашовых сродкаў, так і часу, успрымалася як нешляхетнае. Пунктуальнасць і нежаданне выдаткоўвацца звыш даходаў магната В. Тышкевіча, напрыклад, успрымаліся сучаснікамі як дзівацтва [180, с. 30—31]. Разам з ідэямі асветніцтва ў прывілеяваным грамадстве Беларусі распаўсюджваліся новыя ўяўленні пра гігіену і камфорт. Камфартабельнае жытло мусіла быць не толькі цёплым, светлым і прасторным, але і мець свежыя кветкі ў пакоях, бібліятэку, карціны, музычныя інструменты [56, с. 92]. Сібарыцкія і інтэлектуальныя кампаненты новага ўяўлення пра ўтульнасць — вымога наяўнасці ў доме кавы, гарбаты, цыгараў, добрага стала і віна, мяккага ложку, асабістага прасторнага мэбляванага пакою, чыстай вопраткі, ванны, кніг, паперы і атраманту — выразна адрозніваліся ад «сарматцкага» паходна-вайсковага побыту. У

грамадстве пашыраліся медычныя веды. Магнаты не карысталіся паслугамі шпіталяў ці бальніц, а лячыліся ў вядомых лекараў. Апошнія месціліся ў буйных гарадах краю — у Вільні, Гродне, Коўні. Магнаты на лекарскую кансультацыю ездзілі і за мяжу. Наведвалі яны з медыцынскімі мэтамі таксама айчынныя і замежныя курорты [57, с. 61]. Дробная шляхта працягвала звяртацца да аптэкараў і бабулек-шаптух, якія лекавалі малітвай, зёлкамі і вадой [351, s. 187].

Дробнае шляхецтва з'яўлялася найбольш кансерватыўным слоем. Палітычныя, эканамічныя, культурныя змены, тэхнічны прагрэс, хуткае абагачэнне, мода — выклікалі ў дадзеным асяроддзі насцярожанасць. Нелюбоў да моды аргументавалася тым, што апошняя правакуе марнатраўства [19, с. 22]. У модзе бачылі таксама чужынскія завядзёнкі, накінутыя звонку. Мабільнасць, як геаграфічная, так і сацыяльная, разглядалася кансерватарамі з непрыхільнасцю. Шляхціц з'яўляўся чалавекам вясковым і быў даматурам. Горад ён наведваў у рэдкіх выпадках — калі прыязджаў на кірмаш ці на рэлігійны фэст, адвозіў дзяцей вучыцца, шукаў лекара ці аптэку, судзіўся з суседам. Горад успрымаўся ім як крыніца спакусаў і небяспекі — корчмы з ліхімі цэнамі, распусная моладзь, «фармазоны», легкадумныя жанчыны. Вандроўкі ў чужы край, паводле перакананняў дробнай шляхты, — акт змушаны, які прыносіць няшчасце. Шляхціц меў сантымент да роднага краявіду. Разумець і бачыць прыгажосць прыроды — шляхетна. Вясковы гаспадар чытаў прыроду як кнігу, ведаў народныя прыкметы. Пісьменнікі-рамантыкі, выхадцы з шляхецкага асяроддзя, паэтызавалі мясцовы пейзаж. Вясковы характар шляхецкай культуры абумовіў такія культурныя асаблівасці, як персаніфікацыя міжасобасных адносінаў, шчыльны нефармальны кантроль за паводзінамі супольнікаў суседства, значная роля чутак у інфармацыйным абмене, абмежаванасць жыццёвага вопыту, высокая ўдзельная вага калектыўнай дзейнасці, абмежаваны культурны выбар [266, с. 180].

У найбольшай ступені сацыяльна-псіхалагічны шляхецкі тып выяўляўся ў дачыненнях з сялянскай грамадой. Адносіны пана і селяніна мелі статусна-ролевы характар. Адна з нямногіх сфераў, дзе было магчыма салідарысцкае пачуццё паміж панам і селянінам, з'яўлялася рэлігія. З масавым пераводам беларускага сялянства з уніяцтва ў праваслаўе гэтая эмацыйная сувязь знікае. Пан выконваў патэрналісцкую ролю, якую яму дыктавала саслоўнае разуменне абавязку і гонару. Адсюль міласціна жабракам, удзел у дажынках, сялянскіх вяселлях і хрэсьбінах. У дадзеных жэстах выяўлялася жаданне падкрэсліць сацыяльную дыстанцыю, а не прадэманстраваць салідарнасць. Пан не разлічваў на сялянскую ўдзячнасць. У адказ на патэрналісцкі жэст ад

селяніна патрабаваўся сустрэчны жэст прыніжэння. Страх, паслухмянасць, захапленне перад панскай «веліччу» — тая рэакцыя, якая была пажадана для пана з боку сялянства [61, с. 454].

Барочная афектаваная пачуццёвасць у адносінах паміж шляхціцамі і іх эмацыйная чэрствасць у дачыненні да прыгонных — тыповае спалучэнне. Нават памяркоўныя прадстаўнікі шляхецкага саслоўя займаліся асабіста пакараннем прыгонных. Напрыклад, В. Тышкевіч ва ўласных уладаннях прымяняў наступную «выхаваўчую» сістэму: 24-гадзінны пост, грашовы штраф, гадзіннае і болей стаянне на каленях [180, с. 33]. Меней гуманныя паны звярталіся да бізуноў і рэкрутчыны, маглі абмяняць пародзістых сабак на сялян, раз’ядноўваць сем’і прыгонных [70, с. 143]. Захоўваўся таксама антаганізм паміж мяшчанскімі асяродкамі беларускіх гарадоў і шляхецтвам [326, s. 95]. Нават для яўрэйскага насельніцтва, многія прадстаўнікі якога здолелі зрабіцца незаменнымі кампаньёнамі шляхты ў гаспадарчых праектах, шляхецкая рэспубліка не стала «роднай маці» [137, с. 123]. Пад час шляхецкіх бунтаў у краі яўрэі ў сваёй масе захоўвалі лаяльнасць расійскаму ўраду [59, с. 157]. Фіксаваліся сутычкі паміж шляхтай і стараверамі. Насельніцтва плаціла шляхце ўстойлівай непрыязнасцю. Пад час шляхецкіх паўстанняў 1830—1831 і 1863—1864 гадоў беларускае сялянства, як правіла, падтрымлівала імперскі ўрад [108, с. 37, 88].

Прыгон і паншчына знайшлі свой адбітак у беларускім народным фальклоры [255]. Як заўважыў У. Сыракомля, у сваіх казках беларускія маці страшылі дзяцей ваўком, дзедам і панам [213, с. 313]. У сялянскіх паданнях фіксаваліся такія адмоўныя рысы шляхецтва, як фанабэрыя, жорсткасць, лайдацтва [138, с. 89—91]. Устойліва адмоўным было стаўленне сялян да арандатараў, эканомаў, падпанкаў [213, с. 310]. Эмацыйны напал міжсаслоўных адносін захавалі народныя прымаўкі: «Да Бога далёка, да цара высока, скачы, уража, як пан скажа», «Пан скача, а служка плача», «Паны б’юцца, а ў хлопаў чубы трашчаць» [224, с. 145—146]. Зрэшты адносіны беларускага сялянства да прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя не былі цалкам негатыўнымі. Вядомыя сялянскія легенды пра «добрага пана», у якіх птрыярхальная дабрачыннасць магнатаў былых часоў супрацьпастаўлялася дэспатызму сучаснікаў [65, с. 195].

Калі для велікарускага дваранства пытанне вызвалення сялянства з’яўлялася пунктам напружанага грамадскага абмеркавання, то для шляхецтва нервам палітычных дыскусій было нацыянальнае вызваленне [329, s. 6; 120, с. 136]. Для шляхецкай інтэлігенцыі ў яе асноўнай масе нацыянальнае заставалася раўназначным саслоўнаму. Пра гэта ў прыватнасці зазначаў В. Каратынскі: «…шляхта піша для шляхты, і літаратура, за невялікімі

выключэннямі, замест інтарэсаў народа падтрымлівае інтарэсы касты, якая адно толькі хоча называцца нацыяй» [107, с. 102—103]. Выключэннем былі адзінкі, кшталту К. Каліноўскага, які лічыў шляхту няздатнай да разумення агульнанацыянальных ідэй, і меркаваў, што сацыяльны прагрэс у краі можа адбыцца толькі пасля ліквідацыі шляхецкага саслоўя [106, с. 91]. Характэрна, што вытокі дэмакратычных — «хлапаманскіх» — поглядаў К. Каліноўскага яго паплечнікі прыпісвалі рускім уплывам [106, с. 91].

Уласцівую шляхце саслоўную абмежаванасць выяўляла асветніцкая дзейнасць філаматаў. Праграмы паляпшэння становішча краю, якія абмяркоўваліся ў віленскіх студэнцкіх асяродках, насамрэч мелі на ўвазе захады на карысць дробнашляхецкага грамадства. Спосаб паляпшэння становішча сялянства бачыўся філаматам пераважна ў плоскасці маральнага самаўдасканалення як самога сялянства, так і паноў [329, s. 10—11].

Прадстаўнікі шляхецкай інтэлігенцыі ў сваёй большасці не з'яўляліся этычным узорам у дачыненні з сялянствам [88]. Ю. Крашэўскі сведчыў, што ў мясцовай шляхты імкненне да асветы і прагрэсу адначасова спалучалася з нялюдскасцю ў адносінах да прыгонных. Пад паняцце «цывілізаваны чалавек» падпадаў той, хто чытаў па-французску, гуляў у віст, любіў літаратуру і філасофскія развагі. Яго дачыненні з уласнымі сялянамі іншых мала абыходзілі [316, s. 79—81]. Замест крытычнага аналізу сітуацыі з боку шляхецкай інтэлігенцыі рабіліся спробы перакласці з сябе палітычную адказнасць за гаротнае становішча ў беларускай вёсцы на ўрад. Існавала дыстанцыя, якая дазваляла захоўваць сантымент да селяніна, але выключала магчымасць агульнанацыянальнай салідарызацыі [161, с. 97—99]. Нават абмежаваныя захады ў паляпшэнні сялянскага побыту сярод прадстаўнікоў тутэйшага шляхецтва звычайна кваліфікаваліся зневажальным азначэннем «хлапаманства» [70, с. 146—147].

Наяўнасць гісторыка-культурных рэгіёнаў у Беларусі абумовіла існаванне пэўных рэгіянальных стэрэатыпаў, на падставе якіх складваліся пазнавальныя тыпажы правінцыйнай шляхты, напрыклад, ашмянская шляхта, пінская шляхта [141, с. 41—42]. У раёнах найбольш шчыльнага пражывання дробнай шляхты — на Ашмяншчыне, Наваградчыне, Палессі — крызіс саслоўна-этнічнай ідэнтычнасці ўзмацняўся эканамічнай дэпрэсіяй [154, с. 191]. Шматлікая, бедная, залежная і добра кіруемая лідэрамі магнацкіх партый, шляхта тэрарызавала беларускае сялянства і яўрэйскае насельніцтва, падвяргала абструкцыі спробы асобных прадстаўнікоў дваранства паляпшаць становішча прыгонных [55, с. 35]. Лепшая адаптаванасць усходнебеларускага набілітэту да новых сацыяльна-палітычных адносін у разглядаемы перыяд

верагодна тлумачыцца тым, што ўсходнія землі Беларусі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі на некалькі дзесяцігоддзяў раней [146, с. 467].

Палітычны калапс Рэчы Паспалітай зрабіўся прычынай светапогляднай дэзарыентацыі прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя Беларусі. Як апалагетыка старасвецкіх «сармацкіх» каштоўнасцяў, так і іх крытыка былі выкліканыя траўміруючым фактам зніжэння сацыяльнага статуса шляхты, а таксама каталіцкага і ўніяцкага святарства ў беларускім грамадстве. Для арыстакратыі знікненне Рэчы Паспалітай стала імпульсам да рацыяналізацыі ўласных жыццёвых стратэгій. Пры захаванні сантыменту да мясцовага культурнага каларыту, панства намагалася інтэгравацца ў іншаэтнічныя супольнасці — расійскую або польскую, схілялася да касмапалітычных каштоўнасцяў. Скрайні кансерватызм або наадварот сацыяльны радыкалізм, горшую псіхалагічную адаптаванасць да новых сацыяльна-культурных абставінаў дэманстравала дробнае шляхецтва [265, с. 134].

Такім чынам, трансфармацыя духоўнай і сацыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд праходзіла ў рэчышчы агульнарасійскіх і агульнаеўрапейскіх тэндэнцый камерцыялізацыі і дэмакратызацыі культуры і насіла ўніфікацыйны характар. Змяшчэнне цэнтра культурнага жыцця краю з рэзідэнцый і маёнткаў шляхецтва ў гарады, фарміраванне новай сацыяльнай групы — разначыннай інтэлігенцыі, развіццё свецкіх адукацыйных інстытутаў і прэсы, распаўсюджванне ідэй асветніцтва, а пазней — пазітывізму, з іх ідэаламі здаровага ладу жыцця, эканамічнай карысці, палітычнай мэтазгоднасці і прыматам навуковай арганізацыі грамадства заклалі асновы для фарміравання надсаслоўнай нацыянальнай культуры. Падобныя трансфармацыі разглядаліся клерыкальнымі і кансерватыўнымі коламі прывілеяванага грамадства Беларусі як пагроза для сваёй кіруючай ролі ў краі. У шляхецкай культуры ўзмацняліся ахоўныя працэсы. «Сарматызм», барочны тып культуры пачаў супрацьпастаўляцца мадэрнізацыйным заходнееўрапейскім («буржуазным») і ўніфікацыйным расійскім працэсам і пераасэнсоўвацца ў асяроддзі шляхецкай інтэлігенцыі ў якасці «нацыянальнага» стылю. Працягам гэтай ахоўнай кансерватыўнай тэндэнцыі ў развіцці духоўнай і сацыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд з’яўляецца папулярызацыя ў асяроддзі мясцовай дробнашляхецкай інтэлігенцыі ідэалагічных і эстэтычных прынцыпаў рамантызму. Павялічваўся ўплыў прэсы і асветніцкай публіцыстыкі на грамадскую думку. Функцыю кантролю грамадскай думкі выконвалі рэлігійныя і квазірэлігійныя (напрыклад, масонства) інстытуцыі. Лідэрамі паланафільскай інтэлігенцыі з’яўлялася прафесура Віленскага універсітэту (зачынены ў 1832 годзе). Цэнтры фарміравання саслоўнай

ідэалогіі існавалі таксама за межамі краю — у эміграцыйных заходнееўрапейскіх гуртках і зямляцкіх згуртаваннях выхадцаў з тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай у Санкт-Пецярбурзе і Маскве.

Дынаміка культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі разглядаемага перыяду была абумоўлена ў значнай ступені працэсам адаптацыі мясцовых элітарных груп да расійскіх палітыка-эканамічных і сацыякультурных умоў жыцця. Адаптацыя насіла рознахуткасны характар і паглыбляла культурную дыферэнцыяцыю ў асяроддзі прывілеяванага саслоўя Беларусі. Адаптацыя мела дваістую мэту — захаванне культурнай цэласнасці мясцовай прывілеяванай групы і адначасова яе інтэграцыю ў агульнарасійскую элітарную супольнасць. Можна вылучыць наступныя сацыякультурныя адаптацыйныя стратэгіі ў культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд:

- моўная натуралізацыя (навучанне ў расійскіх універсітэтах і адначасовае захаванне нацыянальнай польскамоўнай адукацыйнай сістэмы ў краі);
- ідэалагічна-канфесійны кансенсус (развіццё ідэалогіі панславізму; абмеркаванне ідэй увядзення рускай або беларускай моваў у каталіцкім набажэнстве і скасавання грэка-каталіцкай уніі);
- міграцыйная мабільнасць (выезд у сталічныя гарады Расійскай імперыі для ажыццяўлення кар’еры; фарміраванне моцнай дыяспары);
- дэмаграфічная стратэгія (культ вялікай шматдзетнай сям’і і «польскай» маці);
- гларызацыя шляхецкай культуры (прапаганда ідэі «еўрапейскасці» шляхецкай культуры; каталіцкі месіянізм);
- каранізацыя (зварот да беларускай мовы; збор гістарычных звестак і фальклору з мэтай доказу сваіх гістарычных правоў на культурную прысутнасць у краі; мецэнацтва; капіталаўкладанні ў нацыянальную культуру; калекцыяніраванне);
- матрыманіяльныя абмены (міжэтнічныя і міжканфесійныя шлюбы);
- сімвалічныя абмены (уніфікацыя імён на рускі ўзор; мадыфікацыя радаводаў);
- саслоўная салідарызацыя (саслоўна-кланавы пратэкцыянізм, інтэнсіфікацыя ўнутрыродавых і ўнутрысаслоўных сувязяў).

Працэсу адаптацыі дробнага шляхецтва да расійскіх палітыка-эканамічных і сацыякультурных умоў жыцця замінала палітычная і эканамічная дысфункцыянальнасць гэтай сацыяльнай групы ва ўмовах расійскага абсалютысцкага рэжыму. Павялічваўся разрыў паміж эканамічнымі

і палітычнымі магчымасцямі арыстакратыі і беззямельнага ды малазямельнага дваранства, ліквідавалася ілюзія гамагеннасці колішняга «народу шляхецкага». У культуры магнатэрыі адбываўся пераход ад «сарматызму» да прэстыжных культурных мадэляў (сінкрэтычнай расійска-імперскай, рускай або польскай). Дробнашляхецкая інтэлігенцыя шукала новыя формы ідэнтычнасці на грунце лакальна-рэгіянальных гісторыка-культурных традыцый, што стварала перадумовы для фарміравання нацыянальнай беларускай культуры.

Структурная цэласнасць і функцыянальнасць культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд была абумоўлена традыцыйнай саслоўнай свядомасцю яго прадстаўнікоў. Культура прывілеяваных груп Беларусі ў азначаны перыяд захоўвала наднацыянальны характар. Працэс этнакультурнага самавызначэння і нацыянальнага размежавання ў асяроддзі прывілеяванага саслоўя Беларусі быў нясконачаны. Важнае месца ў структуры саслоўнай свядомасці элітарных груп Беларусі захоўвалі канфесійныя, лакальна-рэгіянальныя і родава-кланавыя прыкметы. У структуру саслоўнай свядомасці ўваходзілі таксама наступныя стэрэатыпы, каштоўнасці і ідэалы: культ мінулага, уяўленне аб выключнай вартасці палітычнай сістэмы Рэчы Паспалітай і «залатых шляхецкіх вольнасцяў», прымат радавітасці пры ацэнцы маральных і дзелавых якасцяў асобы, самадастатковасць шляхецкага становішча, унутрысаслоўная шляхецкая роўнасць і братэрства, культ сям'і, роду, «радавога гнязда» і аселасці на зямлі, рэлігійна-цывілізацыйнай місіі шляхецтва на ўсходзе Еўропы. Свядомасць мясцовага набілітэту з'яўлялася полем змагання польскай і рускай нацыянальных ідэй. Формай пазбягання падобнага выбару быў зварот да «тутэйшасці» — культывавання рэгіянальнага патрыятызму, які бліжэй да сярэдзіны ХІХ стагоддзя ўсё часцей вызначаўся тэрмінам «беларускі».

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Важнымі тэндэнцыямі ў развіцці матэрыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд з’яўляліся мадэрнізацыйны і кансерватыўны працэсы. Іх суадносіны ў культурным працэсе вар’іраваліся ў залежнасці ад зменаў у палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сферах грамадскага жыцця. На падставе асаблівасцяў развіцця дадзеных тэндэнцый у азначаны перыяд вылучаюцца тры асноўныя этапы эвалюцыі матэрыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі. На працягу першага перыяду (канец XVIII ст. — 1812 г.) захоўвалася спрыяльная эканамічная кан’юнктура для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, назіраўся рост дабрабыту сярод землеўладальнікаў. Свабодныя і пазыковыя сродкі памешчыкаў шырока выдаткоўваліся на перабудову маёнткаў, на прадметы раскошы і гандлёвыя спекуляцыі. Найбольш глыбокую трансфармацыю адпаведна найноўшым заходнееўрапейскім узорам зазнаў побыт арыстакратыі. Мадэрнізацыйныя ўплывы амаль не закранаді сферу вытворчых тэхналогій. На развіццё матэрыяльнай культуры найбольшае ўздзеянне аказвала заходнееўрапейская мода, пераважна французская.

На другім этапе (1812 — 1831) пасля вайны 1812 года назіралася эканамічная рэцэсія і кансервацыя экстэнсіўных форм культуры жыццезабеспячэння прывілеяванага саслоўя Беларусі. Адбывалася паўперызацыя дробнай шляхты. Накапленні шляхецтва інвесціраваліся пераважна ў набыццё зямельных уладанняў і адукацыю дзяцей. Праз рамантычную моду на экзотыку атрымала развіццё «сармацкая» арыентальная традыцыя. Дэмакратызавалася індустрыя моды, паступова збліжаліся побытавыя ўзоры матэрыяльнай культуры прывілеяванага і непрывілеяванага саслоўяў.

На трэцім этапе (1831 — 1861) пасля няўдалага шляхецкага паўстання 1830 — 1831 гадоў царскі ўрад пачаў больш рашуча праводзіць палітыку уніфікацыі мясцовай заканадаўчай базы. Палітызацыя грамадскай думкі ў асяроддзі прывілеяванага саслоўя страціла сваю вастрыню. Мясцовыя дваранскія сельскагаспадарчыя і прамысловыя прадпрыемствы пачалі больш шырока ўцягвацца ў агульнарасійскі рынак. Усё гэта спрыяла гаспадарчаму аднаўленню краю і мадэрнізацыі культуры жыццезабеспячэння прывілеяванага грамадства Беларусі. Паскаралася развіццё рыначных адносін і памешчыцкага прадпрыемніцтва. Вялікае значэнне для павышэння сельскагаспадарчых ведаў, а таксама ўкаранення прагрэсіўных земляробчых тэхналогій паслужыла адкрыццё Горы-Горацкай земляробчай школы (1840 — 1848). Пашыраліся інвестыцыі ў механізацыю сельскагаспадарчых работ і

прамысловацці. Значныя змены адбыліся ў сферы культуры жыццезабеспячэння духавенства ў сувязі з секулярызацыяй духоўнага землеўладання. У сферы побыту мясцовага дваранства выявілася тэндэнцыя кансервацыі традыцыйных форм матэрыяльнай культуры, «музеефікацыі» жыцця маёнткаў. У архітэктуры і інтэр'еры шляхецкага жытла папулярным становіцца рэтраспектыўны стыль, больш адчувальным робіцца і рускі ўплыў.

Палітыка расійскага ўраду ў дачыненні мясцовых прывілеяваных груп (канфіскацыя маёнткаў удзельнікаў шляхецкіх паўстанняў, разборы шляхты, інвентарная рэформа), пагаршэнне знешнеэканамічнай кан'юнктуры на мясцовую сельскагаспадарчую прадукцыю, павелічэнне канкурэнцыі на мясцовым рынку вымагалі ад землеўладальнікаў інавацыйнай ініцыятывы. Найперш гэтая патрэба ўсведамлялася адукаванымі памешчыкамі, якія мадэрнізавалі ўласныя гаспадаркі, дабіваліся вызвалення прыгонных, рэфарміравалі свой і сялянскі побыт адпаведна новым уяўленням аб камфорце і гігіене. Павышаліся патрабаванні да інтэлектуальнага ўзроўню прадстаўнікоў эліты, іх асабістай ролева-функцыянальнай эфектыўнасці (прафесіяналізму, ініцыятыўнасці, адукаванасці). Аднак недахоп матэрыяльных рэсурсаў для эканамічных пераўтварэнняў сярод пераважнай часткі шляхецтва спрыяў кансервацыі ў краі на працягу разглядаемага перыяду феадальных форм культуры жыццезабеспячэння. Назіралася рэдукцыя кола саслоўных функцыянальных абавязкаў прадстаўнікоў мясцовага набілітэту. Прадстаўнікі мясцовых прывілеяваных груп усё больш замыкаліся ў межах прыватнага таварыскага побыту. Як супрацьвага расійскім уплывам прапагандавалася ідэя «еўрапейскасці» шляхецкай традыцыі, што спрыяла распаўсюджванню заходнееўрапейскіх узораў матэрыяльнай культуры. Праваднікамі культурных інавацый у матэрыяльнай культуры Беларусі ў разглядаемы перыяд часта выступалі іншаэтнічныя (нямецкія, рускія, яўрэйскія) і іншасаслоўныя (купецтва, мяшчанства) групы. У цэлым на працягу разглядаемага перыяду пры наяўнасці пэўных прыкметаў разлажэння феадальна-прыгонніцкага ладу і нараджэння новых капіталістычных адносін у галіне эканомікі, у сферы культуры жыццезабеспячэння прывілеяванага саслоўя Беларусі пераважалі традыцыйныя аграрныя феадальныя формы.

Трансфармацыя духоўнай і сацыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд праходзіла ў рэчышчы агульнарасійскіх і агульнаеўрапейскіх тэндэнцый камерцыялізацыі і дэмакратызацыі культуры і насіла уніфікацыйны характар. Зямшчэнне цэнтра культурнага жыцця краю з рэзідэнцый і маёнткаў шляхецтва ў гарады, фарміраванне новай сацыяльнай групы — разначыннай інтэлігенцыі, развіццё свецкіх адукацыйных інстытутаў і прэсы, распаўсюджванне ідэй асветніцтва,

а пазней — пазітывізму, з іх ідэаламі здаровага ладу жыцця, эканамічнай карысці, палітычнай мэтазгоднасці і прыматам навуковай арганізацыі грамадства заклалі асновы для фарміравання надсаслоўнай нацыянальнай культуры. Падобныя трансфармацыі разглядаліся клерыкальнымі і кансерватыўнымі коламі прывілеяванага грамадства Беларусі як пагроза для сваёй кіруючай ролі ў краі. У шляхецкай культуры ўзмацняліся ахоўныя працэсы. «Сарматызм», барочны тып культуры пачаў супрацьпастаўляцца мадэрнізацыйным заходнееўрапейскім («буржуазным») і уніфікацыйным расійскім працэсам і пераасэнсоўвацца ў асяроддзі шляхецкай інтэлігенцыі ў якасці «нацыянальнага» стылю. Працягам гэтай ахоўнай кансерватыўнай тэндэнцыі ў развіцці духоўнай і сацыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд з'яўляецца папулярызацыя ў асяроддзі мясцовай дробнашляхецкай інтэлігенцыі ідэалагічных і эстэтычных прынцыпаў рамантызму.

Дынаміка ў культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд была абумоўлена ў значнай ступені працэсам адаптацыі мясцовых элітарных груп да расійскіх палітыка-эканамічных і сацыякультурных умоў жыцця. Адаптацыя насіла рознахуткасны характар і паглыбляла культурную дыферэнцыяцыю ў асяроддзі прывілеяванага саслоўя Беларусі. Адаптацыя мела дваістую мэту — захаванне культурнай цэласнасці мясцовай прывілеяванай групы і адначасова яе інтэграцыю ў агульнарасійскую элітарную супольнасць. Можна вылучыць наступныя сацыякультурныя адаптацыйныя стратэгіі ў культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд:

- моўная натуралізацыя (навучанне ў расійскіх універсітэтах і адначасовае захаванне нацыянальнай польскамоўнай адукацыйнай сістэмы ў краі);
- пошук ідэалагічна-канфесійнага кансенсусу (развіццё ідэалогіі панславізму; абмеркаванне ідэй увядзення рускай або беларускай моў у каталіцкім набажэнстве і скасавання грэка-каталіцкай уніі);
- павышэнне міграцыйнай мабільнасці (выезд у сталічныя гарады Расійскай імперыі для рэалізацыі кар'еры і фарміраванне моцнай дыяспары);
- выпрацоўка дэмаграфічнай палітыкі (культ вялікай шматдзетнай сям'і);
- глорызацыя шляхецкай культуры (прапаганда ідэі «еўрапейскасці» шляхецкай культуры; каталіцкі месіянізм);
- каранізацыя (зварот да беларускай мовы; збор гістарычных звестак і фальклору з мэтай доказу сваіх гістарычных правоў на культурную

прысутнасць у краі; мецэнацтва; капіталаўкладанні ў нацыянальную культуру; калекцыяніраванне);

- матрыманіяльныя абмены (міжэтнічныя і міжканфесійныя шлюбы);
- сімвалічныя абмены (уніфікацыя імён на рускі ўзор; мадыфікацыя радаводаў);
- мацаванне саслоўнай салідарнасці (саслоўна-кланавы пратэкцыянізм, інтэнсіфікацыя ўнутрыродавых і ўнутрысаслоўных сувязяў).

Працэсу адаптацыі дробнага шляхецтва да расійскіх палітыка-эканамічных і сацыякультурных умоў жыцця замінала палітычная і эканамічная дысфункцыянальнасць гэтай сацыяльнай групы ва ўмовах расійскага абсалютысцкага рэжыму. Павялічваўся разрыў паміж эканамічнымі і палітычнымі магчымасцямі арыстакратыі і беззямельнага ды малазямельнага дваранства, ліквідавалася ілюзія гамагеннасці колішняга «народу шляхецкага». У культуры магнатэрыі адбываўся пераход ад «сарматызму» да прэстыжных культурных мадэляў (сінкрэтычнай расійска-імперскай, рускай або польскай). Дробнашляхецкая інтэлігенцыя шукала новыя формы ідэнтычнасці на глебе лакальна-рэгіянальных гісторыка-культурных традыцый, што стварала передумовы для фарміравання нацыянальнай беларускай культуры.

Структурная цэласнасць і функцыянальнасць культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі ў разглядаемы перыяд была абумоўлена традыцыйнай саслоўнай свядомасцю яго прадстаўнікоў. Культура прывілеяваных груп Беларусі ў азначаны перыяд захоўвала наднацыянальны характар. Працэс этнакультурнага самавызначэння і нацыянальнага размежавання ў асяроддзі прывілеяванага саслоўя Беларусі быў няскончаны. Важнае месца ў структуры саслоўнай свядомасці элітарных груп Беларусі захоўвалі канфесійныя, лакальна-рэгіянальныя і родава-кланавыя прыкметы. У структуру саслоўнай свядомасці ўваходзілі таксама наступныя стэрэатыпы, каштоўнасці і ідэалы: культ мінулага, уяўленне аб выключнай вартасці палітычнай сістэмы Рэчы Паспалітай і «залатых шляхецкіх вольнасцяў», прымат радавітасці пры ацэнцы маральных і дзелавых якасцяў асобы, самадастатковасць шляхецкага становішча, унутрысаслоўная шляхецкая роўнасць і братэрства, культ сям’і, роду, «радавога гнязда» і аселасці на зямлі, рэлігійна-цывілізацыйнай місіі шляхецтва на ўсходзе Еўропы. Свядомасць мясцовага набілітэту з’яўлялася полем змагання польскай і рускай нацыянальных ідэй. Формай пазбягання падобнага выбару быў зварот да «тутэйшасці» — культывавання мясцовага рэгіянальнага патрыятызму, які бліжэй да сярэдзіны XIX стагоддзя ўсё часцей вызначаўся тэрмінам «беларускі».

# ЛІТАРАТУРА

1. Аксаков, К.С. Воспоминания студентства 1832—1835 годов / К.С. Аксаков // Русские мемуары. Избранные страницы (1826—1856) / сост. И.И. Подольской. — Москва : Правда, 1990. — С. 92—114.

2. Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов : Т. 1—39. — Вильно : Типография А.Г. Сыркина, 1865—1915. — Т.14. — Инвентари имений XVI столетия / ред кол.: Я.Ф. Головацкий [и др.]. — 1887. — XXIV, 703 с.

3. Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов : Т. 1—39. — Вильно : Типография А.Г. Сыркина, 1865—1915. — Т.25. — Инвентари и разграничительные акты / ред кол.: Ю.Ф. Крачковский [и др.]. — 1898. — XXXII, 614 с.

4. Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов : Т. 1—39. — Вильно : Электро-Типография «Русский почин», 1865—1915. — Т.35. — Инвентари староств, имений, фольварков и деревень за вторую половину XVIII века (1751—1789) / ред кол.: Ф.Н. Добрянский [и др.]. — 1910. — XXXII, 624 с.

5. Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов : Т.1—39. — Вильно : Типография А.Г. Сыркина, 1865—1915. — Т.37. — Документы и материалы, относящиеся к истории Отечественной войны 1812 г. / ред кол.: Ф.Н. Добрянский [и др.]. — 1912. — L, 544 с.

6. Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов : Т.1—39. — Вильно : Типография А.Г. Сыркина, 1865—1915. — Т.38. — Инвентари староств, имений, фольварков и деревень XVIII века (1720—1798) / ред кол.: Д.И. Довгялло [и др.]. — 1914. — IX, 504 с.

7. Александровіч, С.Х. Старонкі братняй дружбы : артыкулы пра літаратурныя сувязі / С.Х. Александровіч. — Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1960. — 217 с.

8. Алексеев, Л.В. Археология и краеведение Беларуси XVI в. — 30-е годы XX в. / Л.В. Алексеев. — Минск : Беларус. навука, 1996. — 206 с.

9. Археалогія Беларусі : У 4 т. / В.М. Ляўко [і інш.] ; рэд. кал. М.С. Сташкевіч [і інш.]. — Мінск : Беларус. навука, 1997—2001. — Т.4. — Помнікі XIV—XVIII стст. / В.М. Ляўко [і інш.] ; пад рэд. В.М. Ляўко [і інш.]. — 2001. — 597 с.

10. Атлас гісторыі Беларусі ад старажытнасці да нашых дзён : Дадат. да 6-томнай «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» / Аўтар тэкста Л.У. Языковіч ; уклад. Г.Р. Шыкунова [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2004. — 160 с.

11. Бабкоў, І. Генэалёгія беларускай ідэі / І. Бабкоў // Arche. — Мінск, 2005. — №3. — С. 136—165.

12. Базан, Л.А. Горадабудаўніцтва і палацавая архітэктура ў канцы 16 — пач. 20 ст. / Л.А. Базан [і інш.] // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. — Мінск : БелЭн, 1993—2003. — Т.1. — 1993. — С. 175—177.

13. Бандарчык, В.К. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX стагоддзя / В.К. Бандарчык. — Мінск : Навука і тэхніка, 1964. — 280 с.

14. Бандарчык, В.К. Сям'я і сямейны быт беларусаў / В.К. Бандарчык [і інш.]. — Мінск : Навука і тэхніка, 1990. — 253 с.

15. Бандарчык, В.К. Гісторыя этналагічнага вывучэння / В.К. Бандарчык // Беларусы / рэдкал.: В.К. Бандарчык [і інш.]. — Т. 3. — Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы НАН Беларусі. — Мінск : Бел. навука, 1999. — 365 с.

16. Бантыш-Каменский, Н.Н. Историческое известие о возникшей в Польше унии ... действительным статским советником Бантыш-Каменским 1795 г. собранные / Н.Н. Бантыш-Каменский. — Москва : Синод. типогр., 1805. — 454 с.

17. Бардах, Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бардах ; пер. з пол. М. Раманоўскага і А. Істоміна. — Мінск : Бібліятэка часопіса «Беларускі Гістарычны Агляд», 2002. — 275 с.

18. Барташевич, А.А. История интерьера и мебели / А.А. Барташевич [и др.] ; под общей ред. А.А. Барташевича. — Ростов-на-Дону : Феникс, 2004. — 400 с.

19. Баршчэўскі, Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі // Выбраныя творы / укл., пер. з пол. М. Хаўстовіча. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 1998. — С. 81—282.

20. Баршчэўскі, Я. Драўляны дзядок і кабета Інсекта / Я. Баршчэўскі // Выбраныя творы / укл., пер. з пол. М. Хаўстовіча. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 1998. — С. 283—316.

21. Бас, І. Літаратурныя пошукі, знаходкі, даследаванні / І. Бас. — Мінск : Выдавецтва БДУ, 1969. — 155 с.

22. Бас, І. Падарожжа ў літаратурнае мінулае / І. Бас. — Мінск : Беларусь, 1971. — 230 с.

23. Батюшков, П.Н. Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края / П.Н. Батюшков. — СПб. : Типография Товарищества «Общественная Польза», 1890. — 376 + 183 с.

24. Без-Корнилович, М.О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и др. сведений, к ней относящихся / М.О. Без-Корнилович. — 2-е изд., репринт. — Минск : Алфавит, 1995. — 355 с.

25. Беларуская літаратура XIX стагоддзя. Хрэстаматыя / Уклад. С. Александровіча, А. Лойкі, В. Рагойшы. — Мінск : Вышэйшая школа, 1971. — 372 с.

26. Беларуская літаратура XIX стагоддзя. Хрэстаматыя / Уклад. А. Лойкі, В. Рагойшы. — 2-е выд. — Мінск : Вышэйшая школа, 1988. — 486 с.

27. Беларуская фалькларыстыка. Эпоха феадалізму / Г.А. Каханоўскі [і інш.]. — Мінск : Навука і тэхніка, 1989. — 286 с.

28. Беларускі народны каляндар / аўтар-склад. А.Ю. Лозка. — Мінск : Полымя, 1992. — 205 с.

29. Беларусы / рэдкал.: В.К. Бандарчык [і інш.]. — Т. 4 : Вытокі і этнічнае развіццё / В.К. Бандарчык [і інш.]. — Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы НАН Беларусі. — Мінск : Бел. навука, 2001. — 433 с.

30. Беларусы / рэдкал.: В.К. Бандарчык [і інш.]. — Т. 5 : Сям’я / В.К. Бандарчык [і інш.]. — Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы НАН Беларусі. — Мінск : Бел. навука, 2001. — 375 с.

31. Беларусы / рэдкал.: В.М. Бялявіна [і інш.]. — Т. 6 : Грамадскія традыцыі / В.Ф. Бацяеў [і інш.]. — Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы НАН Беларусі. — Мінск : Бел. навука, 2002. — 606 с.

32. Беларусь: Энцыклапедычны даведнік / рэдк.: Б.І. Сачанка [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 1995. — 800 с.

33. Белоруссия в эпоху феодализма : Сборник документов и материалов : В 4 т. / под ред. А.И. Азарова. — Минск : АН БССР, 1959—1979. — Т. 3. — Воссоединение Белоруссии с Россией и ее экономическое развитие в конце XVIII — первой половине XIX века (1772—1860) / сост. В.В. Чепко, В.В. Шатилло. — 1961. — 624 с.

34. Белоруссия в эпоху феодализма : Сборник документов и материалов : В 4 т. / под ред. А.И. Азарова. — Минск : Наука и техника, 1959—1979. — Т. 4. — Социально-политическая история и культура Белоруссии первой половины XIX в. Отечественная война 1812 г. / сост. В.В. Чепко, В.В. Шатилло. — 1979. — 376 с.

35. Белы, А. Харчаванне ў перыяд Расійскай імперыі (1772—1917) [Электронны рэсурс] / А. Белы. — Рэжым доступа : http://autary.iig.pl/bely/www/materyjalnaja/artykuly/charczavannie_ru.htm. — Дата доступа : 15.03.2008.

36. Блинова, Т.Б. Иезуиты в Белоруссии (Их роль в организации образования и просвещения) / Т.Б. Блинова. — Гродно : ГрГУ, 2003. — 425 с.

37. Бобровский, П.О. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба: Гродненская губерния / П.О.

Бобровский — Ч. 1—2. — СПб. : Типография И. Огрызко, 1863. — 886 + 1074 с.

38. Болбас, М.Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795—1861 гг.) / М.Ф. Болбас. — Мінск : Навука і тэхніка, 1966. — 286 с.

39. Булгарин, Ф. Воспоминания Фаддея Булгарина. Отрывки из виденного, слышанного и испытанного в жизни / Ф. Булгарын // Выбранае / укл. А. Фядуты. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2003. — (Беларускі кнігазбор ; Сер. ІІ. Гісторыка-літаратурныя помнікі) — С. 49—170.

40. Булгарин, Ф. Замечания о Польше / Ф. Булгарын // Выбранае / укл. А. Фядуты. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2003. — (Беларускі кнігазбор ; Сер. ІІ. Гісторыка-літаратурныя помнікі) — С. 419—429.

41. Булгарин, Ф. Иван Выжигин. Главы из романа / Ф. Булгарын // Выбранае / укл. А. Фядуты. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2003. — (Беларускі кнігазбор ; Сер. ІІ. Гісторыка-літаратурныя помнікі) — С. 329—396.

42. Бэлза, И.Ф. История польской музыкальной культуры : В 2 т. / И.Ф. Бэлза. — Москва : Музгиз, 1954. — Т. 1. — 336 с. ; Т. 2. — 308 с.

43. Бэрк, П. Народная культура Эўропы ранняга Новага часу / П. Бэрк ; пер. з англ. І. Ганецкай. — Мінск : Тэхналогія, 1999. — 380 с.

44. Бялявіна, В.М. Жаночы касцюм на Беларусі / В.М. Бялявіна, Л.В. Ракава. — Мінск : Беларусь, 2007. — 351 с.

45. Бялявіна, В.М. Мужчынскі касцюм на Беларусі / В.М. Бялявіна, Л.В. Ракава. — Мінск : Беларусь, 2007. — 303 с.

46. Бялявіна, В.М. Саслоўныя формы баўлення вольнага часу / В.М. Бялявіна // Беларусы / рэдкал.: В.М. Бялявіна [і інш.]. — Т. 6 : Грамадскія традыцыі / В.Ф. Бацяеў [і інш.]. — Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы НАН Беларусі. — Мінск : Бел. навука, 2002. — С. 226—283.

47. Васілевіч, У.А. Збіральнікі / У.А. Васілевіч. — Мінск : Навука і тэхніка, 1991. — 206 с.

48. Вольныя муляры ў беларускай гісторыі. Канец XVIII — пачатак XX стст. / Ю. Гардзееў [і інш.] ; пад рэд. А. Смалянчука. — Вільня : Gudas, 2005. — 280 с.

49. Восстание и война 1794 г. в литовской провинции (по документам архивов Москвы и Минска) / Сост. Е.К. Анищенко. — Минск : МНО, 2001. — 210 с.

50. Вуглік, І.Р. Бытавая культура беларусаў XVII—XVIII ст.: тыпалогія, гісторыка-культурная стылістыка, гістарычная дынаміка : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / І.Р. Вуглік. — Мінск, 2003. — 111 л.

51. Вуглік, І.Р. Матэрыяльная культура і быт беларусаў XVII—XVIII стст.: вучэбна-метадычны дапаможнік / І.Р. Вуглік. — Мінск : БДПУ, 2005. — 114 с.

52. Вяроўкін-Шэлюта, У. Разбор шляхты / У. Вяроўкін-Шэлюта // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. — Мінск : БелЭн, 1993—2003. — Т.6. К. 1. — 2001. — С. 83—85.

53. Гісторыя Беларусі : з 1795 г. да вясны 1917 г. / І. І. Коўкель [і інш.] ; пад агул. рэд. І. П. Крэнь. — Мінск : Аверсэв, 2001. — 400 с.

54. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён : у 3 т. / З.Е. Абезгауз [і інш.]. — Мінск : Беларус. навука, 1997—2002. — Т.1. — Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да рэформы 1861 г. / З.Е. Абезгауз [і інш.] ; пад рэд. В.П. Панюціча. — 1997. — 431 с.

55. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён : у 3 т. / З.Е. Абезгауз [і інш.]. — Мінск : Беларус. навука, 1997—2002. — Т.2. — Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З.Е. Абезгауз [і інш.] ; пад рэд. В.П. Панюціча. — 2002. — 552 с.

56. Голицына, Н.И. Княгиня Н.И. Голицына о польском восстании 1830—1831 г. / Н.И. Голицына ; пер. с фран. яз., публ., [предисл. и примеч.] Е.Л. Яценко // Российский Архив : История Отечества в свидетельствах и документах XVIII—XX вв. Альманах. — Москва: Студия ТРИТЭ ; Рос. Архив, 2004. — [Т. XIII]. — С. 61—165. — (Новая серия).

57. Грицкевич, В.П. С факелом Гиппократа : Из истории белорусской медицины / В.П. Грицкевич. — Минск : Наука и техника, 1987. — 271 с.

58. Гульні, забавы, ігрышчы / укл. А.Ю. Лозка ; гал. рэд. А.С. Фядосік. — 3-е выд. — Мінск : Бел. навука, 2003. — 534 с. — (Беларуская народная творчасць).

59. Давыдов, Д.В. 1812 год / Д.В. Давыдов // Военные записки / Предисл. О. Михайлова. — Москва : Воениздат, 1982. — С. 125—164.

60. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі : У 3 т. /  . — Мінск : Выдавецтва Акадэміі навук БССР, 1936—1953. — Т. 2. — (1772—1903). — 1940. — 545 с.

61. Дамейка, І. Мае падарожжы / І. Дамейка ; пер. з пол. З. Сіцько. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2002. — (Беларускі кнігазбор ; Сер. ІІ. Гісторыка-літаратурныя помнікі) — 496 с.

62. Добрынин, Г. Истинное повествование или жизнь Гавриила Добрынина, им самим писанная. 1752—1823 / Г. Добрынин // Русская старина. — Т. 4. — август. — 1871. — С. 97—153.

63. Довнар-Запольский, М.В. История Белоруссии / М.В. Довнар-Запольский. — Минск : Беларусь, 2003. — 680 с.

64. Домонтович, М. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального Штаба : Черниговская губерния / М. Домонтович. — СПб. : Типография Ф. Персона, 1865. — XXI, 686 с.

65. Дубянецкі, Э. Менталітэт беларусаў: спроба гісторыка-псіхалагічнага аналізу / Э. Дубянецкі // Беларусіка—Albaruthenica. — Кн. 2. — Фарміраванне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў / Рэд. А. Анціпенка [і інш.]. — Мінск : Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны, 1993. — С. 192—201.

66. Ельскі, А. Беларусь / А. Ельскі // Выбранае / укл. Н. Мазоўка ; пер. з пол. Н. Мазоўкі. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. — (Беларускі кнігазбор ; Сер. ІІ. Гісторыка-літаратурныя помнікі) — С. 19—24.

67. Ельскі, А. Выбранае / укл. Н. Мазоўка ; пер. з пол. Н. Мазоўкі. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. — (Беларускі кнігазбор ; Сер. ІІ. Гісторыка-літаратурныя помнікі) — 496 с.

68. Ельскі, А. Ганна Цюндзявіцкая / А. Ельскі // Выбранае / укл. Н. Мазоўка ; пер. з пол. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. — (Беларускі кнігазбор ; Сер. ІІ. Гісторыка-літаратурныя помнікі) — С. 148—152.

69. Ельскі, А. Гістарычныя звесткі пра Радзівілаўскую ткальню паясоў у Слуцку / А. Ельскі // Выбранае / укл. Н. Мазоўка ; пер. з пол. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. — (Беларускі кнігазбор ; Сер. ІІ. Гісторыка-літаратурныя помнікі) — С. 65—86.

70. Ельскі, А. Дамінік Манюшка / А. Ельскі // Выбранае / укл. Н. Мазоўка ; пер. з пол. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. — (Беларускі кнігазбор ; Сер. ІІ. Гісторыка-літаратурныя помнікі) — С. 143—148.

71. Ельскі, А. Пра бібліятэку святой памяці Юльяна Бергеля, пастора ў Слуцку / А. Ельскі // Выбранае / укл. Н. Мазоўка ; пер. з пол. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. — (Беларускі кнігазбор ; Сер. ІІ. Гісторыка-літаратурныя помнікі) — С. 25—65.

72. Ельскі, А. Чатыры жыццяпісы людзей Міцкевічавай эпохі / А. Ельскі // Выбранае / укл. Н. Мазоўка ; пер. з пол. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. — (Беларускі кнігазбор ; Сер. ІІ. Гісторыка-літаратурныя помнікі) — С. 25—65.

73. Жавускі, Г. Успаміны Сапліцы / Г. Жавускі ; пер. з пол. М. Кенькі. — Мінск : Лімарыус, 2005. — 368 с.

74. Жытко, А.П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861—1914 гг. / А.П. Жытко. — Мінск : БДПУ, 2003. — 233 с.

75. Залуский, А. Время и музыка Михала Клеофаса Огинского / А. Залуский ; пер. с англ. В. Плютова. — Мінск : Четыре четверти, 1999. — 191 с.

76. Заняпад і адраджэнне: Беларуская літаратура XIX стагоддзя. Хрэстаматыя / Уклад. У. Казберука. — Мінск : Маст. літ., 2001. — 606 с.

77. Запруднік, Я. Дваранства і беларуская мова / Я. Запруднік // Беларусіка—Albaruthenica. — Кн. 2. — Фарміраванне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў / Рэд. А. Анціпенка [і інш.]. — Мінск : Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны, 1993. — С. 29—37.

78. Запрудскі, І.М. Творчасць Адама Кіркора : ад рамантізму да пазітывізму : дыс. … канд. філал. навук : 10.01.01 / І.М. Запрудскі. — Мінск, 2000. — 110 л.

79. Захаржевская, Р.В. История костюма : От античности до современности / Р. В. Захаржевская. — 3-е изд., доп. — Москва : Рипол-классик, 2004. — 288 с.

80. Захарова, О.Ю. Светские церемониалы в России XVIII — начала XX в. / О.Ю. Захарова. — Москва : ЗАО Центрполиграф, 2003. — 329 с.

81. Зеленский, И. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба : Минская губерния / И. Зеленский. — Ч. 1—2. — СПб. : Воен. типография, 1864. — 672 с. + 701 с.

82. Ігнатоўскі, У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. Ігнатоўскі. — 5-е выд. — Мінск : Беларусь, 1992. — 190 с.

83. Иловайский, Д.И. Гродненский сейм 1793 г. / Д.И. Иловайский. — СПб. : Унив. тип., 1870. — 274 с.

84. Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII—XVIII вв.: Владение Сморгонь. — Минск : Наука и техника, 1977. — 256 с.

85. Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII—XVIII вв.: Владение Тимковичи. — Минск : Наука и техника, 1982. — 216 с.

86. Казбярук, У.М. Ступені росту : беларуская літаратура канца XIX — пачатку XX ст. і традыцыі польскіх пісьменнікаў / У.М. Казберук. — Мінск : Навука і тэхніка, 1974. — 192 с.

87. Карамзин, Н.М. История государства Российского : в 12 т. / Н.М. Карамзин. — СПб. : Воен. тип. Главного штаба, 1816—1829.

88. Каратынскі, В. Ліст да У. Сыракомлі. 25 кастрычніка 1861 г. / В. Каратынскі ; пер. з пол. Г.В. Кісялёва // Пачынальнікі : З гіст.-літар. матэрыялаў XIX ст. / Уклад. Г.В. Кісялёў. — 2-е выд. — Мінск : Бел. навука, 2003. — С. 318—319.

89. Карафа-Корбут, Э.Ф. Карэспандэнцыя «Gazety codziennej». 21 чэрвеня 1860 г. / Э.Ф. Карафа-Корбут ; пер. з пол. І. Запрудніка // Працы кафедры гісторыі беларускае літаратуры Белдзяржуніверсітэта / пад агул. рэд. М. Хаўстовіча. — Выпуск пяты. — Мінск : ВТАА Права і эканоміка, 2004. — С. 146—147.

90. Карев, Д.В. Белорусская и украинская историография конца XVIII — начала 20-х гг. XX в. в процессе генезиса и развития национального исторического сознания белорусов и украинцев / Д.В. Карев. — Вильнюс : ЕГУ, 2007. — 312 с.

91. Касмылёў, В. Двубой. Да гісторыі дуэляў у Беларусі / В. Касмылёў // Беларуская мінуўшчына. — № 2. — Мінск, 1997. — С. 76—80.

92. Каханоўскі, Г.А. Адчыніся, таямніца часу : гісторыка-літаратурныя нарысы / Г.А. Каханоўскі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1984. — 197 с.

93. Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI—XIX стст. / Г.А. Каханоўскі. — Мінск : Навука і тэхніка, 1984. — 118 с.

94. Килбас, А.А. Культура привилегированного сословия на Беларуси (XIV—XVI вв.) : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.07 / А.А. Килбас. — Минск, 2003. — 123 л.

95. Килбас, А.А. Культура привилегированного сословия на Беларуси (XIV—XVI вв.) / А.А. Килбас. — Мінск : УП «Технопринт», 2004. — 168 с.

96. Киркор, А.К. В Белорусском Полесье / А.К. Киркор // Живописная Россия : в 12 т. / под общ. ред. П.П. Семенова. — М. : Вольфа, 1882. — Т. 3 : Литовское и Белорусское Полесье / А.К. Киркор, П.П. Семенов, С.В. Максимов. — репринт. восп. — 2-е изд. — Минск : БелЭн, 1994. — С. 357—428.

97. Киркор, А.К. Город Вильно / А.К. Киркор // Живописная Россия : в 12 т. / под общ. ред. П.П. Семенова. — М. : Вольфа, 1882. — Т. 3 : Литовское и Белорусское Полесье / А.К. Киркор, П.П. Семенов, С.В. Максимов. — репринт. восп. — 2-е изд. — Минск : БелЭн, 1994. — С. 137—162.

98. Киркор, А.К. Народная жизнь / А.К. Киркор // Живописная Россия : в 12 т. / под общ. ред. П.П. Семенова. — М. : Вольфа, 1882. — Т. 3 : Литовское и Белорусское Полесье / А.К. Киркор, П.П. Семенов, С.В. Максимов. — репринт. восп. — 2-е изд. — Минск : БелЭн, 1994. — С. 277—288.

